Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

6 СТУДЗЕНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 1
(26359)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Фота з БЕЛТА.

# НАВАГОДНІ ЗВАРОТ

## ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ А.Р. ЛУКАШЭНКІ ДА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА 31 СНЕЖНЯ 2008 г.

Дарагія сябры!

Бадай, няма больш доўгачаканага, цёплага і радаснага свята, чым Новы год. У ім увасоблена ўсё — нараджэнне новай мары, прымірэнне і згода, яднанне і вера.

Дзівосная ўласцівасць навагодняй ночы яшчэ і ў тым, што ўсяго за некалькі гадзін мы як быццам бы зноў перажываем падзеі, што адбыліся з намі ў нядаўнім мінулым. Аналізуем іх, ацэньваем. І ў той жа час бачым сябе ўжо ў будучыні.

І хоць адыходзячы год быў высакосны, на яго не варта скардзіцца. Ён прынёс нам не толькі цяжкасці і перажыванні, але і падарыў шэраг значных здзяйсненняў і надзей. Быў цікавы, насычаны і ў цэлым паспяховы для краіны.

Праводзячы яго, мне хочацца выказаць шчырую ўдзячнасць вам, мае суайчыннікі, за ўсё, што мы разам зрабілі.

Вялікі дзякуй тым, хто расціў і сабраў самы вялікі ў нашай гісторыі ўраджай, забяспечыў завяршэнне газіфікацыі краіны, асвоіў найскладанейшыя аперацыі, зрабіўшы сапраўдны прарыў у медыцыне. Хто свядома і сумленна дзень пры дні працаваў, аддана служыў сваёй Айчыне.

Я сардэчна дзякую ўсім грамадзянам краіны за давер, які вы заўсёды аказваеце ўладзе, за спакой і мудрасць.

Мы яшчэ раз адчулі сябе звязанымі свяшчэнным адзінствам, імя якому — народ Беларусі. Перакананні: у нас фарміруецца здаровая нацыя. Здаровая не толькі фізічна, але і духоўна.

Канфлікты, разлад не разрываюць наша грамадства. Беларусы, рускія, палякі, яўрэі, людзі розных веравызнанняў мірна жывуць побач, ствараюць сем'і, не ставячы паміж сабой бар'ераў.

Беларусь — еўрапейская дзяржава. І нам не трэба гэта даказваць.

Мы ніколі ні з кім не сварыліся і нікому не ствараліпраблемаў. Нашы сэрцы заўсёды адкрыты тым, хто ідзе да нас з дабром.

Адыходны год яшчэ больш умацаваў нашу ўпэўненасць у правільнасці выбранага шляху.

Часам я думаю, якая усё ж цікавая штука гісторыя! Тыя хто яшчэ ўчора нас павучалі, цяпер з пагардай гаворыць пра беларускую мадэль развіцця.

І сёння, калі «інфекцыя», што накапілася ў сусветнай эканоміцы, вылілася ў найглыбейшы крызіс, высветлілася, што мы гэтыя гады ўсё рабілі правільна. Выбралі свой шлях часам навобмацак, інтуітыўна. Але выходзілі з галоўнага — жыць трэба сваім розумам, сваёй працай і ў імя інтарэсаў народа.

Успомніце, як нас крытыкавалі за тое, што мы не далі памерці вёсцы. Але, калі грымнуў харчовы крызіс, у выйгрышы апынуліся краіны, якія могуць самі сябе забяспечваць прадуктамі харчавання. У іх ліку і наша Беларусь, якая ўсямерна падтрымлівае сваіх сялян.

Нам настойліва рэкамендавалі хутчэй поўнасцю падпарадкаваць эканоміку правілам сусветнай біржы. Але мы не сталі спадзявацца на спекуляцыйную стыхію.

Мы не спарадзілі цяперашні крызіс, з-за якога ліхаманіць увесь свет. Наадварот, ён з'явіўся вынікам таго, з чым мы ў сябе заўсёды рашуча змагаліся.

І сёння нас не трэба палохаць гэтым няпрошаным госцем.

Наступны год будзе цяжкі, але беларусам не прывыкаць перадольваць цяжкасці. Былі часы і больш цяжкія.

Тады мы не толькі не скаціліся ў бездань, а змаглі пабудаваць новую Беларусь з надзейным запасам трываласці.

Дарагія суайчыннікі!

Мы ўступаем у Новы год з вялікімі планамі. З упэўненасцю ў сваіх сілах. У нас ёсць вялікі стваральны і духоўны патэнцыял.

Мы будзем настойліва рухацца наперад да высокіх стандартаў якасці жыцця.

Так, будзе няпроста, але вы павінны ведаць: улада не дапусціць абвалу і хаосу, не здрадзіць вашаму даверу. Мы ніколі не парушым свой прынцып — клопат пра чалавека!

Галоўнае — нельга забывацца, што ўсё залежыць ад нас самих! Бо моцных выпрабаванні робяць больш моцнымі, а слабых і маладушных — губяць.

Перакананы, мы не толькі справімся з цяперашнімі праблемамі, але станем яшчэ больш загартаванымі і ўпэўненымі ў сабе.

Дарагія сябры!

2009 год на парозе. Праз хвіліну мы ступім у яго з'яднанай беларускай сям'ёй.

Нам ёсць чым ганарыцца. Мы — беларусы! Са слаўным гераічным мінулым, стваральным сучасным, уражальным будучым.

Мы ўступаем у шэсцьдзесят пяты мірны год.

І нездарма ён аб'яўлены Годам роднай зямлі. Наша зямля — цудоўны куток планеты, падораны нам Богам. І мы павінны перадаць яе ў спадчыну дзецям і ўнукам яшчэ больш прыгожай і добраўпарадкаванай.

У гэты вечар, калі мы адкрыта глядзім адзін аднаму ў вочы, думаецца пра звычайнае чалавечае шчасце. А яго формула простая — дастойна жыць, кахаць і быць каханымі, адчуваць цяпло ў сямейным коле, бачыць здаровымі і паспяховымі сваіх блізкіх.

Няхай у Новым годзе ў вас усё гэта будзе.

Няхай адыдуць засмучэнні і нягоды, а сэрцы напоўняцца верай і аптымізмам.

Жадаю, каб у вашых дамах заўсёды панавала згода і быў дабрабыт.

Каб гучаў дзіцячы смех і свяціліся шчасцем вочы жанчын.

Кожнаму з вас болей яркіх жыццёвых імгненняў і радасных здзяйсненняў.

Няхай збудуцца добрыя надзеі і самыя смелыя мары.

Здароўя, шчасця і ўдачы вам, дарагія сябры.

**З НОВЫМ ГОДАМ!**

# Ражджэственскае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

*Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!*

У час радаснага свята Раждаства Хрыстовага мы з асаблівым натхненнем паўтараем словы Вечнадзевы Марыі, якімі Яна абвесціла пра Сына Свайго Ісуса, Які меў прыйсці ў свет: «Велічае душа Мая Госпада, і ўзрадаваўся дух Мой у Богу, Спасіцелі Маім» (Лк. 1: 46—47).

Наша сумесная радасць з Прачыстай Маці не дарэмная. Бо, паводле вучэння Царквы, кожная душа, якая шчыра імкнецца да Бога, спадабляецца насіць у сабе іскрынку Божае благадаці. Не выпадкова і айцы старажытнай Царквы, як, напрыклад, свяшчэннамучанік Ігнацій Антыяхійскі, іменаваліся Баганосцамі, таму што ў іх сэрцах неадступна знаходзіўся Сам Гасподзь.

Але не толькі старажытнасць упрыгожана святасцю. І ў наш далёкі ад Раждаства Хрыстовага час усе мы, паслядоўнікі Яго, пакліканы да ўдзелу ў радасці, абвешчанай Дзевай Марыяй праведнай Елісавеце: «Ад гэтага часу будуць звацьМяне блажэннай усе роды» (Лк. 1: 48). Бо Сам Гасподзь звяртаючыся да тых, хто выконвае Яго волю, кажа: «Каб радасць Мая ў вас была і каб радасць ваша была поўная» (Ін. 15: 11).

Паўната гэтай святой радасці заключаецца ў тым, што і Прасвятая Багародзіца, і святыя Баганосцы станавіліся абіцеллю (Ін. 14: 23), у якой знаходзіцца Айцец, Сын і Дух Святы. Такое жыццё з Богам і ў Богу з'яўляецца сэнсам нашага з вамі існавання ў гэтым дольнім свеце. Мы дакранаемся да гэтага жыцця ў святых царкоўных таінствах, дзеля яго мы здзяйсняем нашы пасільныя подзвігі малітваў і посту.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І вось сёння мы святкуем Раждаство Хрыстова! Перад намі ў Віфлеемскіх яслях ляжыць Дзіця Запавету: Сын Божы і Сын Чалавечы. Лагоднасць і пакорлівасць Бога, Які ўмясціўся ў яслях, кожны раз уражваюць нашы сэрцы, звыклыя з мітуслівым светам. Спавіваючы Свайго Сына, Марыя зноў, нібы расой, акрапляе нашы душы трапятаннем і замілаваннем, бо з Ёю разам мы бачым у Дзіцятку — Бога, нашу сапраўдную надзею і здзяйсненне, крыніцу дасканалай радасці.

Святкаванне Раждаства Хрыстовага яўляе чалавечаму роду цуд. Бо немагчыма прызвычаіцца да таго, што «Дзева сёння нараджае Вышэйшага за ўсялякую істоту» (кандак Раждаства Хрыстовага). Гэты цуд навучае і нас са шчырай руплівасцю і клопатам ставіцца да ўсяго, што ў веку гэтым уяўляецца нам малым і слабым, але, разам з тым, шматкаштоўным.

Больш за ўсё гэта датычыцца дзяцінства. У кожным дзіцяці, якое прыходзіць у свет, мы можам і павінны малітоўна чакаць прадцечу спасення нашых сем'яў, грамадства і свету. Безабароннасць і крохкасць дзяцінства няхай не перашкаджаюць нашаму спадзяванню на дзяцей, якія цяпер прыходзяць у гэты свет. Бо ангелы Божыя з'яўляюцца ахавальнікамі тых тайнаў, якія Гасподзь рыхтуе нам у кожным нованароджаным дзіцяці.

Менавіта ангельскае воінства абвесціла тайну Раждаства Хрыстовага віфлеемскім пастухам. Яны ўбачылі, як «раптам з'явілася з Ангелам шматлікае воінства нябеснае, усхваляючы Госпада і прамаўляючы: слава ў вышніх Богу, і на зямлі мір, у людзях добрая воля» (Лк. 2: 14).

Гэтае Віфлеемскае адкравенне пераконвае нас у тым, наколькі вялікая сіла Божай любові, якая адкрываецца ў сонме ангельскіх воінстваў. Яны абвяшчаюць нам волю Божую, яны ж сваім славаслоўем указваюць нам шляхі да спасення.

Таму што менавіта ўзносячы славу «у вышніх Богу», нашаму Творцу, мы робімся здольнымі дасягнуць спасіцельнага міру ў самім сабе! Але для гэтага перш за ўсё неабходна, каб у нашых сэрцах пачала дзейнічаць добрая воля, каб мы шчыра імкнуліся заўсёды праяўляць добрую волю да Бога і да свайго бліжняга. Нам трэба ў сэрцах сваіх узрасціць думку пра тое, што радасць удзячнасці — гэта праца, праца хаджэння чалавека перад Богам.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

# ШЛЯХ ДА ВІФЛЕЕМА





*Ад горада, чый узрост перавышае чатыры тысячы гадоў, ад рэзідэнцыі Прадстаяцеля Праваслаўнай Царквы на Святой Зямлі пачаўся мой шлях у Віфлеям. На развітанне Яго Блажэнства Феафіл III пакінуў у нататніку добразычлівае пажаданне. Побач з аўтастрадай хтосьці пракладвае свой шлях у Віфлеем.*

Наша газета надае шмат увагі нацыянальным духоўна-рэлігійным пытанням і адраджэнню хрысціянскіх традыцый. З яе старонак неаднаразова гучалі словы праваслаўных іерархаў, святароў і тых, хто сёння плённа працуе на ніве хрысціянскай асветы. Мы падрабязна паведамлялі пра візіты ў Беларусь Святейшага Патрыярха Аляксія II, традыцыйнымі сталі на старонках «Звязды» святочныя пасланні Філарэта Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха усяе Беларусі. На працягу 15 гадоў газета ўдзельнічае ў рэспубліканскай духоўна-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да Святыняў з Непагасным агнём, запаленым ля Гроба Гасподняга.

У снежні мінулага года наш карэспандэнт Яўген Пясецкі пабываў на Святой Зямлі Іерусаліма і прылеглых да яго мясцінах — асвечаных самымі дарагімі ўспамінамі з гісторыі чалавецтва, адзначаных зямным жыццём Збавіцеля і здзейсненымі Ім цудамі, амытых Яго крывёю. Па блаславёнай Мітрапаліта Філарэта Яўген Пясецкі быў запрошаны ў Рускую Духоўную Місію ў Іерусаліме і зрабіў падарожжа па некаторых гарадах і паселішчах зямлі, якая з'яўляецца калыскай хрысціянства.

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

Минский городской центр недвижимости

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**30 января 2009 г. проводит открытый аукцион № 01-Сф-09 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).

**Предмет аукциона:** право частной собственности на земельный участок.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляются 14 земельных участков, расположенных в районе малоэтажной застройки в границах пр. Победителей – проезда Дрозды – р. Свислочь (застройка жилых кварталов № 2, 3, 11) для строительства одноквартирных (блокированных) жилых домов:

| Лот № | № участка по ген-плану | Кадастровый номер земельного участка | Площадь земельного участка, га | Начальная цена, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Жилой квартал № 11** | | | | | | | |
| 1 | 1.1. | 500000000007004434 | 0,0528 | 214 609 750 | 21 460 980 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 495 039 |
| 2 | 1.2. | 500000000007004530 | 0,0626 | 254 442 620 | 25 444 270 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 495 039 |
| 3 | 2.1. | 500000000007004432 | 0,0682 | 277 204 260 | 27 720 430 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 495 039 |
| 4 | 2.2 | 500000000007004533 | 0,0804 | 326 792 120 | 32 679 220 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 630 051 |
| 5 | 2.3. | 500000000007004535 | 0,0707 | 287 365 710 | 28 736 580 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 585 046 |
| 6 | 3.1. | 500000000007004536 | 0,0689 | 280 049 460 | 28 004 950 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 675 053 |
| 7 | 3.2. | 500000000007004537 | 0,0665 | 270 294 480 | 27 029 450 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 630 051 |
| 8 | 4.1. | 500000000007004538 | 0,0748 | 304 030 480 | 30 403 050 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 585 046 |
| 9 | 4.2 | 500000000007004539 | 0,0547 | 222 332 450 | 22 233 250 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 585 046 |
| 10 | 5.1 | 500000000007004540 | 0,0587 | 238 590 760 | 23 859 080 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 540 043 |
| **Жилой квартал № 3** | | | | | | | |
| 11 | 4 | 500000000007004050 | 0,0870 | 353 618 340 | 35 361 840 | Участок свободен от застройки и насаждений | 3 501 341 |
| **Жилой квартал № 2** | | | | | | | |
| 12 | 12 | 500000000007004268 | 0,0911 | 370 283 110 | 37 028 320 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 156 707 |
| 13 | 13 | 500000000007004269 | 0,0884 | 359 308 750 | 35 930 880 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 112 475 |
| 14 | 20 | 500000000007004245 | 0,1029 | 418 245 140 | 41 824 520 | Участок свободен от застройки и насаждений | 2 112 474 |

Земельные участки находятся в водоохранной зоне водных объектов г. Минска.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

**Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона:** своевременное внесение победителем аукциона платы за соответствующие земельные участки; возмещение им расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона и формированием этих земельных участков, учитывая их государственную регистрацию.

**Справочно:** - в течение 2-х месяцев после принятия Минским горисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельных участков соответствующие имущественные права на них должны быть зарегистрированы в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

- техническая документация и разрешение на строительство жилого дома получается владельцами земельных участков в установленном порядке;

- победители аукциона заключают с Минским городским исполнительным комитетом договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений);

- собственникам земельных участков необходимо завершить возведение одноквартирного (блокированного) жилого дома не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации прав на земельный участок.

Аукцион состоится **30 января 2009 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

внести задаток в размере 10 % от начальной цены заявленного лота (лота с наибольшей стоимостью – в случае участия в торгах по нескольким лотам), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома;

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:**

заявление на участие в аукционе установленной формы;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, победивший в торгах, либо которому земельный участок предоставляется в случаях, предусмотренных законодательством Республики Беларусь, обязан произвести оплату организатору аукциона за его организацию и проведение в размере 1 % от цены продажи соответствующего земельного участка.

Дополнительно представляется:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане и представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** для участия в аукционе начинается с **09.00 8 января 2009 года** и заканчивается в **16.45 22 января 2009 года.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются в отдельных случаях, предусмотренных законодательством) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

внести плату за земельный участок;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

произвести оплату организатору торгов за подготовку и проведение аукциона, включающую возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, в размере 1 процента от цены продажи земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает выписку из решения о предоставлении земельного участка в частную собственность.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4, 6.

**Контактные телефоны: + 375 (17) 226 16 72, + 375 (17) 227 40 22.**

**Дополнительная информация о выставленных на аукцион участках, а также условия участия в торгах и бланки требуемых документов размещены на официальном сайте организатора торгов www.mgcn.by.**

УНП 190398583

# НАЦБАНК ГАРАНТУЕ СТАБІЛЬНАСЦЬ КОШТУ КОШЫКА ЗАМЕЖНЫХ ВАЛЮТ...

**Ужо не навіна, што Нацыянальны банк Беларусі з 2 студзеня перайшоў на выкарыстанне механізму прывязкі беларускага рубля да кошыка замежных валют, у склад якой уключаны долар ЗША, еўра і расійскі рубель. Як вядома, пачатковы рублёвы кошт кошыка вызначаны на ўзроўні 960 беларускіх рублёў, што адпавядае велічыні ўтвараючых яго двухбаковых абменных курсаў: 2650 беларускіх рублёў за 1 долар ЗША, 3703 — за еўра і 90,16 — за расійскі рубель. У выніку ў гэты ж дзень істотна «зварухнуліся» і курсы куплі-продажу наяўных СКВ: курс продажу долара ў некаторых пунктах абмену валюты даходзіў да 2700 рублёў, еўра — да 3830, расійскага рубля — да 92,16. Што стала не вельмі прыемным «сюрпрызам» для многіх. А вось якія надалей нас могуць чакаць змяненні? Пра гэта мы вырашылі запытацца ў начальніка ўпраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Анатоля ДРАЗДОВА.**

**— Анатоль Фёдаравіч, у адным з апошніх каментарыяў нашай газеце вы казалі пра тое, што галоўны банк не дапусціць падзення афіцыйнага курса беларускага рубля да долара да канца мінулага года ніжэй за 2200 рублёў за 1 долар. Гэты параметр быў вытрыманы. Аднак ужо 2 студзеня «цэннік» на той жа долар у пунктах абмену «пацяжэў» адразу на 500 рублёў. Цяпер — толькі пачатак года, а таму многіх непакоіць наступнае: чаго чакаць далей — на працягу 2009 года?**

— Мы гарантуем стабільнасць кошту кошыка замежных валют. Хістанні кошту кошыка будуць абмежаваныя на працягу гэтага года ў межах плюс-мінус 5 працэнтаў ад устаноўленай пачатковай велічыні. Пры гэтым хістанні курса нацыянальнай валюты ў адносінах да кожнай з валют — долара, еўра і расійскага рубля — будуць адбывацца толькі за кошт узаемных змяненняў гэтых замежных валют.

**— Маглі б вы патлумачыць, чаму ўсё ж такі было прынята рашэнне аб істотнай дэвальвацыі рубля?**

— Таму што курс беларускага рубля, які штучна падтрымліваўся, адмоўна ўплываў на працу айчынных прадпрыемстваў, арыентаваных на экспарт. Каб было зразумела, што адбывалася, узгадаем, што яшчэ да крызісу на 1 жніўня афіцыйны кошт еўра складаў 3301 беларускі рубель, расійскага рубля — каля 90, а на 1 студзеня гэтага года адпаведна 3077 рублёў і каля 77 рублёў. Паколькі асноўная выручка экспарцёраў ідзе ў еўра і расійскіх рублях, атрымлівалася, што беларускае прадпрыемства на кожным еўра губляла 223 рублі і 13 рублёў на расійскай валюце. Да таго ж высокі кошт беларускага рубля адмоўна ўплываў на канкурэнтаздольнасць — нашы тавары станавіліся дарагімі. У той жа час паглядзіце, што адбывалася за мяжой: Расія аслабліла сваю валюту да долара на 1 студзеня на 23 працэнты, украінская грыўня наогул саступіла «амерыканцу» 59 працэнтаў. Усе гэтыя краіны аслабілі свае валюты, абараняючы ўнутраны рынак, а мы свой адкрылі для імпартных тавараў. Таму ўсё дыктавалася жалезнай эканамічнай неабходнасцю.

**— Не выключаю, што на сітуацыю паўплываў і Міжнародны валютны фонд: яго рэкамендацыі па дэвальвацыі рубля на 20 працэнтаў у сувязі з магчымым атрыманнем Беларуссю крэдыту таксама ўлічваліся? Дарэчы, якія перспектывы з атрыманнем гэтага крэдыту?**

— Адносна апошняга пытання заўважу, што МВФ прыняў папярэдняе станоўчае рашэнне аб выдачы Беларусі крэдыту. Чакаецца, што ўжо сёлета ў студзені нашы золатавалютныя рэзервы павялічацца за кошт паступлення першай часткі крэдыту МВФ у памеры больш за 800 млн долараў ЗША. Агульны ж аб'ём гэтага крэдыту складае 2,5 млрд долараў ЗША. Што ж датычыцца рэкамендацый замежных спецыялістаў, то не сакрэт, яны выказвалі меркаванне, што мы штучна падтрымліваем курс нацыянальнай валюты. І выказвалі апасенні наконт таго, што выдзелены крэдыт можа быць імгненна прададзены праз абменныя пункты, а чым у такім выпадку краіна будзе за яго разлічвацца? Натуральна, у такіх умовах у іх маглі быць сумненні, што крэдыт будзе вернуты: мы ў лістападзе-снежні «праядалі» золатавалютныя рэзервы і «праелі» б і гэты крэдыт, калі б працягвалі ранейшую палітыку.

**— Увёўшы новы механізм курсаўтварэння, Нацыянальны банк прыняў рашэнне і аб істотным павышэнні стаўкі рэфінансавання?**

— Так, з 8 студзеня яна павышана да 14 працэнтаў гадавых. Мяркуем, што яе павелічэнне і, адпаведна, павелічэнне працэнтных ставак па ўкладах будзе стымуляваць прыток зберажэнняў у банкі.

**— Калі ўжо размова зайшла пра зберажэнні, то не буду арыгінальным і запытаюся наконт таго, якой валюце ў іх аддаць перавагу.**

— Я ўжо раней казаў і прытрымліваюся той жа думкі: не трэба мітусіцца, рабіць рэзкіх рухаў. У чым ляжаць у вас грошы — у тым і трымайце. Атрымалі ў рублях — захоўвайце ў іх, разжыліся валютай — прынцып той жа.

— Я ведаў, што МВФ просіць дэвальваваць беларускі рубель на 20 працэнтаў, але не быў на сто працэнтаў упэўнены, што мы адважымся на гэта, — распавёў карэспандэнту нашай газеты **эксперт «Звязды», дэкан эканамічнага факультэта БДУ, прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ,** адказваючы на пытанне наконт таго, ці стала апошняе рашэнне Нацбанка нечаканасцю для яго. — Але як толькі я ўбачыў, што МВФ прыняў папярэдняе станоўчае рашэнне аб выдачы Беларусі крэдыту, то зразумеў, што мы пагадзіліся. Я сумняваюся, што гэта трэба было рабіць, але зроблена было вельмі прафесійна. Разавая дэвальвацыя з пункту гледжання адмоўнага эфекту чакання насельніцтва лепшая, чым паступовая: не адбылося вялікага адтоку рублёвых укладаў. Дазмагла экспарцёрам, то яна мае і негатыўныя моманты, напрыклад, цэны на імпартныя тавары вырастуць, а зарплаты наадварот у долавым выражэнні зменшацца. Дэвальвацыя, дапамагаючы экспарцёрам, на жаль, раскладвае гэтую дапамогу на ўсё насельніцтва краіны.

**— Гэты год, як мяркуюць суседтныя эксперты, будзе нялёгкім. Ці ўдасца нам у гэтых умовах утрымаць стабільным курс рубля?**

— Я лічу, што стрымліваць спажывецкі імпарт неабходна не столькі дэвальвацыяй, колькі мытнымі пошлінамі і абмежаваннямі па яго крэдытаванні. Гэта будзе больш эфектыўна стрымліваць імпарт. Таксама трэба стрымліваць і кароткія пазыкі за мяжой. Калі мы спажывецкі імпарт зможам стрымаць, і не столькі дэвальвацыяй, колькі іншымі мерамі, то курс удасца ўтрымаць. Акрамя таго, крэдыты, атрыманыя ад Расіі, МВФ сапраўды створаць «падушку бяспекі», і, думаю, што запланаваныя параметры будуць вытрыманыя.

Між іншым, на Беларускай валютна-фондавай біржы ў першы дзень таргоў новага года курс беларускага рубля ў адносінах да кошыка замежных валют умацаваўся на 0,55 працэнта з 960 да 954,75 беларускіх рублёў. Пры гэтым, паведамілі нашаму карэспандэнту ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка, курс нацыянальнай валюты да долара знізіўся на 5 рублёў і склаў 2655 беларускіх рублёў за долар, да еўра — умацаваўся больш як на 67 рублёў і склаў 3635,76, да расійскага рубля — не змяніўся. Узаемнае змяненне двухбаковых курсаў у галоўным банку патлумачылі ўмацаваннем курса долара ў адносінах да еўра на сусветным рынку з узроўню 1,3974 да 1,3694 долара ЗША за еўра.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

| *Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.01.2009 г. (для б/н разлікаў)* | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 655,00 |
| 1 еўра | 3 635,76 |
| 1 латвійскі лат | 5 136,39 |
| 1 літоўскі літ | 1 052,49 |
| 1 чэшская крона | 136,00 |
| 1 польскі злоты | 884,76 |
| 1 расійскі рубель | 90,16 |
| 1 украінская грыўня | 329,81 |

| *Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ* | |
|---|---|
| USD | 29,3916 |
| 10 UAH | 38,2952 |
| 1000 BYR | 13,3537 |
| EUR | 41,4275 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

# ПЕРШАЯ МАНЕТА Ў НОВЫМ ГОДЗЕ

Нацыянальны банк Беларусі ўвёў у абарачэнне сярэбраную і медна-нікелевую памятныя манеты «Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. 80 год», паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар галоўнага банка краіны Міхаіл Журавовіч. Сярэбраная манета мае намінал 10 рублёў, пробу сплаву 925, масу 16,81 г, медна-нікелевая — 1 рубель. Манеты адчаканены на РДП «Казахстанскі манетны двор Нацыянальнага банка Рэспублікі Казахстан».

**Ігар ГРЫШЫН.**

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ КІРАЎНІЦТВА РАСІІ З НАДЫХОДЗЯЧЫМ 2009 ГОДАМ І КАЛЯДАМІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева з Новым 2009 годам і Калядамі. «Перакананы, што традыцыйныя вузы дружбы і духоўная роднасць нашых народаў дадуць магчымасць і надалей дынамічна развіваць беларуска-расійскія адносіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік беларускай дзяржавы накіраваў таксама віншаванне з нагоды надыходных святаў старшыні Урада Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## РАСІЙСКА-БЕЛАРУСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў АДЫХОДНЫМ ГОДЗЕ АТРЫМАЛА ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ

На імя кіраўніка беларускай дзяржавы паступілі віншаванні з Новым годам і Калядамі ад Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева і старшыні Урада Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна. «У адыходным годзе расійска-беларускае супрацоўніцтва атрымала далейшае развіццё, — гаворыцца ў віншаванні кіраўніка расійскай дзяржавы. — Нашы краіны прадоўжылі сумесную работу па паглыбленні ўсебаковага ўзаемадзеяння, умацаванні эканамічнага фундаменту саюзнага будаўніцтва. Асаблівае значэнне ў гэтым кантэксце мае паслядоўная рэалізацыя дамоўленасцяў, дасягнутых у ходзе насычаных двухбаковых кантактаў, у тым ліку на нашай нядаўняй сустрэчы ў Маскве».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Беларуская сталіца набыла ўнікальную пляцоўку для правядзення спаборніцтваў па веласпорце

Папулярызацыя і развіццё спорту і фізічнай культуры ў Беларусі заўсёды былі і будуць важнымі напрамкамі палітыкі дзяржавы. Аб гэтым заявіў 30 снежня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця веладрома шматпрофільнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна».

Рашэнне аб будаўніцтве гэтага маштабнага спартыўнага збудавання, якое разлічана на 20 тыс. гледачоў і ўключае лядовую арэну, канькабежны стадыён, веладром, кіраўнік дзяржавы прыняў тры гады таму: 26 снежня 2005 года Прэзідэнт падпісаў адпаведны ўказ.

З усіх запланаваных аб'ектаў шматпрофільнага культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» веладром, аснашчаны трыбунамі ўмяшчальнасцю больш як 2 тыс. гледачоў, уведзены ў строй першы.

Аляксандр Лукашэнка выканаў дадзенае спартсменам абяцанне: велагоншчыкі атрымалі ў падарунак выдатны трэк для трэніровак, а беларуская сталіца — унікальную пляцоўку для правядзення спаборніцтваў, у тым ліку міжнароднага ўзроўню.

На постсавецкай прасторы няма аналагаў пабудаванаму ў беларускай сталіцы веладрому як па архітэктурным вырашэнні і ўнутраным дызайне, так і па функцыянальных магчымасцях. Пры праектаванні аб'екта быў улічаны лепшы сусветны вопыт будаўніцтва і эксплуатацыі аналагічных спартыўных збудаванняў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Стартаваў Калядны хакейны турнір

У Мінску стартаваў пяты Калядны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі. У ім бяруць удзел восем камандаў, спаборніцтвы праходзяць па традыцыйнай формуле. На папярэднім этапе каманды падзелены на два квартэты. Першы склалі дружыны Беларусі, Германіі, Швейцарыі і Фінляндыі, гульні будуць праходзіць у Палацы спорту. У другую групу ўвайшлі прадстаўнікі Расіі, Аўстрыі, Канады і Славакіі, якія базіруюцца ў Лядовым палацы.

Беларусь на турніры прадстаўлена камандай Прэзідэнта краіны. Адкрываючы спаборніцтвы, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што нягледзячы на сваю маладосць, турнір ужо набыў шырокую вядомасць і прызнанне як у нашай краіне, так і за яе межамі. «Мэта яго правядзення высакародная: папулярызацыя і развіццё хакея, далучэнне да гэтага мужнага і прыгожага віду спорту больш людзей розных узростаў. І вядома ж, такія аматарскія матчы садзейнічаюць замацаванню добрых і сяброўскіх сувязяў паміж краінамі-ўдзельніцамі», — цытуе БЕЛТА кіраўніка дзяржавы.

У дзень адкрыцця турніру, 4 студзеня, каманда Прэзідэнта Беларусі сустракалася з дружынай Швейцарыі і разграміла гасцей 16:3. Самымі выніковымі ў складзе беларускай каманды быў яе капітан Андрэй Асташэвіч і нападаючы Андрэй Кавалёў. На рахунку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі адна галявая перадача.

**Алена КРАВЕЦ.**

## ПЁТР РУДНІК ЗАЦВЕРДЖАНЫ НА ПАСАДЗЕ СТАРШЫНІ МАГІЛЁЎСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

**На пазачарговым пасяджэнні Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Пётр Руднік аднагалосна зацверджаны на пасадзе старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Пётр Руднік быў назначаны на пасаду старшыні Магілёўскага аблвыканкама ўказам Прэзідэнта Беларусі 29 снежня. Прадстаўляючы абласному Савету кандыдатуру кіраўніка рэгіёну, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей адзначыў, што Пётр Руднік — неардынарны чалавек і кіраўнік, які ўмее дабівацца пастаўленых мэтаў, ён «паспяхова прымяняе карысны замежны вопыт у айчыннай практыцы». Кіруючы «Ліфтмашам», Пётр Руднік паказаў сябе як адзін з лепшых кіраўнікоў прадпрыемстваў краіны. «Яму ўласцівы грунтоўнасць і канструктыўнасць. Гэта сучасна мыслячы кіраўнік», — сказаў Уладзімір Макей. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта падкрэсліў, што Пётр Руднік мае добры патэнцыял для паспяховага вырашэння задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Магілёўскай вобласці.

# Ражджэственскае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Як знамянальна, што гэтае Ангельскае павучэнне было дадзена людзям якраз у ноч Ражджства Ісуса Хрыста — Сына Божага, Сына Чалавечага! З паслання апостала Паўла мы ведаем, што Хрыстос Спасіцель, «Адзін са Святой Троіцы», у дні Свайго зямнога жыцця быў такім самым чалавекам, як мы, і быў «як і мы, спакушаны ва ўсім, акрамя граху» (Яўр. 4: 16).

Мы ведаем і заклікі Святых Айцоў да таго, каб кожны хрысціянін усімі сваімі сіламі імкнуўся быць падобным да Госпада Ісуса Хрыста — новага Адама, дасканалага ў духоўнай барацьбе і ў дасягненні перамогі над смерцю, якую апостал Павел называе нашым «апошнім ворагам» (1 Кар. 15: 26).

Але як і з чаго пачаць чалавеку, асабліва ў юным узросце, сваё ўзыходжанне да Бога? Як сумясціць у зямным жыцці ўсю шырыню Нябёсаў і веліч Вечнасці з даляглядам нашай паўсядзённасці і з марнасцю жыццёвай мітусні? Не выпадкова мы задумваемся пра гэта сёння, калі пачынаецца Новы год добрасці Божай.

І як заўсёды, адказ на гэтае пытанне мы знаходзім у Бібліі: «Ухіляйся ад зла і рабі дабро, шукай міру і следуй за ім» (Пс. 33: 15). Падобна да Ражджэственскага славаслоўя Ангелаў, гэтая запаведзь з'яўляецца самым дасканалым педагагічным правілам і для юнака, і для старца, і для дзіцяці, і для яго бацькоў.

Рабіць дабро — гэта нашае хрысціянскае пакліканне ў свеце. Вось чаму, становячыся старэйшымі, нашы дзеці павінны бачыць перад сабою прыклады дабрадзейнасці і ў сям'і, і ў грамадстве, каб змоладу вучыцца любові да Бога і да чалавека. Яны могуць з дзейснай і малітоўнай дапамогай старэйшых навучыцца адрозніваць дабро і зло і выбіраць першае, ухіляючыся ад зла. Тым больш, што ў дзецях глыбей развіты прыродныя пачуцці праўды і справядлівасці, міласэрнасці і спачування, якія хоць і могуць прытупіцца з гадамі, але робяцца ўсё больш запатрабаванымі па меры ўзрастання чалавека.

Пошук міру ўласцівы сталаму ўзросту, бо з гадамі ўсё больш зразумелым і жаданым робіцца здзяйсненне закліку прападобнага айца нашага Серафіма Сароўскага: «Здабудзь дух мірны, і тысячы вакол цябе спасуцца».

І, нарэшце, на схіле гадоў для чалавека асабліва жаданай робіцца магчымасць атрымаць асалоду таго міру, які ён узрошчваў на працягу ўсяго свайго жыцця.

Узлюбленыя браты і сёстры! У надыходзячым годзе споўніцца чвэрць стагоддзя з таго часу, як нашаю Маці-Царквою было ўстаноўлена святкаванне ў гонар Сабора Беларускіх святых.

За гэтыя гады Сабор значна павялічыўся! Мы ўдзячны Госпаду за тое, што Ён адкрывае імёны нашых нябесных хадайнікаў. Ведаючы гэтыя імёны, мы малітоўна звяртаемся да беларускіх святых і праслаўляем іх, радуючыся той перамозе праўды Божай, якая ўмацоўваецца іх подзвігам.

Успамінам пра гэтую памятную гадавіну мы працягваем асэнсаванне 1020-годдзя Хрышчэння Русі — гэтай трыадзінай урачыстасці, якая аб'яднала рускі, украінскі і беларускі народы. І сёння мы з асаблівай яснасцю ўсведамляем, што 25 гадоў таму, калі пра змены ў жыцці краіны ніхто не мог і падумаць, а духоўнае праабражэнне гістарычна хрысціянскіх народаў і адраджэнне Праваслаўнай Царквы здавалася справай вельмі далёкай, — мы пачалі сваё духоўнае адраджэнне з малітоўнага звароту да нашых святых суайчыннікаў.

І яны адклікнуліся ўсёю сілаю сваіх сэрцаў! Бо нашы набожныя продкі вельмі жадаюць, каб падобна да іх і мы, жыхары XXI стагоддзя, маглі стаць суграмадзянамі святым і сваімі Богу, паводле натхнёных слоў апостала Паўла (Эф. 2: 19).

Многія імёны нашых беларускіх мучанікаў былі ўнесены ў святцы па благаславенні Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія Другога, які спачыў у дні пасвята Увядзення Багародзіцы ў храм. Пад яго ж святым амафорам прайшлі святкаванні юбілею Хрышчэння Русі. Ён быў вялікім працаўніком, які ўсё жыццё прысвяціў служэнню Маці-Царкве і народу Божаму. Да святкавання Юбілею быў прымеркаваны VI апостальскі візіт Свяцейшага Патрыярха ў Беларусь. Адпраўляючы богаслужэнні ў гарадах нашай Бацькаўшчыны, Яго Свяцейшаства сапраўды ўмацоўваў веру нашу «не на мудрасці чалавечай, а на сіле Божай» (1 Кар. 2: 5).

Яго малітвамі і свяцільскім подзвігам адраджаліся душы нашых суайчыннікаў пасля дзесяцігоддзяў жыцця без Бога. І гэтае адраджэнне было сапраўдным увядзеннем у храм для ўсёй нашай Айчыны, якая назаўсёды захавае ў сваіх сэрцах вобраз добрага пастыра зямлі Рускай, Свяцейшага Патрыярха Аляксія.

Дарагія браты і сёстры! У гэтыя святыя дні Ражджства мы накіроўваем нашы вітанні да ўсіх адзінаверных братоў і сясцёр нашых, да суайчыннікаў, якія жывуць па ўсім абліччы зямлі, і да ўсіх бліжніх і дальніх: «Хрыстос нараджаецца — слаўце! Хрыстос з нябёсаў — сустракайце! Хрыстос на зямлі — ўзносцеся!» (1-я песня канона Ражджства).

Хрыстос пасярод нас — і ёсць, і будзе! Амінь.

**Філарэт Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.**

*Ражджаство Хрыстова 2008/2009 Мінск.*

# Віншаванне са святам Нараджэння Хрыстовага

Дарагія жыхары Беларусі, браты і сёстры!

Сардэчна віншуем вас са святам

Нараджэння Хрыстовага і Новым 2009 годам!

Мы ўсе ведаем, навошта дараць падарункі. Калі вы хочаце зрабіць некаму прыемнае, калі вы хочаце наладзіць добрыя стасункі, калі ў вас у сэрцы жывуць добрыя пачуцці да некага, то вы тады пастараецеся зрабіць такому чалавеку прыемнае, падарыўшы яму падарунак.

А чаму на Раство прынята дарыць падарункі? Адкуль з'явілася гэта традыцыя?

Еванг. Лук. 2.11: «Бо цяпер нарадзіўся вам у горадзе Давідавым Збавіцель, Каторы ёсць Хрыстос Гасподь».

Нараджэнне Хрыста — гэта падарунак Бога ўсім нам.

Якім каштоўным быў гэты дар, каторы неба прапанавала людзям у тую далёкую ноч у Віфлееме! Якім неацэнным быў скарб, апрануты ў такое безабароннае і маленькае цела.

Ісус прыйшоў з вечнасці, каб даць нам вечнасць.

Ісус спусціўся з нябёсаў, каб падняць нас на нябёсы.

Анёлы абвясцілі, што нараджэнне Збавіцеля з'яўляецца знакам дабрыні Бога да людзей, г.зн. Ягоным падарункам.

Вось чаму на Раство прынята дарыць падарункі!

Бог паказаў нам на яслі народжанага Немаўляці і сказаў: «Калі б Я не быў добры да Вас, то Я не паслаў бы ў свет Свайго Сына».

Нараджэнне Хрыста ў свет было знакам найвялікшай дабрыні Бога да людзей.

Неяк у адной сям'і штосьці адбылося ва ўзаемаадносінах, яны пасварыліся, жонка сабрала рэчы і пайшла да бацькоў. Муж доўга званіў, казаў, што кахае яе, і прасіў вярнуцца, але жонка казала, што не верыць яму. Тады ён прыйшоў па яе і сказаў: «Я кахаю цябе, вяртайся дахаты». Пазней, успамінаючы гэту сварку, муж запытаў жонку: «Чаму ты не вярталася дахаты раней, пакуль я не прыйшоў па цябе?»

Жонка адказала: «Калі ты казаў, што кахаеш мяне, гэта былі толькі словы, але калі ты прыйшоў па мяне, я зразумела, што ты сапраўды кахаеш».

Сябры, ці не гэта зрабіў Бог? Калі б Бог проста сказаў, што любіць нас, што Ён добры да нас, то многім з нас гэтага было б недастаткова, бо гэта былі б проста словы.

Але Бог не проста сказаў гэта, Ён Сам прыйшоў на гэту зямлю, Ён Сам прыйшоў, каб сказаць: «Я люблю вас, Я прыйшоў па вас, вяртайцеся дахаты».

Раство — гэта і ёсць доказ таго, што Творца любіць вас.

Гэтая вестка належыць «усім людзям».

Бог прыйшоў на гэту зямлю дзеля вас. Ён памёр на крыжы замест вас. Вечнае жыццё, якое Ён прапануе ўсім, Ён таксама прапануе кожнаму чалавеку.

Бог хоча сёння даць вам гэты падарунак, Свайго Сына Ісуса Хрыста!

З любоўю да ўсіх вас

**Епіскап цэркваў евангельскіх хрысціян баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь Мікалай СІНКАВЕЦ.**

# ПОПЫТ АМАЛЬ ЗНІК, ТАМУ АРЭНДА Ў USD ПАЧЫНАЕ ТАННЕЦЬ

Яшчэ месяц таму сярэдні кошт арэнды аднапакаёвай кватэры ў Мінску складаў каля 300 долараў. Ужо ў апошнія два тыдні мінулага года сусветны фінансавы крызіс падкарэктаваў цэннікі арэнды жылля ў сталіцы прыкладна на 30—40 долараў. Гаспадары кватэр тады пачалі згаджацца здаваць аднапакаёвыя кватэры ўжо нават па 250—270 долараў...

**ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ПРАПАНОВА «СЛАБЕНЬКІХ» КВАТЭР**

У першы працоўны дзень новага года на рынку арэнды жылля працягваўся «мёртвы» сезон, калі рэальных здзелак амаль увогуле не назіралася. Кліенты агенцтваў нерухомасці цікавяцца танным жыллём, калі за аднапакаёвую кватэру яны згодныя плаціць арэнду ў межах 500—600 тысяч рублёў, што па новым курсе адпавядае 180—220 доларам. А вось гаспадары стандартных кватэр на такое патанненне ў доларавым вымярэнні пакуль не згодныя. Разам з тым, у пачатку новага года на рынак арэнды пачынаюць больш актыўна «выкідваць» не зусім якасныя кватэры. Паводле інфармацыі начальніка аддзела арэнды жылля сталічнага агенцтва нерухомасці «Час пік» Сяргея Кадолы, сёння павялічылася прапанова адносна танных кватэр за 200—250 долараў. Галоўным чынам па такім кошце прапануецца з маленькай плошчай жыллё ў Шабанах і аднапакаёвыя кватэры без мэблі ў новых дамах Малінаўкі і Сухарава або ў старых дамах Серабранкі. Такое жыллё раней карыстала мінімальным попытам...

**У ЛЮТЫМ АРЭНДА ПАТАННЕЕ АБАВЯЗКОВА**

Спецыялісты агенцтваў нерухомасці адзначаюць, што цэннікі стандартных ліквідных кватэр пакуль застаюцца на снежаньскім узроўні. Проста рынак яшчэ не «пераварыў» новы кошт замежных валют. Эксперты рынку нерухомасці ўпэўненыя, што істотнае зніжэнне попыту на стандартнае аднапакаёвае жыллё моцна паўплывае і на кошт арэнды. Паводле прагнозаў спецыялістаў, ужо ў лютым сярэдні кошт арэнды аднапакаёвых кватэр будзе складаць 220—200 долараў і нават ніжэй. Канчатковы цэннік арэнды будзе залежаць ад памераў рэальных заробкаў жыхароў сталіцы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## У нядзелю пацяплее

На працягу гэтага тыдня будзе марозна, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава. У сераду снег будзе назірацца паўсюдна на тэрыторыі краіны. Тэмпература паветра ў ноч на 7 студзеня — мінус 8—15 градусаў, па поўдні — да мінус 18, удзень — 5—12 марозу. У чацвер і пятніцу ўначы 7—14, у асобных раёнах да 16—18, а ў ноч на 9 студзеня па ўсходзе Беларусі да 23 марозу. Удзень у чацвер мінус 7—14, у пятніцу мінус 2—7, па ўсходзе — да 10 марозу. Толькі напрыканцы тыдня маразы аслабеюць. Тэмпература паветра ў суботу мінус 3—10 градусаў, па паўночным усходзе да 13 марозу. У нядзелю ўначы мінус 4—11, па ўсходзе да 18 марозу, удзень — ад плюс 1 градуса па захадзе, да 6 марозу па ўсходзе. Паўсюдна снег.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## УМЕРЗ У ВАДУ...

Яшчэ да Новага года 30-гадовы жыхар Рагачоўскага раёна пайшоў на рыбалку на раку Друць. Жонцы патэлефанаваў, што заблудзіўся. На яго пошукі былі кінуты супрацоўнікі МНС і міліцыі. У выніку мужчыну знайшлі 31 снежня ўмерзлым у ваду.

На наступны пасля свята дзень чацвёра аматараў рыбнай лоўлі накіраваліся на возера Вірвіха, што побач з вёскай Абухоўшчына ў Калінкавіцкім раёне. Пайшлі вудзіць у розныя бакі і дамовіліся, што сустрэнуцца ў вызначаны час. Але ж двое з іх не выйшлі на месца. Іх мабільныя таксама не адказвалі на званкі. Супрацоўнікі МНС знайшлі мужчын ноччу ў забалочанай мясцовасці за 200 метраў ад цвёрдага грунта. Па іх словах, адзін праваліўся пад лёд, другі яго выцягнуў, а потым яны адагравaліся каля разведзенага вогнішча. Той, хто пабываў пад вадой, зараз з абмаражэннямі знаходзіцца ў мясцовай бальніцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## КУПАЛАЎСКІ ТЭАТР УЗНАЧАЛІЦЬ «НАШ ЧАЛАВЕК» З РАСІІ

Мікалай Пінігін даў згоду стаць галоўным рэжысёрам Нацыянальнага тэатра імя Янкі Купалы. Пра гэта паведаміў загадчык літаратурнай часткі тэатра Вадзім Дапкюнас. Валерый Раеўскі застанецца працаваць у тэатры рэжысёрам-пастаноўшчыкам, яго заяву 5 студзеня падпісаў дырэктар Мікалай Кірычэнка.

Аднак пытанне, хто будзе працаваць дырэктарам Купалаўскага тэатра разам з новым галоўным рэжысёрам, таксама будзе вырашана ў найбліжэйшыя дні: Мікалай Кірэчынка, які «аддуваўся» за эмацыянальны выхад акцёрскіх пачуццяў з тэатральнага асяродку ў шырокія колы зацікаўленых гледачоў, сваё рашэнне сысці агучыў яшчэ восенню. Так атрымалася, што вырашэнне пытання наконт далейшага кіраўніцтва Купалаўскага тэатра прыпала на апошнія дні мінулага года. Кандыдатура Мікалая Пінігіна ў розных абмеркаваннях называлася найчасцей: ён выдатна ведае беларускі тэатр, у якім паставіў шмат спектакляў, заставаўся звязаны з ім, нягледзячы на тое, што пераехаў працаваць у Санкт-Пецярбург. Аднак гучалі сумненні: ці пагодзіцца вярнуцца ў наш тэатр рэжысёр славутага ВДТ, які ўжо ўладкаваў сваё жыццё ў паўночнай сталіцы Расіі? Міністр культуры Беларусі Уладзімір Мацвяйчук, які прыходзіў у тэатр напрыканцы года, пацвердзіў, што дамова з Пінігіным была дасягнутая.

Мікалай Пінігін — вучань менавіта беларускай тэатральнай школы, яго кар'ера ў тэатры пачыналася з працы ў тэатры імя Горкага, але з 1985 года ён быў рэжысёрам тэатра імя Янкі Купалы. Пінігін па-свойму адчувае беларускую драматургію і імкнецца знайсці ў ёй думкі, якія застаюцца важнымі для сучасных грамадзян Беларусі. Напрыклад, у мінулым годзе грамада актыўна абмяркоўвала яго пастаноўку «Пінскай шляхты».

Чакаецца, што сам рэжысёр з'явіцца ў тэатры ўжо напрыканцы гэтага тыдня і будзе афіцыйна адрэкамендаваны трупе.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**ОАО «Нерудпром» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже транспортных средств и оборудования:**

| № лота | Наименование и технические характеристики | Начальные цены с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Полуприцеп «ОДАЗ 9370» (1991 г.в., бортовой, 2-осный, 2-скатный | 1 950 000 |
| 2 | Погрузчик ПК- 6 (1992 г.в., г/п 6 т) | 40 456 500 |
| 3 | Бульдозер ДЭТ-250 (в экспл. с 1988 г.) | 83 834 000 |
| 4 | Экскаватор МТП – 71б (в экспл. с 1990 г.) | 31 714 500 |
| 5 | Экскаватор Э-2503 (в экспл. с 1970 г.) | 123 698 000 |
| 6 | Экскаватор Э-2503 (в экспл. с 1970 г.) | 123 698 000 |
| 7 | Дробилка КМД – 1200 (в экспл. с 1987 г.) | 108 883 415 |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.11.2008 г. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Тел: (8017) 224 61 34 ( www.rlt.by).**

УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**информирует:**

в извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды нежилых помещений, опубликованное в газете «Звязда» от 30.12.2008 г.,

**вносится изменение:**

**«аукцион состоится 20.01.2009 г. в 15.00 по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, ул. Западная, 9, актовый зал Управления «Торгсервис». Тел.: (8017) 224 61 34.** УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства незавершенного строительством садового домика и земельного участка пл. 0,0730 га в садоводческом товариществе «Ручьи» Минского р-на. Начальная цена снижена и составляет 18 232 560 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 13.05.2008 г. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

**ОАО «Белагропромбанк» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже гаражей, расположенных по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 91:**

| № лота | № гаража | Пл. кв.м | Нач. цена с НДС | Задаток от нач. цены |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 Б (с ямой) | 28,3 | 24 160 000 | 10 % |
| 2 | 3 Б | 16,5 | 14 576 000 | 10 % |
| 3 | 4 Б | 16,3 | 15 174 000 | 10 % |
| 4 | 5 Б | 16,7 | 14 775 000 | 10 % |
| 5 | 6 Б | 16,6 | 14 576 000 | 10 % |
| 6 | 7 Б | 16,4 | 14 576 000 | 10 % |
| 7 | 8 Б | 15,7 | 13 777 000 | 10 % |
| 8 | 9 Б | 16,6 | 14 576 000 | 10 % |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2008 г. Аукцион состоится **20.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Тел.: (8017) 224 61 34 (www.rlt.by).**

УНП 690324015

**ОАО «МИНСКГРУЗАВТОТРАНС»**

**извещает своих акционеров о проведении 27 января 2009 года внеочередного собрания акционеров.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Минскгрузавтотранс».

**Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2. Начало собрания в 15.00.**

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 2, комн. 37) в рабочие дни в период с 19 по 26 января 2009 года с 8.30 до 13.30, а в день проведения собрания — в помещении, где оно проводится.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 в день и по месту проведения собрания — по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров и доверенности.

Список акционеров Общества, имеющих право на участие в собрании, составлен на основании данных реестра акционеров по состоянию на 5 января 2009 года.

**Справки по тел. (8 017) 222 98 09.**

**Наблюдательный совет ОАО «Минскгрузавтотранс».**

У суд Любанскага раёна Мінскай вобласці паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **АХРАМЕЙКІ Анжэлікі Уладзіміраўны,** 7 ліпеня 1969 года нараджэння, ураджэнкі в. Новая Дуброва Любанскага раёна, апошняе вядомае месца жыхарства якой — в. Купнікі, вул. Школьная, д. 30 А Любанскага раёна.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Ахрамейку Анжэліку Уладзіміраўну, паведаміць іх суду Любанскага раёна на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# У БЕЛАРУСІ ВА ЎМОВАХ СУСВЕТНАГА КРЫЗІСУ НЕАБХОДНЫ НЕШАБЛОННЫЯ РАШЭННІ

Беларуская эканоміка павінна хутка адаптавацца да новых рэалій у сувязі з сусветным эканамічным і фінансавым крызісам, і ў сувязі з гэтым у краіне сёння асабліва запатрабаваны дасведчаныя кіраўнікі, якія могуць прымаць нестандартныя рашэнні і цвёрда дабівацца выканання пастаўленых ім задач. Аб гэтым заявіў 31 снежня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з актывам Магілёўскай вобласці.

Кіраўнік дзяржавы прадставіў новага старшыню Магілёўскага аблвыканкама Пятра Рудніка, які ў гэты ж дзень раней быў зацверджаны на пасадзе на сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Паводле слоў Прэзідэнта, цяпер у кадравай палітыцы ў краіне стаўка робіцца менавіта на работнікаў вытворчасці — людзей, якія добра ведаюць эканоміку і могуць вырашаць складаныя шматмэтавыя задачы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў добрыя арганізатарскія здольнасці Пятра Рудніка і выказаў упэўненасць, што атрыманы вопыт кіраўніцтва шматтысячным калектывам дасць магчымасць яму таксама паспяхова арганізаваць работу народнагаспадарчага комплексу вобласці.

«Галоўнае, што ў яго ёсць неабходны інтэлектуальны патэнцыял, высокія арганізатарскія здольнасці і добрая практыка кіравання ў вытворчай сферы. Ён на справе паказаў сваё ўменне гаспадарыць, вытрымліваць канкурэнцыю ў жорсткіх умовах сучаснага рынку», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў Пятра Рудніка з назначэннем на пасаду старшыні аблвыканкама і ўручыў яму службовае пасведчанне.

Гаворачы аб новых патрабаваннях і падыходах у кадравай палітыцы, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ва ўмовах сусветных крызісных з'яў у Беларусі патрэбны прынцыповыя кіраўнікі, якія добра ведаюць сваю справу і пры гэтым могуць прымаць нешаблонныя рашэнні.

«Усё, што можна было зрабіць «зверху» для работы народнагаспадарчага комплексу і жыцця людзей, мы зрабілі. Сёння патрэбны рашучыя дзеянні з боку іншых кіраўнікоў», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго словаў, наступны год можа быць няпростым з пункту гледжання пераадолення негатыўных наступстваў фінансавага крызісу, які ахапіў планету. «Быць убаку ад гэтага ў нас наўрад ці атрымаецца, мы гэта ўжо сёння адчуваем», — лічыць кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што эксперты ва ўсім свеце знаходзяцца ў няпэўнасці: «Ніхто не ведае, колькі крызіс прадоўжыцца, як ён будзе развівацца. Я некалі сказаў, што ў аснове гэтага крызісу вялікі складальнік мае карупцыя. Сёння ўжо на ўзроўні ААН гэта пацверджана».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што больш за ўсё негатыўныя наступствы сусветнага крызісу адчуваюць экспартаарыентаваныя прадпрыемствы. «Але я папярэджу ужо: ніякай скідкі на гэта не будзе. Сёння не час хадзіць і ныць, прынята рашэнне — яго трэба выконваць любымі спосабамі, нават калі гэта патрабуе ломкі нейкіх сталых уяўленняў. Калі мы гэта не зробім, то наступны год можа быць для нас складаным. А калі вытрымаем у 2009 годзе на патрэбным узроўні, не апусціўшыся да гранічнай планкі, то ў нас будзе ўсё для таго, каб затым, калі пачнецца ў свеце ўздым, хутчэй за іншых уварвацца са сваёй прадукцыяй на рынак. Гэта наша галоўная задача, паколькі ў нас экспартаарыентаваная эканоміка. Знешнія рынкі выстаўляюць высокія патрабаванні да ўзроўню вытворчасці, таму мы павінны вельмі хутка адаптавацца. Прадукцыя, якую мы выпускаем, патрэбна ва ўсім свеце», — пераканаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама сказаў, што необходна максімальна развіваць імпартазамяшчэнне, насычаць свой уласны рынак той прадукцыяй, якую беларусы могуць вырабляць. «Трэба выпускаць тое, што можна прадаць, за што можна атрымаць грошы і дзякуючы гэтаму захаваць вытворчасць і рабочыя месцы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што зніжэнне цэнаў на прадукцыю — непазбежнае. «Цэны ўпалі ва ўсім свеце ў 2-3 разы, у тым ліку на рэсурсы. Тое ж самае будзе і ў нас. На нафту цэны знізіліся ў 3-4 разы. З першага квартала 2009 года цэны на прыродны газ будуць высокімі, але плаціць мы будзем пабоску. Яны да канца года ўпадуць у 3 разы, гэта ўжо дакладна, нягледзячы на тое, як будзе складвацца цана на прыродны газ на сусветным рынку. Будзе заключаны кантракт, і там будзе ўсё прапісана. Прынамсі, калі за апошні час нічога ў перагаворах з Масквой не змянілася, у нас ёсць магчымасць мець прыблізна тую ж цану на газ, якую маем у гэтым годзе», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На нарадзе Прэзідэнт даў станоўчую ацэнку рабоце папярэдняга губернатара Магілёўшчыны Барыса Батуры, які за гады кіраўніцтва вобласцю зрабіў сур'ёзныя захады па нарошчванні эканамічнага патэнцыялу, правядзенні пазітыўных пераўтварэнняў па ўсіх сферах.

Аляксандр Лукашэнка, падводзячы прамежкавыя вынікі работы вобласці, адзначыў пазітыўную дынаміку развіцця Магілёўшчыны. У рэгіёне створана і мадэрнізавана нямала прамысловых прадпрыемстваў, захоўваецца высокая дынаміка сацыяльна-эканамічнага развіцця, актыўна вядзецца інвестыцыйная дзейнасць, паспяхова развіваецца знешнеэканамічны сектар. Аднак, як падкрэсліў Прэзідэнт, вытворчы і рэсурсны патэнцыял Магілёўшчыны рэалізаваны яшчэ не ў поўнай меры. Паводле словаў кіраўніка дзяржавы, неабходна прадоўжыць работу па фінансавым аздараўленні суб'ектаў гаспадарання, тэхнічным перааснашчэнні, стварэнні навукаёмістых і рэсурсазберагальных вытворчасцяў, рэканструкцыі прадпрыемстваў хімічнага і нафтахімічнага комплексу.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што ў канцы пяцігодкі кіраўніцтву воб

# ШЛЯХ ДА ВІФЛЕЕМА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Упершыню журналіст з беларускай газеты быў прыняты Блажэннейшым Патрыярхам Святога Града Іерусаліма і ўсёй Палесціны Феафілам III. Прадстаяцель Іерусалімскай Праваслаўнай Царквы пазнаёміўся з некалькімі нумарамі газеты «Звязда», паслухаў кароткі расповед пра гісторыю старэйшай беларускай газеты. На развітанне Яго Блажэнства Феафіл III пакінуў у блакноце нашага карэспандэнта традыцыйныя словы добрых пажаданняў нашым чытачам і павіншаваў іх са Святам Нараджэння Хрыстова.

Натхнёны цёплым прыёмам у Прадстаяцеля мацi хрысціянскіх цэркваў, раніцай наступнага дня я рушыў у дарогу. Маршрут падказала сама перадсвяточная атмасфера: надыход Свята Нараджэння Хрыстова адчуваўся паўсюль. Даехаць з Іерусаліма да месца нараджэння Збавіцеля горада Віфлеема ўдалося менеў чым за гадзіну — падзяляюць іх некалькі дзясяткаў кіламетраў дагледжанай шашы і, так званая, сцяна бяспекі. Мінуўшы прыгарад, дарога прывяла ў нізіну між камяністымі халмамі. На пакатых схілах заўважныя невялічкія паселішчы сціплай забудовы і цёмна-карычневыя кавалачкі клапатліва апрацаванай зямлі. Колькі тысячагоддзяў, прыстасоўваючыся да мясцовай неласкавай прыроды (а не змагаючыся з ёй!), чалавек вырошчвае тут хлеб, збірае плады з невысокіх каржакаватых аліваў... Напэўна, таксама здаўна людзі адстойваюць тут свае правы на зямлю, на яе каштоўнасці і Святыні. Яшчэ раз падумалася пра гэта на зваротным шляху ў Іерусалім, калі наш аўтамабіль ненадоўга прыпыніўся, каб праехаць праз пункт кантролю: узброеныя людзі карэктна праверылі дакументы, зазірнулі у салон, у маю рэпарцёрскую сумку з фотаапаратамі. У гэтыя дні на зямлі Ізраіля асабліва неспакойна. Калі льецца кроў і грымяць выбухі — ніякая асцярога не бывае залішняй.

Кажуць, што на Зямлі налічваецца некалькі тысяч храмаў, асвечаных у гонар Нараджэння Хрыстова. Але першы сярод усіх, безумоўна, знаходзіцца ў Віфлееме. Пабудаваны ён яшчэ ў 326 годзе над пячорай, дзе нарадзіўся Збавіцель. Ініцыятар гэтай будоўлі візантыйская царыца Алена забяспечыла сабе, па сучасным кажучы, ганаровае месца на старонках гісторыі хрысціянства. Пазбегнуўшы разбурэнняў і аднаўленняў, храм і сёння красуецца ў выглядзе своеасаблівай крэпасці.

Правы ад алтара ўваход у пячору належыць праваслаўным, але наведаць і пакланіцца Святыні прыходзяць вернікі ўсіх канфесій. Пад цэнтральнай часткай на невялікай глыбіні знаходзіцца месца Нараджэння Збавіцеля. Побач з пячорай грот — гэта яслі, куды Дзева

Срэбная зорка і яслі, дзе немаўляткам ляжаў Збавіцель, — самыя галоўныя месцы ў пячоры Нараджэння.

У гэтага чалавека адказная справа — ён даглядае мноства вялікіх і маленькіх лампадаў, якія даюць святло ў пячоры Нараджэння.

На гэтых фотаздымках — некалькі імгненняў, якія аб'ектыў убачыў на шляху з Іерусаліма ў Віфлеем: людзі са зброяй, іх жытло са слядамі выбухаў...

Няхай дапаможа ім Божа ўладкаваць жыццё так, каб ніколі не лілася кроў на Святой Зямлі.

Марыя паклала маленькага Ісуса. У глыбокай нішы алтар, а на падлозе — вялікая срэбная зорка з надпісам на лацінскай мове: «Тут Дзева Марыя нарадзіла Ісуса Хрыста».

Дарэчы, з гэтай зоркай, як і са шмат якімі іншымі хрысціянскімі Святынямі, звязаны падзеі, якія ўплывалі на нашу агульную гісторыю. Так, напрыклад, срэбную зорку ў сярэдзіне XIX стагоддзя выкралі. Гэта святатацтва стала тады адной з падстаў для развязвання Крымскай вайны.

Віфлеем шырока вядомы з нагоды яшчэ аднаго біблейскага падання: у гэтай мясцовасці паводле загаду цара Ірада былі знішчаны ўсе дзеткі мужчынскага полу ўзростам да двух гадоў. Так бязлітасны дыктатар спрабаваў павярнуць ход гісторыі — прадвешчанае нараджэнне Збавіцеля.

У тыя далёкія часы за 11 кіламетраў на ўсход ад Віфлеема, у іншай пячоры спыніліся на ноч валхвы, якія пакланіліся народжанаму Збавіцелю. Праз пяць стагоддзяў каля гэтага месца быў заснаваны манастыр — прыстанак неўзабаве стаў шырока вядомы сваімі клопатамі аб хворых і вандроўніках. Тут у 1173 годзе была пахавана першая жанчына, потым кананізаваная Рускай Праваслаўнай Царквой — заступніца зямлі беларускай Ефрасіння Полацкая. Напрыканцы свайго зямнога жыцця Ефрасіння вырашыла здзейсніць духоўны подзвіг — паломніцтва на Святую Зямлю. Ёй раілі не пачынаць гэты цяжкі і небяспечны шлях, але яна была непахісная. Маці Ефрасіння дабралася да Святой Зямлі, дзе праз некалькі дзён свайго знаходжання ў Іерусаліме памерла.

Яе словы пра гэта падарожжа — найвялікшая каштоўнасць, захаваная для нашчадкаў: «Дайсці да Святога Града Іерусаліма і памаліцца Гробу Гасподняму і ўсім святым месцам, бачыць і цалаваць, і там жыццё скончыць...»

Ужо потым, калі ў аэрапорце бліз Міжземнага мора гадзіны чаканння спрыялі ўспамінам, я занатаваў у свой блакнот верш на адлёт са Святой Зямлі:

*Хай ты вандроўнік*
*на Зямлі Святой,*
*Хай невядома дзе твая Айчына,*
*Але яднае ўсіх паміж сабой*
*Зямля і Неба Іерусаліма.*
*Яны яднаюць тое, што было,*
*З усім, што стрэнеш у радасці*
*ці ў горы,*
*Зямля і Неба —*
*як з крылом крыло,*
*І чалавек, як птушка у прасторы.*
*Мо будзе лёс ўсе далі абляцець*
*І заблудзіць*
*сюды вярнуцца сынам.*
*Каб перад сконам*
*бласлаўленне мець*
*Зямлі і неба Іерусаліма.*

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**
*(Іерусалім — Мінск)*

Аўтар вельмі ўдзячны Пасольству Рэспублікі Беларусь у Дзяржаве Ізраіль і Горненскаму манастыру ў Іерусаліме за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу.

# Прынцэса Аль Саід

Расказваеш-расказваеш казкі, і сам не заўважаеш, як апынаешся ў казцы. Ты трапляеш не ў простую тутэйшую казку, а ў казку арабскую, там, дзе тысяча і адна ноч. Учора ўночы прыйшла эсэмэска, што мая добрая знаёмая Віктарыя цяперака прынцэса Аль Саід. Але ўсё трэба распавесці ад самага пачатку... Пачалося тое даўно... Мне было чатырнаццаць, і я марыў змяніць сваё жыццё. Школа, з яе занудствам і пахам хлоркі, так абрыдла, што я вырашыў паступіць у мастацкую вучэльню. Там займаліся мае старэйшыя таварышы — Валодзя і Анатоль. Да іх я і прыйшоў. Анатоль пісаў карціну «Вяселле», а Валодзя — «Акоп». Іх сяброўка Люда пруткамі вязала шкарпэтку. Маленькая Люда сядзела пад вялікім палатном, на якім быў намаляваны эшафот з шыбеніцаю і нарадавольцамі. Змагары за волю чакалі смяротнага пакарання, а Люда спакойна вязала, бо сваю карціну яна скончыла. Побач з палатном Люды стаяла палатно не скончанае, на ім была балетная студыя з артыстамі ў чорных майках і чорных трыко. Выкладчык Дубар казаў, што трэба маляваць артыстаў з натуры, а Зарына — ўпарка палатна з балетнай студыяй — адказвала, што ёй няма дзе ўзяць натуршчыкаў. Выкладчык Дубар паглядзеў на мяне і спытаўся, што я раблю сярод дыпломнікаў. Я прамаўчаў. Тады Дубар прапанаваў Зарыне памаляваць мяне. Сказаць выкладчыку, што мне трэба рыхтавацца да іспытаў і ў мяне няма часу пазіраваць, я, вядома, мог, але я падумаў: можна пазіраваць і рыхтавацца адначасова. Зарына прынесла мне чорнае трыко і чорную майку. Я стаяў і вучыў вершы, а Дубар з Зарынаю малявалі. Я вучыў верш Цёткі пра бурнае мора і цара, якога абавязкова трэба павесіць. Люда вязала шкарпэтку, а Валодзя і Анатоль мне зайздросцілі. Ты падабаешся самай прыгожай дзяўчыне ў мастацкай вучэльні!.. Казалі яны. Ну і што з таго? Яны не разумелі майго раўнадушша да прыгажосці Зарыны. Для мяне Зарына была проста мастаком, якому спатрэбіўся натуршчык на некалькі сеансаў. Безумоўна, я змог здзівіць і Зарыну і Дубара тым, што ведаў харэаграфію. Раней я думаў, што чортава харэаграфія ў маім мужчынскім жыцці ніколі не спатрэбіцца. Іншая рэч акрабатыка, якую я любіў. Акрабатыкай і харэаграфіяй я займаўся ў секцыі фігурнага катання. У першым класе мне хацелася катацца на каньках, як хлопчыку Каю з казкі Андарсана пра ўсёмагутную Снежную Каралеву. Мяне запрасілі ў секцыю фігурнага катання і я пракатаўся ўсю зіму, а вясною празаймаўся акрабатыкаю і харэаграфіяй. Таму пазіраваць у якасці артыста балета ў мяне атрымлівалася выдатна. Дубар і Зарына былі мне ўдзячныя. І ўсе чатыры гады, пакуль я займаўся ў мастацкай вучэльні, Дубар мною апекаваўся, дапамагаў у цяжкія хвіліны, а іх, павер ты мне, хапала. А Зарыну я больш ніколі і не бачыў. Я зусім пра яе забыў, і можа ніколі б і не згадаў, каб у мяне дома не з'явілася Вікторыя. Яна фатаграфавалася ў маёй жонкі...

Скажу праўду, я ведаю далёка не ўсіх, хто фатаграфуецца ў маёй жонкі. Яна здымае так шмат, яна фатаграфуе столькі жанчын, што я проста не магу ўсіх ведаць. Але Віка вылучылася тым, што яе твар быў знаёмы, я пацікавіўся і высветліў, што Вікторыя — дачка Зарыны, якой я пазіраваў у чорным трыко і чорнай майцы. Віка сказала мне пра тое, што Зарыны даўно няма. Заўчасная смерць яе мамы прымусіла мяне ставіцца да Віктарыі па-бацькоўску. Такое прыязнае і цёплае стаўленне мела свае наступствы... Аднойчы яна прывяла ў маю майстэрню прынца Шабіба Аль Саіда. Шабіб паразважаў пра мой жывапіс і набыў палатно ў падарунак для свайго старэйшага сына архітэктара. Прынцы з Амана могуць сабе дазволіць набываць творы не толькі вялікіх мастакоў з вялікіх краін, але і творы звычайных мастакоў з краін маладых і малавядомых. Вікторыя таксама звезла ў Парыж два мае палатны. З Парыжа Шабіб з Вікаю паехалі ў Аман, адкуль і прыйшло паведамленне, што наша Вікторыя цяперака прынцэса Аль Саід.

Вядома, я парадаваўся за прынцэсу Аль Саід, але мне захацелася вярнуцца ў мінулае, вярнуцца ў прасторную майстэрню, дзе мае таварышы Валодзя і Анатоль пісалі карціны «Акоп» і «Вяселле», дзе Люда вязала пруткамі ваўняную шкарпэтку. Вярнуцца і сказаць Зарыне, што яна народзіць дачку, якая стане сапраўднай прынцэсаю з казкі, дзе тысяча і адна ноч.

**Адам ГЛОБУС.**

# Сам Бог рад, калі ў хаце лад...

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 31 снежня.)*

Адсюль і дзеяслоў **дзедаваць** — раскашавацца ў ядзе, есці як на Дзяды...

Нават кормны кабан, якога гадавалі на мяса да Дзядоў, меў адмысловую назву **дзедавік**.

Акрамя сваяцкіх адносінаў словы дзед і бабка захавалі на дзіва шмат значэнняў у сваіх пераасэнсаваннях: колькі розных прадметаў называлася гэтымі словамі! Не будзем згадваць пра тых, якія маюць зыходным слова дзед. Нават куды меншая па багацці бабка і тая што значыла! Тут і маленькая прылада, на якой кляпалі касу, тут і дзясятак снапоў, пастаўленых для прасушкі і накрытых адным з іх, і звараная яда з расцёртай бульбы... Кожны з нас, паходжаннем з вяскоўцаў, добра прадоўжыць такі словаспіс.

Але ж былі яшчэ **бабіны** — свята ў гонар павівальнай бабкі. На другі дзень Нараджэння Хрыстова ўвечары муж і жонка, у якіх бабка-павітуха прымала нованароджанае дзіця, прыходзілі да яе з пачастункам.

Было і слова **бабіць** — прымаць дзіця ў парадзіхі, рэзаць і завязваць пупок, упершыню купаць малое...

Цяпер даўно ўжо ўсе гэтыя функцыі перададзены адмысловай медыцыне.

Але маё пакаленне, ды і пазнейшае, народжанае ў вайну, удзячнае і абавязанае гэтым бабкам павітухам...

Далей за дзеда і бабку — **прадзед** і **прабабка**. З-за невялікага агульнага даўгалецця даўней яны не так часта сустракаліся ў жыцці: праўнук ці праўнучка на руках у прадзеда ці прабабкі.

І калі гэта здаралася, бачылі ў тым знак Божай ласкі і казалі пра таго прадзеда ці прабабку: яны будуць у раі.

Дзякуй Богу, мы з жонкаю дачакаліся праўнучкі, і я навучыў яе ў тры з палавінаю гады чытаць цэлымі словамі...

За прадзедамі і прабабкамі ў глыбіню стагоддзя — **прапрадзеды** і **прапрабабкі**, а яшчэ далей прашчуры. А ўсе маладзейшыя пакаленні ў адносінах да іх — нашчадкі.

І якое шчасце было ў маладой, калі яна ішла замуж у мужаву хату, дзе не было ні **ятроўкі** (жонка аднаго брата ў адносінах да жонкі другога брата), ні **залоўкі** (мужавай сястры), з жанчын — толькі адна **свякроў** (мужава маці), якая ўжо не прымервала нявестку (сынавую) да свае дачкі або да нявестак другіх сваіх сыноў.

Можа і вам даводзілася чуць такія размовы між знаёмымі жанчынамі:

— Ну, як, пажаніла сваіх дзяцей?

— Ды ўжо ж, дзякуй Богу. Зяць то трапіўся добры. Не п'е, не курыць. Дадалося яшчэ ляжыць у пасцелі, а ён ужо нясе ёй сняданне. Адно каханне, дый годзе...

— А як сын?

— Ат, і не пытайся. Нейкая няўдаліца. Не ўстане рана. Ляжыць і чакае, каб мой сын ёй у пасцель каву нёс. Якая ж гэта жонка?

Чулі? Дык так яно... Сынавая і зяць — постаці часта вельмі адметныя, пра што і прыказка сведчыць: «Як убачыць маці зяця на дачцэ, то як золата ў руцэ, а як сына на нявестцы, то як г... на трэсцы».

І хоць пра зяця кажуць: «зяць любіць узяць», але «зяць на двор — чарка на стол», «як зяць у хату — цешча за яечню».

Усё ж узаемаадносіны між жончынаю маці — цешчаю — і зяцем не заўсёды складваліся лёгка. На жончынага бацьку — цесця — крыўды ў зяця прыказкамі не засведчана, а пра цешчу ўсё ж ёсць, нават на ўзор языкаломкі: «Быў у цёшчы, рад уцёшы».

А цяпер уявіце сялянскую хату, гэта ж, па сутнасці, адзін пакой у сённяшняй гарадской кватэры, хай нават найбольшы. Колькі братоў, жэнячыся прыводзяць нявестак. Бяда была не толькі ў цеснаце, а і з-за адной печы на кухні.

Бо варылі адначасова. Варыць маладым гаспадыням адна пасля адной не выпадала: дзе ж набрацца гэтулькі дроў?

Вось тут каля печы і таіліся падчас буркатня, нелады, звадка, грызня, сварка, а то і калатнеча. Скажам, тая ці іншая з нявестак, як падалося другой, ледзь не ўвесь жар падгарнула пад свой гаршчок ці чыгун... Як кажуць, думала мама выйсці за пана, ажно тата ўзяў.

А калі ў хаце мужава сястра — залоўка — перастарак (старая дзеўка), якую не бяруць замуж? Якім вокам глядзіць яна на **братавую** (братаву жонку)?

Тагачасная прыказка памятае: «Лепей дзевяць дзевяроў, чым адна залоўка». (Дзевер — гэта мужаў брат.) Або: «Залоўка горшая за воўка».

А цяпер, як успомніліся адпаведныя адносіны, самі паразважайце над такімі параўнаннямі: «Ноч — маці, дзень — мачаха, вечар — залоўка, раніца — ятроўка».

Успомнілася слова **брат** і тут жа побачкі з ім пасталі **братка**, **братачка**, **братанька**, **брацейка**, **братухна**, **братуля**, **братулька**, **братан** (вялікі, мажны), **братаніч**...

Прабачце, загаварыўся: **братаніч** — гэта пляменнік ужо, братаў сын, гэтак жа як **братаніца** — пляменніца, братава дачка. А сястрыны дзеці — адпаведна **сястрэніч**, **сестраніца**...

Але мы ўжо непрыкметна выйшлі з роднай сям'і і ўвайшлі ў новае сваяцтва.

Бацькаў брат — **дзядзька** — ажаніўся і яго жонка, хоць і цётка, як і маміна і татава сёстры, але сваяцтва тут не па крыві, а па шлюбе, а значыць, ёсць і розніца. Гэта **дзядзіна**. І даўнейшая прыказка адзначала гэтую розніцу: «Дзядзіна — крадзена, а дзядзька — свой». «Крадзеная» напамінала пра старажытны звычай умыкання...

І тут выступала і па-новаму значыла слова **стрэча** ў адметных выразах. У першай **стрэчы** — гэта двароднасці (**брат**, **сястра**, **цётка**, **дзядзька**). Таму, скажам, двароднага брат ці сястра яшчэ называюцца **стрэчныя**. Даўней яшчэ вылучаліся **стрыечныя** (стрый — гэта бацькаў брат). Але сёння **двайныя**, **стрыечны**, **стрэчны** (у значэнні сваяцтва) — словы-сінонімы.

У **другой стрэчы — траюрадны** (брат, сястра, цётка, дзядзька). Ёсць выраз і ў **трэцяй стрэчы** — пра далёкае сваяцтва. Але тут ужо можна ўжыць і такое вызначэнне: дзясятая (сёмая) вада на кісялі...

Засталося ўспомніць **швагерку** і **швагра** (абодва словы з выбухным гукам г).

Швагерка — жончына сястра, а швагер — брат жонкі або сястры ці швагеркі.

Усе добра ведаюць **свата** і **сваццю** ў значэнні асобаў, якія сватаюць жаніху нявесту ці нявесце жаніха. Але сваты і сваці — гэта сваяцкія повязі бацькоў мужа і жонкі паміж сабою. Сват — гэта бацька мужа ў адносінах да жончыных ці бацька жонкі ў адносінах да мужавых бацькоў. Гэтак жа як **свацця** — маці мужа ў адносінах да жончыных ці маці жонкі ў адносінах да мужавых бацькоў.

Напярэдадні Новага года — шчадрэц, даўні звычай адзначаць перадНавагодні вечар, калі спяваюць шчадроўкі; моладзь ладзіць розныя гульні, напрыклад, жартоўна выбірае маладога і маладую і гуляюць «Вяселле Цярэшкі»; хлопцы і дзяўчаты варожаць, цатаюцца ў арэхі (узяўшы ў жменю некалькі лузанцоў, пытаюцца: «Цот ці лішка?» і калі ты ўгадаў, атрымліваеш гэтую жменю); загадваюць і адгадваюць загадкі.

З гэтай нагоды і я тут прапаную жменьку сваіх загадак — арэшкаў-лузанцоў.

*Як яны нарадзіліся,*
*дзед і баба з'явіліся.*

(Унукі).

*Усім вядома:*
*мажліваю госцяй*
*жыве яна дома.*

(Дзяўчына на выданні).

А цяпер такая загадка:

*Адзін бацька, адна маці*
*і ў яго, і ў мяне.*
*Ён мне брат,*
*а я яму — не.*

(Сястра).

Вось яшчэ:

*Будзьце ласкавы,*
*у гэтакай радзе:*
*у майго дзядзькі ёсць брат,*
*які мне не дзядзя.*

(Мой тата).

І нарэшце:

*Загадаць загадку я рад:*
*Сын майго бацькі,*
*а мне не брат.*

(Гэта я сам).

У даўніну, калі прыязджалі да дзяўчыны ў сваты, загадвалі ёй загадкі. Калі адгадвала, цудоўна! Бралі замуж.

Дык маладыя чытачы і чытачкі «Звязды»! Моцнага вам кахання і шчаслівага шлюбу ў Новым годзе!

А ўвогуле ўсе спадарыні і спадары і ўсе вашы родзічы-сваякі!

З Новым годам!

З новым шчасцем!

**Анатоль КЛЫШКА.**

## Бюджэт... «гасцявога шлюбу»

# ДА СЯМ'І, ЯК У ГОСЦІ?

Сусветны фінансавы крызіс трохі закрануў і нашу сям'ю, якая жыве паводле прынцыпу так званага «гасцявога шлюбу». І чым у такім выпадку ён адрозніваецца ад распаўсюджанага — агульнага сямейнага бюджэту? Напрыклад, у апошнія дні часцей, чым раней, чую: «Тата, давай грошы» (так любіць звяртацца да мяне мацi нашых двaіх маленькіх дзяцей). Маўляў, цэны растуць (праўда, чуў я гэта і да пачатку крызісу), а ты не ведаеш, колькі каштуе кілаграм мяса. Пры гэтым даеш нам на жыццё вось ужо даўно адну і тую ж суму... Каханая памыляецца. І акрамя «абавязковага мінімуму» штомесяц — часта некалькі разоў на тыдзень атрымлівае «дадатковыя сродкі»: на цацкі дзецям, памаду для сабе, на фарбу для валасоў... Яшчэ — пойдзеш да нас, купі ў краме смятану, бананы дзецям, пельмені і... А тут пачалі дзеці хварэць... І хто, дарэчы, такія цэны прыдумвае на лекі? Безумоўна, сума выходзіць «кругленькая», некаторыя зарплату такую не атрымліваюць. А «дэкрэтныя»? Памперсы колькі каштуюць і колькі іх трэба малому дзіцяці — ведаеце? А яшчэ на адзенне неабходныя грошы і інш. У гэтым сэнсе я цалкам на Яе баку.

Наогул, чым з Ёй спрачацца наконт таго, што ў выніку мне застаецца мізэр грошай, лепш і не думаць пра гэта, а лішні артыкул напісаць. Зразумела, пераважная большасць грошай з ганарару пойдзе ў «гасцявы фонд». Надрукуйце артыкул, калі ласка! Не для сябе прашу. Дапамажыце фінансава дзецям!

Напэўна, нейкія вельмі эмацыйныя чытачкі скажуць потым: «Вось скардзіцца на ўсю краіну, яшчэ нечым незадаволены?». Задаволены. Праўда. Ужо гадоў пяць, калі лічыць, што гісторыя канкрэтнага «гасцявога шлюбу» пачыналася з цяжарнасці...

Калі падлічыць, колькі, бывае, застаецца грошай тату, ну — чвэрць ад усей зарплаты, меней — болей. Як жа жыць на гэтыя грошы? Падкормлівае маці — пенсіянерка, з якой жыву і фактычна «працую» ў карпункце. І з працай мне пашанцавала — сядзі сабе дома і пішы. Гэта так многія думаюць.

Каб неяк папоўніць фактычна два сямейныя бюджэты, хочацца знайсці падпрацоўку. Ды начальства такое трапілася, даводзіцца гэта рабіць «паводле партызанскага прынцыпу». Напэўна, іх асабісты дэвіз — каб ты жыў на адну зарплату? А жонка наадварот: «А чаму ты болей нікуды не пішаш?». І каго я больш кахаю? Зразумела, начальства!? І «дзеці нашы сумесныя» — нумары газеты!

Такіх жа «гасцявых бацькоў», як я, напэўна, нямнога. Гэта пакуль, пра што трохі ніжэй. Дарэчы, адна дзяўчына — музейны работнік, памятаецца, назвала пры нашай сустрэчы такі від сямейных стасункаў амаральным. І чаму так? Лепш жыць разам, каб праз некалькі гадоў плаціць аліменты, што робяць некаторыя мае таварышы? А чым «прыгажэйшы» так званы грамадзянскі шлюб? Вось часта чытаю міліцэйскія зводкі: сужыцель пабіў пасля сумеснага застолля...

Прагноз навукоўцаў адназначны — менавіта «гасцявы шлюб» гадоў праз 15 — 20 можа стаць звычайнай формай існавання сям'і. Вядома, шкада. Але ж былі ў гісторыі і «групавыя шлюбы», і матрыярхат. І напэўна, «сацыёлагі» старажытнасці таксама перыядычна «білі трывогу»? І іх за гэта.

У нас, напэўна, гасцявыя шлюбы патроху «сталі моднымі» ў выніку чарговай сэксуальнай рэвалюцыі, што пачалася ў гады савецкай «перабудовы». Ёсць меркаванне — «гасцявыя шлюбы» ўзнікаюць з-за таго, што Ён і Яна баяцца сумеснай адказнасці за быт. Вядома ж, што менавіта быт часта і вораг кахання. А тут кожная сустрэча як свята, і тыя ж бытавыя пытанні можна вырашаць незалежна ад формы шлюбу. Ці не так?

Толькі не верце тым, хто можа сказаць: жанчына і ў гасцявым шлюбе міжволі марыць аб «класічным». Калі дваіх усё задавальняе — чым гэта дрэнна? Безумоўна, на выхаванні дзяцей такая форма «бацькоўства» не можа дрэнна не адбівацца. Прыйшоў бацька на выхадныя, зазірнуў у рабочы дзень на некалькі гадзін. Дрэнна, скажуць крытыкі? А калі тата — вадзіцель далёкіх рэйсаў альбо мо палярнік?

Што датычыцца рэўнасці, то калі захочаш, і са штампам у пашпарце «пойдзеш налева». Праўда, зрабіць гэта значна цяжэй. Але «затрымаўся на працы», «паехаў у камандзіроўку» — ну, мужчыны ведаюць, што прыдумаць.

Ніякім чынам не хочацца, каб чытачы зрабілі выснову — вось рэкламуе «гасцявы шлюб»! Ды не! Мы ўсе такія розныя. І прынцыпы, лад жыцця таксама. Я недзе чытаў, што «гасцявыя шлюбы» прыдумалі мужчыны, але яны ўсё болей падабаюцца жанчынам, бо і гатаваць яму штодня не трэба, мыць, ды і не будзе патрабаваць вярнуцца ад сяброўкі да пачатку вячэрніх тэленавінаў.

Калі ўжо ў мужчыны альбо жанчыны... некалькі гасцявых шлюбаў (асабіста не ведаю такіх прыкладаў, хоць па расійскім тэлебачанні паказвалі). Але ж існуюць і гарэмы! Цікава — а як на іх існаванні адбіваецца фінансавы крызіс? Гатовы хоць сёння паехаць у камандзіроўку, напрыклад, у Эміраты, каб вывучыць тэму і расказаць вам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Лірыку паэта Дранько-Майсюка ў яго радні дапаўняе фізіка

Фота Анатоля КЛЕЦКАГА

**ТРАЮРАДНЫ БРАТ Леаніда Іван Яфімавіч Бразоўскі, які жыве ў Давыд-Гарадку, распавядае:**

— У нас сямейная традыцыя быць настаўнікамі, я настаўнік па жыцці, супрацоўнік сацыяльнай сферы. А мае дзеці абодва пайшлі ў жонку, якая працуе настаўніцай у школе. Усе настаўнікі ў нашай сям'і выкладаюць дакладныя навукі — матэматыку, фізіку, інфарматыку. У кожнага сваё накананне ў жыцці. А ў Леаніда сапраўды дар Божы. Словы складаюцца ў вершы нібыта самі сабою. У мяне так не атрымаецца, як у яго. Кожны раз, калі ён прыязджае да нас, дорыць зборнічак з адмысловым прысвячэннем — абавязкова нешта прыдумае арыгінальнае. Мы заўжды яго чакаем у госці на Каляды ці на Стары Новы год, разам адзначаем Конікі — так называюць Шчодры вечар. Звычайна сустракаемся ў нашай хаце, пасядзім трохі, сябры падыдуць — паразмаўляем. Пасля ідзём да ёлкі, там пагуляем, трошкі змерзнем — вяртаемся... Песні любім, «Польку беларускую», напрыклад, вершы. А як грамаў 150 за каўнерам, дык я люблю вершы не толькі Дранько, і не толькі Майсюка...

Але наш Лёня — не толькі паэтычная зорка, ён чалавечая зорка. Ён вельмі добры чалавек, сумленны. І не толькі ён, а яго жонка Вольга таксама. Калі Лёня некаму нешта паабяцае, дык ён жа не жывы, калі не выканае. Калі яшчэ вучыўся ў Маскве і яго жонка там жыла, то просіць яе: «Вольга, паглядзі майму дзядзьку Мікалаю Паўлавічу такую-та рэч...» А потым едуць з Масквы, дык абавязкова вязуць. Вось такія людзі — адказныя, шчырыя. Ды ўсяго ж не скажаш... Як нашу сям'ю закранула бяда, трэба было сына лячыць, дык я паехаў у Мінск — нікога не ведаў. Тады знайшоў Лёню, яны мне ўсё дапамаглі. Ён заўсёды перажывае, каб усё адбылося як мае быць. У складаных сітуацыях больш пазнаеш людзей, чым калі-небудзь яшчэ. Калі чалавеку дрэнна і яму прыходзяць на дапамогу, то гэта яднае і родніць яшчэ больш. Я ўдзячны яму. І зараз імкнуся дапамагаць яму, чым магу: у Давыд-Гарадку жывуць бацькі. Мы наведваем — а Лёня тут жа тэлефануе ім, не заўсёды ж можна хутка даехаць.

**ЖОНКА Івана Яфімавіча Таццяна Васільеўна дадае:**

— Лёня — гэта прыклад таго, як трэба любіць сваю родную зямлю, малую радзіму. Ён заўсёды кажа: «У Мінску жыву даўжэй, але я нарадзіўся ў Давыд-Гарадку, кожны куточак тут мне нагадвае маё дзяцінства». Напэўна, такія адносіны да радзімы нарадзілі ў ім паэта.

**З днём народзінаў, з юбілеем,** шчыра віншуем шаноўную **Валянціну Цімафееўну МАЗЖАРАВУ**! Зычым моцнага здароўя, дабрабыту, радасці! Хай заўжды побач з Вамі будуць блізкія людзі, хай ладзяцца справы, хай шчасціць… І ў тых гадах, што наперадзе!

**З павагай і любоўю — Звяздоўцы.**

## Генутэ БАЛЬСЯВІЧЭНЕ, ЦЁТКА і КУМА Жанэт:

# «Будучую спявачку змог супакоіць толькі Вівальдзі»

**Генутэ БАЛЬСЯВІЧЭНЕ з'яўляецца не толькі ЦЁТКАЙ вядомай беларускай спявачкі ЖАНЭТ, але і КУМОЙ. Яна жыве ў Літве і цяпер, на жаль, рэдка сустракаецца са сваёй пляменніцай і духоўнай сваячкай, але з задавальненнем пра яе расказвае:**

— Наша сям'я інтэрнацыянальная: тата рускі, а мама — літоўка. Таму калі выбіралі імёны для сваіх 9 дзяцей, пяцярых назвалі рускімі імёнамі, а чацвярых — літоўскімі. Я атрымала літоўскае імя, а мая сястра, маці Жанэт, рускае. Валянціна са сваёй сям'ёй спачатку жыла ў Літве, потым пераехала ў Германію. Але сувязь з намі не перарывала. Калі яны жылі ў Германіі, амаль кожны тыдзень дасылалі вялізныя лісты, тэлефанавалі, а як пераехалі ў Мінск — часта прыязджалі ў госці.

Жанэт нарадзілася ў Літве. На момант з'яўлення дзяўчынкі на свет яе старэйшаму брату Жану было ўсяго 1,5 года. Я ў той час вучылася ў 11 класе і кожны вечар, пасля таго, як рабіла ўрокі, ішла дапамагаць маёй сястры ўкладваць спаць дачку, а раніцай ад яе — зноў у школу. Не ведаю, чаму, але малая капрызіла з 11 вечара да 2 гадзін ночы. Сястра займалася старэйшым сынам, а я дапамагала ёй спраўляцца з Жанэт.

Аднойчы мы заўважылі, што калі дзяўчынка чуе песні Ірыны Алегравай ці Алы Пугачовай, адразу перастае плакаць. Потым мы паспрабавалі паставіць ёй Вівальдзі, і што вы думаеце? Яна зусім перастала капрызіць, і мы змаглі заняцца іншымі справамі на той час, пакуль малая слухала музыку.

Потым Жанэт вырасла, я выйшла замуж, і яна стала хроснай маці маіх дзвюх дачок: Грэты і Герды. Яна ведае, што нясе за іх вялікую адказнасць перад Богам і, хоць жыве зараз не з намі, у курсе ўсіх спраў дзяўчынак. Старэйшая, ёй зараз 8 гадоў, кожную чвэрць дасылае Жанэт справаздачу: якія адзнакі яна атрымала, як увогуле ў яе з вучобай. Мая малодшая пяцігадовая дачка таксама піша ёй пра свае поспехі, няўдачы ці крыўды. Жанэт стараецца, дзе б яна ні была, з кожнай паездкі абавязкова прывозіць сваім хрэсніцам падарункі. Пра тое, што дзяўчынкі вельмі любяць сваю хросную маму, і казаць няма чаго. Яны выказалі жаданне паступіць у музычную школу, танчаць, спяваюць, як іх любімая Жанэт.

На жаль, бачымся мы з сям'ёй Валянціны не так часта, як хацелася б. Але як толькі выпадае магчымасць прыехаць адно да аднаго ў госці, абавязкова гэта робім. У часы савецкай улады сястра з дзецьмі прыязджала ў Літву праз суботу. Як толькі суседзі бачылі, што на вяроўках для бялізны з'явілася стракатае дзіцячае адзенне, разумелі — прыехалі дарагія госці. Тады наш дом запаўняўся сваякамі, сябрамі і знаёмымі, а Жанэт для іх ладзіла канцэрты. За гэта ёй прыносілі цукеркі, зробленыя сваімі рукамі домікі з запалак, чалавечкаў з шышак, а дзяўчынка спявала.

Трэба сказаць, што ўсе дзеці Валянціны (акрамя дзвюх малодшых двайнятак, якія зараз вучацца ў 11 класе) атрымалі вышэйшую адукацыю, і цяпер кожны займаецца любімай справай. У Жанэт 4 браты і тры сястры. Іх мама з маленства старалася заўважыць тое, што яе дзеці робяць найлепш, і развівала гэты талент.

Тата Жанэт — ваенны. І калі яго ў чарговы раз паслалі служыць на Курылы, Валянціна з ім не паехала. «Як я магу? — казала яна. — Мае старэйшыя дзеці толькі пайшлі ў музычную школу. Трэба ўсё кінуць і ехаць туды, дзе акрамя халадоў няма нічога. Як я буду дзяцей выхоўваць?» Так яна засталася адна з чатырма маленькімі дзецьмі на руках дзеля таго, каб яны атрымалі добрую адукацыю і развіваліся.

У сям'і маёй сястры ўсталяваліся свае традыцыі святкавання Новага года. Ведаю, што абавязковымі сталі на святочным стале шакаладная каўбаса, манты, тарты і жэле. Прыгатаванне гэтых страў — цэлая цырымонія. Напрыклад, 29 снежня гатуецца шакаладная каўбаса. Палову дня 30-га снежня лепяцца манты, а другая палова і ноч прысвечаныя тартам. Валянціна сама іх выпякае: адзін вялікі і шэсць маленькіх, бо ў доме заўсёды шмат гасцей.

І падарункі, якія дораць адно аднаму родныя людзі, таксама незвычайныя. Кожны стараецца падараваць нешта асабліва, арыгінальнае, таму падарункі доўга прыдумляюцца і шукаюцца, прычым усё трымаецца ў найвялікшым сакрэце, каб гэта і сапраўды стала сюрпрызам.

Кал

Сацыяльнай абароне Беларусі — 90 гадоў

## Валянціна КАРАЛЁВА:

# «ЛЕТАСЬ КОЛЬКАСЦЬ АТРЫМАЛЬНІКАЎ АДРАСНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ЎЗРАСЛА Ў ЧАТЫРЫ З ПАЛОВАЙ РАЗЫ»

Пенсіянеры, інваліды, шматдзетныя і няпоўныя сем'і, людзі з нізкімі даходамі — не сакрэт, што значнай частцы насельніцтва нашай краіны неабходна дзяржаўная падтрымка. Тым часам варта заўважыць: менавіта ў пачатку студзеня сістэме сацыяльнай абароны Беларусі спаўняецца 90 гадоў. І з гэтай нагоды — наша гутарка з намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Вікенцьеўнай КАРАЛЁВАЙ.

Фота БЕЛТА.

***— З пачатку новага дзесяцігоддзя ў Беларусі была зроблена стаўка на набліжэнне сацыяльнай падтрымкі да месца жыхарства ўсіх тых, хто мае ў ёй патрэбу. Якія ж напрамкі тут найбольш запатрабаваныя сёння, якія паслугі падаюцца перспектыўнымі і ці не было б правільным вызначыць пэўныя стандарты сацыяльнай дапамогі, аднолькавыя для ўсіх рэгіёнаў краіны без выключэння?***

— Нагадаю, што стандарт у галіне сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (адзін тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання на адзін адміністрацыйны раён) быў уведзены да 1 лістапада 2004 года. У Беларусі працуюць 156 падобных устаноў, і ў тым ліку — 2 агульнагарадскія цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сем'яў і дзяцей у Мінску і Гомелі. Пры гэтым сапраўды: новы стандарт дазволіў аказваць разнастайную і якасную дапамогу грамадзянам і сем'ям, якія маюць у ёй патрэбу, зрабіць сацыяльную падтрымку адраснай, своечасовай і эфектыўнай.

Адным з галоўных напрамкаў застаецца сацыяльнае абслугоўванне дома. Цяпер сацыяльныя работнікі наведваюць больш за 80 тысяч чалавек, 70 працэнтаў якіх пражываюць у вёсках. Найбольшае развіццё гэты від падтрымкі пенсіянераў і інвалідаў атрымаў у Мінскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцях.

Аднак не сакрэт: па тых або іншых прычынах даглядаць чалавека дома магчыма не заўсёды. Таму на гэтыя выпадкі пры тэрытарыяльных цэнтрах прадугледжаныя аддзяленні кругласутачнага знаходжання пенсіянераў і інвалідаў. Сёння працуюць 45 падобных аддзяленняў на 1528 месцаў. І, варта заўважыць, што ў адрозненне ад звычайных дамоў-інтэрнатаў, аддзяленні кругласутачнага знаходжання зноў-такі максімальна набліжаныя да месца жыхарства.

Некалькі слоў аб рабоце з выпускнікамі цэнтраў карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі. Апошнім часам для выпускнікоў гэтых устаноў пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ствараюцца аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў з гурткамі, клубамі па інтарэсах, працоўнымі майстэрнямі. Да пачатку лістапада ў краіне налічвалася 89 такіх аддзяленняў. Да 2010 года, як плануецца, яны будуць працаваць ва ўсіх раёнах без выключэння, прычым на сёння гэту задачу ўжо выканалі сталіца і Мінская вобласць.

Нельга не заўважыць, што ў кожным раёне ёсць уласныя прыярытэтныя накірункі сацыяльнага абслугоўвання і паслуг. Але ў той жа час тут існуюць і адзіныя для ўсёй краіны стандарты — у прыватнасці, пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, нормы і нарматывы забеспячэння грамадзян такімі паслугамі. Такім чынам, вызначана пэўная мінімальная дзяржаўная «планка». А гарантыі звыш гэтай «планкі» асобныя рэгіёны могуць вызначаць самастойна — з улікам сваіх сацыяльна-дэмаграфічных асаблівасцяў і, зразумела, фінансавых магчымасцяў.

***— Вернемся да абслугоўвання дома. Калі магчымасць карыстацца дапамогай сацыяльных работнікаў з'явіцца ў жыхароў усіх, у тым ліку аддаленых і малакольскасных, населеных пунктаў?***

— На жаль, вырашэнне гэтай праблемы залежыць не толькі ад нашых службаў. Часцяком на першы план тут выходзяць пытанні дарог і пад'язных шляхоў да малых вёсак, рэгулярных транспартных зносінаў, у рэшце рэшт, нельга скідваць з рахунку сітуацыю з працоўнымі ресурсамі — у некаторых раёнах цяжка знайсці чалавека ў працаздольным узросце, які б мог выконваць абавязкі сацыяльнага работніка.

Разам з тым, каб забяспечыць даступнасць паслуг для жыхароў вёсак, пры тэрытарыяльных цэнтрах адчыняюцца сацыяльныя пункты. На пачатак кастрычніка 2008 года ў сельскай мясцовасці працавалі 41 аддзяленне і 379 сацыяльных пунктаў цэнтраў. Апроч таго, пры асобных цэнтрах ствараюцца гаспадарчыя брыгады для аказання аднаразовых платных сацыяльна-бытавых паслуг дома, брыгады сацыяльнага абслугоўвання на мабільнай аснове, існуе практыка забеспячэння сацыяльных работнікаў веласіпедамі. І ўсё гэта пакрысе дае вынік — колькасць вёсак, жыхары якіх не могуць карыстацца сацыяльнымі паслугамі дома, скарачаецца: толькі за мінулы год сацыяльныя работнікі «прыйшлі» яшчэ ў 406 аддаленых пунктаў.

***— Тэма, якая заўсёды на слыху, — пенсіі. Як яны будуць павышацца? І ці не ўзнікне сёлета, у сувязі з пагаршэннем сітуацыі на фінансавых рынках, праблем з выплатамі пенсіянерам?***

— Як вядома, у Беларусі вызначана шчыльная прывязка памераў пенсій і заробкаў. Таму сёлета, як і раней, тэмпы росту пенсій будуць адпавядаць тэмпам росту зарплаты. Прычым заўважу, што менавіта цяперашні падыход дазваляе на працягу пэўнага часу фарміраваць рэзерв сродкаў на фінансаванне дадатковых расходаў для кожнага чарговага павышэння пенсій. Інакш кажучы, забяспечваецца баланс даходаў і расходаў пенсійнай сістэмы, што дае падставы казаць аб стабільнасці выплат пенсіянерам.

***— Прайшоў год з таго часу, як у краіне запрацавала новая мадэль адраснай сацыяльнай дапамогі. Наколькі яна сябе апраўдала і ці справіліся з ростам колькасці зваротаў сацыяльныя службы?***

— Адначасова з упарадкаваннем ільгот дзяржава перайшла да аказання сацыяльнай дапамогі сем'ям і грамадзянам, якім яна сапраўды неабходная, на аснове прызнанага ва ўсім свеце прынцыпу адраснасці. Прычым у саміх правілах прызначэння адраснай сацыяльнай дапамогі адбыліся змяненні. Так, «планка даходаў» для штомесячнай падтрымкі павысілася з 60 да 100 працэнтаў, а аднаразовай падтрымкі — з 60 да 120 працэнтаў бюджэту пражыткоўма мінімуму. Але ў той жа час, каб прадухіліць рост утрыманскіх настрояў, былі вызначаны ўмовы, пры якіх дапамога не прызначаецца — адмаўляецца асобам, якія не прыкладаюць намаганняў для паляпшэння ўласнага дабрабыту, грамадзянам, якія маюць ва ўласнасці больш чым адзін дом або кватэру, асобам, што выязджаюць за свой кошт падарожнічаць за мяжу, і гэтак далей. Плюс да таго, яшчэ адным «фільтрам» стала абмежаванне перыяду атрымання дапамогі — не больш чым 6 месяцаў на год. Праўда, у дачыненні да грамадзян і сем'яў, якія доўгі час не могуць выйсці са складанага матэрыяльнага становішча па аб'ектыўных прычынах, ёсць магчымасць рабіць выключэнне і аказваць дапамогу тэрмінам да аднаго года. Рашэнне аб гэтым можа прымацца непасрэдна ў рэгіёне. І гэта — таксама пацвярджэнне адраснасці.

Даводзіцца канстатаваць: адраснай сацыяльнай дапамогай ў новым варыянце стала запатрабаванай, колькасць яе атрымальнікаў павялічылася ў чатыры з паловай разы. Калі за ўвесь 2007 год яна была прызначана 59,2 тыс., то за 11 месяцаў летась — ужо 275 тыс. грамадзян Беларусі. Узраслі самі памеры выплат, сёння сярэдні памер штомесячнай падтрымкі на аднаго чалавека складае 57 тыс. рублёў (26 долараў), а сярэдні памер падтрымкі аднаразовай перавысіў аднаку ў 315 тысяч (146 долараў). Але ці не галоўнае. Удзельная вага атрымальнікаў адраснай дапамогі ў агульнай колькасці малазабяспечанага насельніцтва павялічылася з 8,4 працэнта ў 2007 годзе да 30 працэнтаў летась.

Зразумела, што змяненне «правілаў гульні» і рост колькасці зваротаў наклалі свой адбітак на работу сацыяльных службаў. Давялося праводзіць больш актыўную тлумачальную кампанію сярод грамадзян, нашмат часцей абследаваць матэрыяльна-бытавыя ўмовы прэтэндэнтаў на падтрымку, вырашаць пытанні з транспартам, наладжваць навучанне спецыялістаў, якія займаюцца прызначэннем адраснай сацыяльнай дапамогі, у рэшце рэшт, спатрэбілася змяненне графікаў прыёмаў ва ўпраўленнях па працы, занятасці і сацыяльнай абароне: цяпер можна падаць заявы да 19-20 гадзін па рабочых днях і да 13-15 гадзін — па суботах. Тым не менш з новымі задачамі ўдалося справіцца. Прынамсі, «праблема чэргаў» не ўзнікла. А самі рашэнні наконт аказання або не аказання адраснай дапамогі прымаліся хутка і да таго ж — у строгай адпаведнасці з заканадаўствам.

***— Тым часам вядома: заробкі ў сацыяльным абслугоўванні застаюцца аднымі з найбольш нізкіх. А ў сваю чаргу гэта — пытанне прэстыжу. Наколькі актуальнай з'яўляецца сёння праблема «кадравага дэфіцыту»?***

— Невялікія заробкі тых жа сацыяльных работнікаў тлумачацца тым, што яны маюць невысокія 6-8 тарыфныя разрады. Прычым самі разрады вызначаюцца выходзячы з патрабаванняў да ўзроўню адукацыі, кваліфікацыі і спецыфікі дзейнасці — такім чынам, у нечым цяперашняя сітуацыя з'яўляецца аб'ектыўнай. Што ж да перспектыў, то перш-наперш яны будуць залежаць ад змянення «бюджэтнай» тарыфнай стаўкі I разраду. Разам з тым, заўважу: гэты «рэзерв» — не адзіны. У прыватнасці, рашэнні аб дадатковым павышэнні зарплаты за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў могуць прымаць рэгіёны. А плюс да таго ёсць магчымасць накіроўваць на стымуляванне работнікаў тэрытарыяльных цэнтраў частку сродкаў, якія ўдаецца зарабіць на аказанні платных паслуг грамадзянам.

Безумоўна, праблема «кадравага дэфіцыту» ў галіне існуе. Аднак яе прычыны не толькі ў зарплаце. У сельскай мясцовасці значная частка насельніцтва ўжо мае пенсійны ўзрост, тады як моладзь імкнецца ў вялікія гарады. Адсюль, паўтаруся, і цяжкасці з пошукам спецыялістаў у працаздольным узросце або з патрэбнай кваліфікацыяй. Таму апошнім часам становіцца ўсё больш распаўсюджанай практыка так званага «суседскага абслугоўвання» — для абслугоўвання састарэлых і інвалідаў у вёсках прымаюцца на працу на ўмовах няпоўнага дня актыўныя людзі пенсійнага ўзросту.

Іншая і не менш простая сітуацыя назіраецца ў сталіцы і абласных цэнтрах. Тут маладыя спецыялісты, што атрымалі «свабодныя дыпломы» па спецыяльнасцях педагогіка, псіхалогія, сацыяльная педагогіка і сацыяльная работа, працаваць у нашы цэнтры ідуць. Але, пасля атрымання неабходнага вопыту працы, часта пераходзяць на больш «грашавітыя» месцы. Застаюцца толькі тыя, хто знайшоў сябе ў нашай сістэме, хто зразумеў, што аказваць дапамогу людзям — яго прызванне.

Аднак нельга не адзначыць: нягледзячы на цяжкасці, у нас няма выпадковых людзей. Кожнаму, хто ўладкоўваецца ў сістэму, вызначаецца выпрабавальны тэрмін ад 1 да 3 месяцаў. І на першае месца тут выходзяць такія якасці, як сумленнасць, працавітасць і спагада да чалавека — паводле ўсіх этычных канонаў, супрацоўнік сацыяльнай службы павінен умець разумець і паважаць індывідуальнасць свайго кліента, адчуваць за яго адказнасць, дапамагаць у самарэалізацыі, захоўваць прынцып роўнасці. Дарэчы, карыстаючыся нагодай, хачу шчыра павіншаваць тых, хто аказвае паслугі пенсіянерам і інвалідам, дапамагае няпоўным і шматдзетным сем'ям, прызначе пенсіі, працуе ў дамах-інтэрнатах, усіх работнікаў сістэмы сацыяльнай абароны з прафесійным святам. А таксама пажадаць ім цярпення, вытрымкі і здароўя — словам, таго, без чаго немагчыма рабіць добрыя справы штодня.

**Сяргей ГРЫБ.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**1. Застройщик (заказчик)** – Общество с ограниченной ответственностью «Метадос» (далее ООО «Метадос»). Режим работы: понедельник–пятница 9.00–17.30, перерыв на обед 13.00–13.30, выходные – суббота, воскресенье.

**2. Адрес:** 220004, г. Минск, ул. Короля, 51, 4-ый этаж, оф. 33, телефон 226 57 08, факс 200 04 52.

**3.** ООО «Метадос» зарегистрировано Решением Минского городского исполнительного комитета от 20.08.2002 г. № 1247 в Едином государственном реестре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101102388.

**4. Виды деятельности ООО «Метадос»:** строительство, сдача внаем собственного недвижимого имущества.

**5.** Выполняя функции Заказчика, в течение последних трех лет ООО «Метадос» построен и введен в эксплуатацию 102-квартирный жилой дом № 26 по ул. Каховской в г. Минске.

**6. Цель проекта** – строительство объекта «10-секционный 285-квартирный жилой дом № 2 (по генплану) с гаражом-стоянкой на 152 машино-места в квартале улиц Червякова – Каховская – Урожайная – Осипенко».

**7. Место расположения объекта:** Центральный район г. Минска, квартал улиц Червякова – Каховская – Урожайная – Осипенко.

**8. Земельные участки** предоставлены ООО «Метадос» для строительства и обслуживания объекта в постоянное и временное пользование согласно решению Мингорисполкома № 720 от 20.04.2006 г. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка площадью 0,6176 га № 500/306-1193 от 21.06.2006 г. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка площадью 0,0479 га № 500/306-1194 от 21.06.2006 г. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка площадью 0,4426 га № 500/306-1195 от 21.06.2006 г.

**9. Подрядная организация:** ООО «Метадос», специальное разрешение (лицензия) на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведение инженерных изысканий для этих целей» от 18.02.2008 г. № 02250/1037277, выданное(ая) Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь, сроком действия до 18.02.2013 г.

Часть работ будет выполняться по договорам подряда со специализированными организациями.

**10.** Строительство будет осуществляться за счет собственных и привлеченных средств.

**11. Сроки строительства:**
- начало строительства – I кв. 2008 г.,
- окончание строительства – II кв. 2010 г.

**12. Проектная документация:** государственная вневедомственная экспертиза от 30.11.2007 г. № 2662-5/07, государственная экологическая экспертиза от 07.09.2007 г. № 264.

**13.** Получено разрешение Госстройнадзора № 2-209Ж-008/07 от 26.03.2008 г.

**14. Проектом предусматривается:**
- монолитный каркас дома;
- стены дома – кирпич керамический утолщенный с фасадным утеплением, с использованием легкой штукатурной системы;
- кровля дома – металлические конструкции с покрытием из мягкой битумной черепицы KATEPAL;
- на дворовой территории – гостевая парковка автомобилей, игровое оборудование для детей, пешеходные дорожки, озеленение.

**15. Основные технико-экономические показатели:**
- Этажность дома – 6,7,8,9.
- Количество секций – 5.
- Количество квартир – 285 шт.
- Площадь застройки – 3812,7 м².
- Общая площадь жилого здания – 30795,0 м².
- Общая площадь квартир – 28159,18 м².
- Строительный объем – 113307,3 м³.
- Общая площадь гаража – 5388,2 м².
- Полезная площадь гаража – 5125,4 м².

**16.** В состав общего имущества по объекту входят: лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технический этаж и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

**17.** Заключение договоров долевого строительства будет проводиться по неизменной на период действия договора цене объекта долевого строительства.

**18. К долевому строительству предлагаются:**
1-комнатная квартира – общей площадью 51,13 м²,
2-комнатная квартира – общей площадью 81,2 м²,
3-комнатная квартира – общей площадью 110,1 м²,
4-комнатная квартира – общей площадью 147,18 м².

**Стоимость 1 (одного) м²** – 6 625 000 руб.

**19. Физическим лицам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, для долевого строительства предлагаются:**

3-комнатные квартиры – общей площадью 112,28 м² и общей площадью 113,58 м², 4-комнатная квартира – общей площадью 149,5 м².

**Стоимость 1 (одного) м²** для физических лиц, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий – 3 927 000 руб. Стоимость квадратного метра объекта долевого строительства будет пересчитываться к моменту ввода объекта в эксплуатацию.

**20.** Более подробные сведения об объекте долевого строительства можно получить по адресу: г. Минск, ул. Короля, 51, оф. 33 или по телефонам: 226 57 08, 226 58 26.

УНП 101102388


Гісторыя кахання

**Гэта здарылася ў Маскве праз 35 гадоў пасля вайны. На сустрэчы ветэранаў 5-й гвардзейскай танкавай арміі, як звычайна, было многа слёз, радасці, успамінаў. Марыя Пятроўна сядзела за столікам са сваімі аднапалчанамі. Ёй далі слова, яна выступіла. Як заўсёды, бліскуча, уражліва. Яна і не здагадвалася, што праз колькі столікаў насупраць за ёй уважліва сочыць пара вачэй. Ён пазнаў яе, але настолькі быў узрушаны, што не змог зрабіць кроку, сказаць слова. А яна нічога не заўважыла. Пасля адразу пабегла на таксі, спяшалася яшчэ ўбачыцца са сваякамі. Яна ж масквічка...**

# «Я шукаў вас усё жыццё»

Маша Ражнова нарадзілася ў Маскве ў інтэлігентнай сям'і. Яны жылі ў вялікім асобным доме. Прыяцель бацькі працаваў у крамлёўскай бальніцы ўрачом-гамеапатам. Дзяцей лячылі толькі травамі, і з маленства яны нічым не хварэлі. Самым яркім успамінам дзяцінства застаўся для яе той прасторны дом бацькоў, у якім панавалі спакой і згода. У 1941-м ёй споўнілася 17 гадоў. Калі пачалася вайна, дзяўчаты з класа ўсе як адна пайшлі працаваць на ваенны завод. «Праца была вельмі цяжкая, — успамінае Марыя Пятроўна. — Тады ж за спазненні судзілі. І мы баяліся спазніцца, начавалі прама на заводзе. Там пад інтэрнат быў адведзены куток са старымі матрацамі. І пасля змены мы падалі, звычайна, як снапы. Часам галодныя, бруднаватыя за тыдзень, мы ніколі не скардзіліся, ніколі не нараклі на лёс. Наадварот, калі выходзілі пасля працоўнага тыдня перад выхадным на вуліцу, вельмі ганарыліся, што ў новых зачахлёных гарматах ёсць наша праца. Такое тады было выхаванне. Мы ні кропелькі не крывілі душой, мы былі напоўненыя пачуццямі патрыятызму знутры. І рваліся на фронт, хоць, як цяпер кажуць, паняцця зялёнага не мелі, што такое вайна».

Разам з сяброўкамі Марыя скончыла курсы медсясцёр і, як толькі споўнілася васямнаццаць, пайшла на фронт. І з пятай танкавай арміяй прайшла ўсю вайну ад Масквы да Берліна. Што такое фронт, юныя маскоўскія школьніцы даведаліся ў першы дзень, як толькі іх прывезлі. Непадалёк ішоў бой, кругом раўло, выбухала, свісталі кулі, трашчаў кулямёт. Першае, што адчулі дзяўчаты, калі павыскоквалі з машыны, — страх і разгубленасць. Але назад дарогі не было. І на роздум, самааналіз таксама часу не прадугледжвалася. Бой азначаў наяўнасць параненых. Свайго першага параненага яна памятае да гэтай пары. Ён быў малады, прыгожы, ляжаў нерухома і амаль без дыхання. Ад шкадавання, ад страху, ад уласнай бездапаможнасці яна горка заплакала. Але падышоў хірург і сказаў: «Маша, не трэба плакаць, у цябе не хопіць слёз на ўсіх. Ім болей патрэбныя твае рукі». Памалу ўцягнулася ў сваю работу. Побач былі баявыя таварышы, такія, як доктар Антаніна Фёдараўна Дзямідава, з якой перапісваліся і сябравалі потым да самай яе смерці. Заўсёды адна адной дапамагалі, спачувалі. На фронце хутка станавіліся дарослымі.

І калі ў лесе пад Каўнасам яна засталася адна з цяжкапараненымі, то з поўнай адказнасцю прымала рашэнні сама. Справа ў тым, што палявы шпіталь тэрмінова перакідвалі ў іншае месца. Усіх параненых пагрузілі на машыны і павезлі, а тых, у каго адкрылася гангрэна, разам з іншымі перавозіць было нельга. Іх пакінулі да ранку ў палатцы з медсястрой. Не было нават вады, але, на шчасце, выпаў снег. Маша збірала яго ў кацялок, стрыгла нажніцамі ігліцу хвоі і гатавала вітамінны напой для хворых. Ноч падалася бясконцай. Асабліва цяжкім быў малады афіцэр. Ён ляжаў у гарачцы, увесь час трызніў. А потым выразна так стаў клікаць і прасіць: «Мама, падыдзі да мяне, мама!» Ён так жаласліва адчайна клікаў маці, што яна не вытрымала, падышла, узяла за руку. А ён стаў прасіць прабачэння ў маці за ўсе крыўды, за свае неразумныя ўчынкі, за тое, што не заўсёды слухаўся. І яна, гэта дзяўчынка, як умела, адпускала яго грахі, паўтарала: «Усё добра, сынок, я люблю цябе, сынок». Да раніцы ён памёр. А яна знайшла сярод яго рэчаў няскончаныя пісьмы да маці і да дзяўчыны, напісала пра апошні яго час адной і другой.

— Тады дзейнічала па нейкай інтуіцыі, — разважае Марыя Пятроўна. — А потым праз многа гадоў, калі сама стала маці, зразумела, што зрабіла правільна.

Яна ж была вопытным франтавым медработнікам, загартаваным у такіх складаных аперацыях, як Арлоўска-Курская дуга. Курская бітва, паводле слоў былой медсястры, самы цяжкі эпізод вайны. Спякота за 30 градусаў яшчэ больш узмацняла горыч і атруту дыму. Ім час ад часу прысылалі падмогу, і ўсё адно катастрафічна не хапала медперсаналу. Дапамагаць санітарам прыходзілі добраахвотнікі з мясцовага насельніцтва, але не заўсёды ім можна было даверыць. Машы ледзь не з кулакамі давялося кінуцца на адну жанчыну, але ж было ўжо позна... Папярэджвала ж, што параненым у жывот нельга ні ў якім разе даваць вады. Салдацік жа так жаласліва прасіў піць, плакаў, вось і напаіла пажылая вясковая кабета гаротніка на яго пагібель. Іх, параненых, было так многа, што Маша чапляла ім на грудзі біркі з нумарам чаргі, каб такім чынам падтрымліваць справядлівасць лёсу. Хірургі працавалі суткамі, але не паспявалі аперыраваць усіх. Не спала другія суткі і Маша. Адкінула прасціну з аднаго параненага, а ў яго ўсе бінты прамоклі на грудзях, пачала падбінтоўваць і адключылася. Упала і заснула на яго грудзях. Недзе праз хвіліну-другую ачомалася, падняць галавы не магла, а вось галасы чула. Яе клікалі іншыя раненыя, некаторыя выкідвалі нават брудныя жарты, а той, на каго яна міжволі ўпала, гаварыў вельмі ціха: «Пашкадуйце сястрычку, яна ж не спала колькі начэй».

Вось у такім пекле яна і сустрэла салдата, больш правільна сказаць, прыцягнула байца адтуль, дзе яго цяжка параніла. Ён страціў многа крыві, ляжаў белы, як мел. Доктар сказаў, што з такой стратай крыві аперацыю ён не вытрымае. Запасаў крыві не было, заставалася прамое пераліванне. Хірург спытаў тады ў яе: «Ну што, Маша, будзем рабаваць яго, у цябе не Краснаярска сабралася КБ у поўным складзе — 13 чалавек. Усе вельмі любілі Мікалая Разанцава, і кожны пастараўся расказаць пра свайго таварыша як мага лепей. Карацей, зрабілі прэзентацыю спецыяльна для нявесты, нешта накшталт таго, як на пікніку ў Гошы ў фільме «Масква слязам не верыць».

Вельмі хутка пасля вяселля ён зноў трапіў у бальніцу. Доктар тады сказаў ёй: «Навошта вы выходзілі замуж, ён не жылец ужо». Але яна сказала мужу, што разам яны адолеюць хваробы. І ён паверыў ёй. Вырашана было пераязджаць у Брэст. Здароўе яго было няважнае, але вельмі строгае захаванне дыеты, выкананне ўсіх прызначэнняў, старанне і цярплівасць рабілі сваю справу, чалавек упэўнена ішоў на папраўку.

— Гэтыя 22 гады, што пражыла з Мікалаем Іванавічам, — кажа Марыя Пятроўна Разанцава, — сталі самымі шчаслівымі гадамі майго жыцця. — Ён быў вельмі стрыманы, інтэлігентны, памяркоўны, сціплы чалавек і ўраўнаважваў маю прыродную актыўнасць, энергічнасць. Нам было вельмі добра разам. Мы гулялі па вуліцах горада і глядзелі на з'явы, на людзей, здавалася, аднымі вачыма. Як цудоўна было адкрываць адно ў адным аднадумцаў! Я вельмі любіла падарожнічаць, абышла Карпаты, Крым, Каўказ, пабывала ў многіх краінах. Для мяне новыя дарогі як жыццё. Ён з-за дрэннага здароўя не мог раздзяліць мае паходы-падарожжы, але з радасцю адпускаў мяне. Я прывозіла фотаздымкі, і мы перажывалі ўсе мае ўражанні ўжо ўдваіх, разам. Мы любілі хадзіць у госці і сустракаць гасцей. Я такая весялуха, аматарка спяваць, танцаваць. А ён глядзеў на мяне і радаваўся.

З Марыяй Пятроўнай перагортваем альбомы з мноствам фотаздымкаў, яна згадвае розныя сустрэчы, паездкі, гарады. Часта сустракаюцца здымкі, на якіх Мікалай Іванавіч з двума генераламі. Аказваецца, гэта яго лепшыя франтавыя сябры. А я пакутліва ўспамінаю і не магу ўспомніць прозвішча французскага рэжысёра, інтэрв'ю з якім чытала не вельмі даўно. Ён здымаў кіно пра каханне немаладых людзей і казаў, як аднойчы прыйшоў да высновы, што сапраўднае, не інстынктыўнае, не экспрэсіўнае каханне можа быць толькі ў людзей сталага веку, і прыводзіў свае аргументы. Маладыя, відаць, не паверацьстарому кіношніку, але невядома, што скажуць яны праз дзесяцігоддзі...

Мікалая Іванавіча не стала чатыры гады таму. Адзіны сын жыве ва Украіне. Марыі Пятроўне зараз ідзе 85-ы год. І яна да гэтай пары — цікавая жанчына з манікюрам і ненавязлівым макіяжам. Як толькі я зайшла ў кватэру, яна адразу пачала прасіць прабачэння, што крышку не ў форме, бо толькі што прыходзіла медсястра рабіць укол. Прыхапіла застарэлая неўралгія. Потым запрасіла зайсці, паказала сваё сціплае, але чыстае, з адценнем густу жыллё са словамі: «Вось, багацця за век не нажыла, але пражыла я багата».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**На здымках:** Марыя Пятроўна і Мікалай Іванавіч РАЗАНЦАВЫ падчас вайны і праз 50 гадоў пасля Перамогі.

Эксклюзіў

# 2009-ы: ГОД ПЕРАМЕНАЎ

## Астралагічны прагноз на 2009 год

**Паводле прагнозу астролага Уладзіміра ВАСЮКА, 2009 год стане годам рэвалюцыйных пераменаў і вельмі важных трансфармацый ва ўсіх галінах жыцця. Год абяцае быць складаным, аднак вельмі перспектыўным і прагрэсіўным. Яго нават можна назваць крыху чароўным — ён дасць кожнаму велізарныя шанцы для асабістага росту. Той, хто захоча дасягнуць поспеху і прыкладзе для гэтага максімум намаганняў, абавязкова свайго даможацца, а вось гультаі і трутні не атрымаюць нічога.**

**У Вогненых знакаў — Авена, Льва і Стральца — рэвалюцыйнасць года будзе звязана з кардынальнымі пераменамі ў складзе самых блізкіх знаёмых.**

Напрыклад, у **Авенаў** з'явіцца шмат новых знаёмых. Акрамя таго, надыходзячы год дасць ім шанц радыкальна памяняць свой імідж. Жанчын-Авенаў напрыканцы года старыя сябры могуць не пазнаць — настолькі радыкальна зменіцца іх знешнасць. Авенам зоркі раяць кантраляваць стан свайго здароўя, бо ігнараванне сігналаў арганізма можа выліцца ў абвастрэнне хранічных хваробаў, якія могуць правяцца ў самы нязручны момант.

**Львам** трэба быць асабліва ўважлівымі ў адносінах да людзей, з якімі яны найбольш кантактуюць. У 2009 годзе яны могуць разлічваць на дапамогу блізкіх і сяброў у вырашэнні самых складаных пытанняў. Захаванне добрых адносінаў з роднымі стане для Львоў страхоўкай ад праблемаў ва ўсіх галінах жыцця. Увогуле год спрыяе збліжэнню інтарэсаў і пунктаў погляду Львоў і іх найблізкіх сваякоў. У некаторых прадстаўнікоў гэтага знака ў наступным годзе цалкам могуць адбыцца важныя станоўчыя перамены ў вырашэнні жыллёвага пытання, іншыя могуць разлічваць на большую пяшчоту і клопат з боку каханага чалавека. Увогуле ў 2009 годзе Львоў будуць здзіўляць і радаваць людзі, якія побач. Прагрэс у кар'еры можа быць забяспечаны толькі пры наяўнасці добрых асабістых стасункаў з калегамі.

Для **Стральцоў** 2009 год стане годам паездак і вандровак. Вераголная змена месца жыхарства, рэгулярныя выезды за мяжу. Стральцы могуць разлічваць на дапамогу сяброў. У прадстаўнікоў гэтага знака магчымы прагрэс на працы — пры ўмове, што Стральцы не будуць палохацца адказнасці. Год спрыяе правядзенню сур'ёзных рэформаў у асабістым жыцці. Для многіх Стральцоў ён стане годам афармлення перспектыў на вельмі аддаленую будучыню (пачатак трывалых адносінаў, ствараннe сям'і).

**Ад зямных знакаў (Цяльца, Дзевы, Казярога) год будзе патрабаваць імгненнай рэакцыі на змену абставінаў і штодзённай працы дзеля здзяйснення сваіх планаў.**

**Цяльцам** варта пазбягаць буйных сварак са сваімі блізкімі. Вераголны прыток фінансаў, аднак не варта ўкладаць грошы ў фінансавыя авантуры і непрадуманыя мерапрыемствы. Магчымы перамены да лепшага ў асабістым жыцці — надышоў час, калі Цяльцы змогуць убачыць у рэальным святле тых, хто знаходзіцца побач і даўно імі захапляецца.

Для **Дзеваў** 2009-ы стане годам рэзкіх перамен: яны могуць усё згубіць, а могуць і шмат атрымаць, разбагацець (гэта датычыцца ўсіх галін жыцця). Дзевам трэба старацца сумленна выконваць свае абавязкі і разумець, што адкладзенае на заўтра для іх будзе страчана назаўсёды.

Вельмі добрыя перспектывы могуць адкрыцца перад **Казярогамі** (верагодныя прафесійны рост, паляпшэнне матэрыяльнага дабрабыту). Аднак ім варта пазбягаць перакосаў — не затрымлівацца да ночы на працы, каб і члены сям'і не заставаліся без увагі. Гармонія паміж сацыяльным і асабістым жыццём стане вызначальным фактарам поспеху для Казярогаў у 2009 годзе.

**Перад паветранымі знакамі адкрыюцца новыя перспектывы. Ім варта пастарацца выкарыстаць у новым годзе ўсе магчымасці, для чаго спатрэбяцца дысцыпліна, паслядоўнасць і ўменне завяршаць распачатыя справы.**

**Блізняты** ў 2009 годзе змогуць павысіць свой узровень адукацыі, прафесійнага майстэрства, патрабаваць павышэння. Іх ініцыятывы па кардынальным змяненні свайго жыцця і жыцця родных і блізкіх атрымаюць падтрымку навакольных (пры ўмове, што ўсе прапановы будуць загадзя добра прадуманы і спланаваны).

Для **Шаляў** год прынясе сур'ёзныя перамены ў свядомасці: састарэлыя прынцыпы адыдуць у мінулае, а іх месца займуць больш жыццяздзейныя і набліжаныя да рэчаіснасці. Многія сябры знікнуць з іх кола кантактавання, аднак адначасова з'явіцца і шмат новых. Псіхалагічныя змены Шаляў пацягнуць за сабой і кардынальныя перамены ў іх знешнасці. У другой палове года верагодны сур'ёзны прагрэс у кар'еры.

Для **Вадалеяў** 2009-ы стане годам рэвалюцыйных перамен. Іх будуць выключаць на першыя ролі, даваць ім добрыя магчымасці для дасягнення поспеху. Аднак адсутнасць канцэнтрацыі, няўменне даводзіць справу да лагічнага канца могуць абумовіць страту большасці спрыяльных для Вадалеяў магчымасцяў. 2009 год — адзін з лепшых перыядаў для наладжвання сур'ёзных адносінаў у асабістым жыцці, для пачатку вучобы, павышэння прафесійнага майстэрства. Прадстаўнікам гэтага знака трэба прыкласці ўсе намаганні і пастарацца за адзін год рэалізаваць тое, што яны запланавалі на найбліжэйшыя 5-10 гадоў.

**Для водных знакаў пачынаецца перыяд павольнага прагрэсу. Ім варта навучыцца бракаваць толькі за тыя справы, якія не перавышаюць іх рэальных магчымасцяў і здольнасцяў, уменню цвяроза ацэньваць справядлівасць сваіх прэтэнзій і дамаганняў.**

**Ракам** год абяцае спад напружання ў кар'еры і працы. Вызначальным фактарам поспеху будзе дакладная фармулёўка сваіх патрэбаў і прэтэнзій да жыцця, уменне вылучаць з усёй іх колькасці сапраўдныя свае жаданні і памкненні. У гэтым годзе можна істотна паправіць сваё здароўе, фізічнае самаадчуванне, пазбавіцца ад хранічных хваробаў, палепшыць адносіны са старэйшымі членамі сям'і. Не варта марнаваць грошы і ўкладаць іх у фінансавыя авантуры.

Для **Скарпіёнаў** год прынясе сур'ёзныя змены ў адносінах з блізкімі і роднымі. Скарпіёны адчуюць падтрымку сям'і і сяброў. Перыяд спрыяе рэалізацыі стратэгічных задач адносна сям'і, дома, блізкага

## СЕРАДА, 7 СТУДЗЕНЯ

**7.40** Добрай раніцы, Беларусь!
**8.45** Гатуем разам.
**8.50** Слова Мітрапаліта Філарэта на свята Нараджэння Хрыстова.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10** Існасць.
**9.35 Камедыя «Той самы Мюнхгаўзен».**
**12.10** Дабрачыннае навагоднее прадстаўленне для дзяцей на Галоўнай ёлцы краіны ў Палацы Рэспублікі з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі.
**13.30 Меладрама «Каханая жанчына механіка Гаўрылава».**
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** «З Новым годам, Беларусь!» Канцэртная праграма.
**17.30 Меладрама «Ураўненне з усімі вядомымі».**
**20.50** «Спартлато 5 з 36».
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Калас назаўсёды».**
**23.35** Дзённік V Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакею на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**7.00** «Наша раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30, 1.05** Нашы навіны.
**9.05 Камедыя «Зігзаг удачы».**
**10.40** «Навагодні жарт».
**11.15 Маст. фільм «Звычайны цуд».**
**13.45 Мюзікл «Батлейка».**
**16.10** Тэорыя неверагоднасці. «Цуды».
**16.45 Маст. фільм «Зімовы раман».**
**18.25** Канцэрт Дзмітрыя Хварастоўскага «Толькі для Вас...».
**20.50 Маст. фільм «Мачаха».**
**23.10 Муз фільм «Сарочынскі кірмаш».**
**1.10** Заканчэнне эфіру.

**7.35** Мір вашаму дому.
**7.45** «Лабірынты: Стыгматычка Ванда Банішэўская».
**8.10 Кінааповесць «Старэйшы сын».**
**9.25 Маст. фільм «Прынцэса цырка».**
**11.50 Меладрама «Кветкі для Снежнай каралевы».**
**13.40** Фільм-казка «Руслан і Людміла».
**14.55** Школа рамонту.
**15.45** Космаполітэн. Відэаверсія.
**18.10** Навіны культуры.
**18.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны.
**19.50** Усё пра бяспеку.
**20.20** Калыханка.
**20.35** Гіпноз.
**21.40** Бітва экстрасэнсаў.
**22.35** Танцы без правілаў.
**23.40 Меладрама «Анатомія Грэя».**

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20** «Закон і крымінал».
**6.25, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30** «Аўтапанарама».
**8.50 Камедыя «Суперцешча для няўдачніка».**
**10.30 Серыял «Жыццё працягваецца».**
**11.30, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».**
**12.20** Фільм-казка «Шасцёра вандруюць па свеце».
**13.50** «Асабісты інтэрэс».
**14.20 Маст. фільм «Безыменная зорка».**
**16.50** «Гарачы лёд».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.30 Камедыя «Перамотка».**
**23.00** «Відзьма-нявідзьма».
**23.45 Баявік «Рускі спецназ».**

**5.00, 11.00, 15.20, 0.30** «Вёска дурняў».
**5.30, 13.30** Мультфільм «Чырвоныя чаравічкі».
**6.30, 14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**7.00 Маст. фільм «Верны сябар Санча».**
**9.00, 19.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**10.00, 18.30 Серыял «Прыгоды мага».**
**11.30, 22.30 Нашы любімыя камедыі. Маст. фільм «Джэк Васьмёркін — амерыканец».**
**15.00, 18.00** Навіны Саюжнасці.
**15.55** «Білет на сёння».
**16.00, 1.00 Маст. фільм «Удачы Вам, спадары!».**
**20.30, 3.00 Маст. фільм «Каралева».**

**9.00** «К-відэа» для дзяцей.
**9.30** «Адшукваецца адпачынак».
**9.50 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**10.55, 21.15** «Астра-метэапрагноз».
**11.00 Маст. фільм «Па сямейных абставінах».**
**13.15** Мультфільм «Ноч перад Калядамі».
**14.00 Маст. фільм «Аб бедным гусары закінъце слова».**
**16.50** Мультпарад.
**17.30 Камедыя «Оптам танней».**
**19.10** «К-гульні».
**19.15** «Хіт-парад тэлечата».
**19.45 Маст. фільм «Знахар».**
**20.55** «Вечарніца».
**21.20 Камедыя «Лепш не бывае».**
**23.40** Метэапрагноз.

**7.00 Серыял «З новым шчасцем!-2. Пацалунак на марозе».**
**10.00** «Пакой смеху».
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.20** «За кулісамі «Крывога люстэрка». Дак. фільм.
**12.20** «Дыскатэка 80-х».
**14.20** Гарадок. Дайджэст.
**14.50** «Крывое люстэрка».
**16.30** «Лепшыя песні». Святочны канцэрт з Дзяржаўнага Крамлёўскага палаца.
**18.50** Навіны—Беларусь.
**19.30 Камедыя «Навагодняя засада».**
**21.15 Камедыя «Страляй неадкладна!».**
**23.00 Камедыя «Ключ ад спальні».**

**7.00 Серыял «З новым шчасцем!-2. Пацалунак на марозе».**
**10.00, 17.25, 0.45 Серыял «Родныя людзі».**
**10.45, 18.15, 1.30 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**11.25, 20.20, 3.45 Серыял «Пастка».**
**13.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.15, 5.20 Серыял «І падае снег...».**
**14.45** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**15.15** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2009».
**19.35, 2.15 Серыял «Кармеліта».**
**21.55** «Тайна зніклай іконы. Казанская».
**22.40 Маст. фільм «Так не бывае».**
**0.15** «Тэатральны летапіс». Ала Пакроўская.

**6.30, 19.30 Серыял «Павуціна».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.15** Мультфільм.
**9.00** «Жывая легенда. Райманд Паўлс».
**10.25, 21.25 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25 Серыял «Залатое цяля».**
**15.05** «Асаблівасці нацыянальнага дайвінга». Фільм Барыса Кальцова.
**15.30** «Цуда-людзі».
**16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**17.05 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**23.20** «Ты смешны!».
**0.00 Серыял «Медыум».**

**7.15 Маст. фільм «Гардэмарыны-III».**
**9.05, 5.25 Маст. фільм «Багатая нявеста».**
**10.30, 13.30, 20.00, 0.55** Падзеі.
**10.45** «У каханні страху няма». Дак. фільм.
**11.35** Фільм-казка «Варвара-краса, доўгая каса».
**12.55** «Смех з дастаўкай на дом».
**13.40** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**13.45** «Рамансіяда»-2008. Гала-канцэрт.
**15.00** Вялікая калядная вячэрня ў храме Хрыста Збавіцеля.
**16.30** Мультпарад.
**17.05 Камедыя «Утаймавальніца тыграў».**
**18.40** «Как прекрасен этот мир!». Дзіцячыя песні для дарослых.

**9.30, 11.45, 20.15, 0.00, 1.45** Экстрэмальны спорт.
**10.00** Ралі рэйд. Дакар.
**10.45** Футзала. Кубак Рэйнланд.
**12.30, 17.00** Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
**13.30** Тэніс. Турнір АТР.
**18.15** Біятлон. Кубак свету.
**20.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.30, 22.45, 23.55** Выбранае па серадах.
**20.40** Конны спорт. Кубак свету.
**23.15** Гольф-клуб.
**23.20** Парусны спорт.
**0.45** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**1.15** Вось гэта дзіва!!!

**20.15, 2.45 Маст. фільм «Мая мама — Снягурка».**
**21.40, 4.40 Серыял «Дзяўчынкі».**
**22.25 Маст. фільм «Дзіўныя Каляды».**
**0.00** «Новыя песні ў Новым годзе».
**1.10 Маст. фільм «Утаймавальніца тыграў».**
**4.10** «Pop Corn-TV».
**6.50** «Руская тройка». Спецыяльны рэпартаж.
**7.05** «Энцыклапедыя». Генрых Гейне.

**9.30, 11.45, 20.15, 0.00, 1.45** Экстрэмальны спорт.
**10.00** Ралі рэйд. Дакар.
**10.45** Футзала. Кубак Рэйнланд.
**12.30, 17.00** Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
**13.30** Тэніс. Турнір АТР.
**18.15** Біятлон. Кубак свету.
**20.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.30, 22.45, 23.55** Выбранае па серадах.
**20.40** Конны спорт. Кубак свету.
**23.15** Гольф-клуб.
**23.20** Парусны спорт.
**0.45** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**1.15** Вось гэта дзіва!!!

### 19.55 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ЗІМОВЫ ВЕЧАР У ГАГРАХ» (СССР, 1985 г.)**

Яшчэ якіх-небудзь сорак—пяцьдзесят гадоў таму майстры чачоткі былі кумірамі публікі. Быў кумірам Аляксей Іванавіч Бяглоў. Цяпер жа ён сціплы настаўнік танцаў у эстрадным калектыве. І раптам усё мяняецца: да старога артыста быццам бы вяртаецца маладосць. Так падзейнічала на яго сустрэча з крыху дзіўнаватым маладым чалавекам, які прыйшоў са зламанай нагой і папрасіў, каб яго, ні многа ні мала, навучылі «біць стэп»...

**Рэжысёр** — Карэн Шахназараў. **У ролях:** Аляксандр Панкратаў-Чорны, Наталля Гундарава, Яўген Еўсцігнееў.

## ЧАЦВЕР, 8 СТУДЗЕНЯ

**5.10, 15.40 Серыял «Тайны следства-3».**
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**6.05, 7.05, 8.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 7.45, 18.50** Зона Х.
**7.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.30** «Родныя людзі». «Сіла прыцягнення».
**9.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10, 19.55 Серыял «Мантэкрыста».**
**10.10, 16.40 Серыял «Гарачы лёд».**
**11.00, 17.45 Серыял «Родныя людзі».**
**12.10** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**13.05 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3».**
**13.50** «Уласнай персонай».
**14.25, 0.20 Серыял «Клініка».**
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Дак. цыкл «Нябачны фронт».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.50** Урачыстая цырымонія ўручэння прэмій «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.
**0.05** Дзень спорту.

**8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 0.50** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05, 11.10 Маст. фільм «Безыменная зорка».**
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 1.05** Навіны спорту.
**11.55** «Малахаў+».
**13.10** «Дэтэктывы».
**13.50** «Модны прыгавор».
**15.00 Серыял «Шырокая рака».**
**16.15 Серыял «Агонь кахання».**
**17.10** «Няхай гавораць».
**18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**18.55 Серыял «Рыжая».**
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Спадчына».**
**22.10** «След». Серыял.
**23.20 Серыял «Застацца ў жывых».**
**0.15** «Дакументальны дэтэктыў».

**6.55** Ранішняя падзарадка.
**7.55, 16.30** Смачна з Барысам Бурдой.
**8.15 Серыял «Забойная сіла-2».**
**9.05** У гэты дзень.
**9.10, 15.45** Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
**9.55, 16.55 Серыял «Спадчынніца».**
**10.50** Невытлумачальна, але факт.
**11.40** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**12.05 Меладрама «Сядзелка».**
**13.50 Серыял «Расплата за грахі».**
**14.35** Пазакласная гадзіна.
**14.50** Танцы без правілаў.
**18.00** Навіны культуры.
**18.15** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны.
**19.55** Беларуская часінка.
**20.45** Калыханка.
**21.10 Маст. фільм «Змеялоў».**
**22.55** «Проста праграма».
**23.35** Хакей. НХЛ. Рэйнджарс — Манрэаль.

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.30** «Дарагая перадача».
**8.45 Маст. фільм «Сярэбранае вяселле».**
**10.40 «Жыццё працягваецца». Серыял.**
**11.30, 18.25 «Багатая і любімая». Серыял.**
**12.20 Фільм-казка «Бяляначка і Ружачка».**
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20 «Залатая калекцыя»: муз. фільм «Нябесныя ластаўчкі», СССР, 1976 г.**
**16.50** «Прыватныя гісторыі»: «Навагодняя калекцыя».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.25** «Аўтапанарама».
**20.45 Камедыя «Гульня ў джын».**
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**23.00 Баявік «Вікінг».**
**0.40** «Закон і крымінал».
**0.45** «Гарачы лёд».

**5.00, 11.00, 15.20, 0.30** «Вёска дурняў».
**5.30, 13.30** Мультфільм «Тры мушкецёры».
**6.30, 14.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**7.00 Маст. фільм «Прадавец сноў».**
**9.00, 19.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**10.00, 18.30 Серыял «Прыгоды мага».**
**11.30, 22.30 Нашы любімыя камедыі. Маст. фільм «Джэк Васьмёркін — амерыканец».**
**15.00, 18.00** Навіны Садружнасці.
**15.55** «Білет на сёння».
**16.00, 1.00 Маст. фільм «На каго Бог пашле».**
**20.30, 3.00 Маст. фільм «Джым з Пікадзілі».**

**7.00, 10.40, 23.25** «Навіны кіно».
**7.10, 10.55, 23.35** «Метэапрагноз».
**7.15 Камедыя «Ах, вадэвіль, вадэвіль».**
**8.45** «Стары магнітафон».
**9.00** «Дом жывых гісторый».
**9.30, 16.30** Мультпарад.
**9.50 Серыял «Каралёк — птушка пеўчая».**
**11.00 Камедыя «Лепш не бывае».**
**13.00** «Дзённы тэлечат».
**17.30 Камедыя «Фантамас разбушаваўся».**
**19.10** «К-гульні».
**19.45 Маст. фільм «Прывітанне, я ваша цётка», 1-я серыя.**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**21.15 Маст. фільм «Тутсі».**

**7.00 Серыял «З новым шчасцем!-2. Пацалунак на марозе».**
**9.15, 19.30 Серыял «Кармеліта».**
**10.10, 20.30 Серыял «І падае снег...».**
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.20** Пакой смеху.
**12.10 Маст. фільм «Прадаецца дача».**
**13.50, 16.50, 18.50, 22.30** Навіны—Беларусь.
**14.20** «Гарадок». Дайджэст.
**15.15** «Крывое люстэрка».
**17.00** «Тайна прапаўшай іконы. Казанская». Дак. фільм.
**17.55 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**21.30 Серыял «Пастка».**
**22.40** «Аляксандр Суворaў». Дак. фільм.
**23.30 Маст. фільм «Цярновы вянок».**

**7.00 Серыял «З новым шчасцем!-2. Пацалунак на марозе».**
**10.00, 17.25, 0.45 Серыял «Родныя людзі».**
**10.45, 18.15, 1.30 Серыял «Жанчына без мінулага».**
**11.25, 20.20, 3.45 Серыял «Пастка».**
**13.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**13.15, 5.20 Серыял «І падае снег...».**
**14.45** «Культурны адпачынак». Дак. серыял.
**15.15** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2009».
**19.35, 2.15 Серыял «Кармеліта».**
**21.55** Юбілейны вечар Аркадзя Арканава.
**23.40** «Эпізоды». Юрый Сцяпанаў.
**0.15** «Тэатральны летапіс». Ала Пакроўская.

**6.25, 19.30 Серыял «Павуціна».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.15** «Жывая легенда. Андрэй Вазнясенскі».
**9.00** «Галоўны герой».
**10.25, 21.25 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25 Серыял «Залатое цяля».**
**15.05** «Злачынства ў стылі мадэрн».
**15.30** «Цуда-людзі».
**16.25 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**17.15 Серыял «Я — целаахоўнік».**
**23.20** «Ты смешны!».
**0.05 Серыял «Медыум».**

**7.15 «Дзіўныя Каляды». Маст. фільм.**
**8.50** «Белы анёл Масквы». Дак. фільм.
**9.30, 19.10, 2.25 Серыял «Трымай мяне мацней».**
**10.15, 6.55** «Прыгоды капітана Врунгеля». Мультфільм.
**10.30, 13.30, 20.00, 0.45** Падзеі.
**10.50, 22.25 Маст. фільм «Доўг у каханні».**
**12.10** «Энцыклапедыя». Дэні Дзідро.
**12.15** «Свабодны палёт». «Моцарт і Сальеры».
**12.45, 20.15 Серыял «Анёл-ахоўнік».**
**13.45, 0.35, 5.15** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**13.55** «Момант ісціны».
**14.30 Маст. фільм «Месяцам быў поўны сад».**
**16.15, 2.00** «Рэальныя гісторыі». Цуд у Навагоднюю ноч.
**16.40, 1.00 Серыял «Інспектар Дэрык».**
**17.40, 3.10** Расказы пра кіно. «Вясна на Зарэчнай вуліцы». Марлен Хуцыеў.
**18.15, 3.45** «Рэпарцёр».
**18.35** Мультфільм.
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.40, 4.30 Серыял «Дзяўчынкі».**
**23.45** «Каханне, прабач мне». Рэнат Ібрагімаў.
**4.05** «Pop Corn-TV».
**5.25 Маст. фільм «Цырк».**
**7.05** «Энцыклапедыя». Дэні Дзідро.

**9.30, 11.45, 20.15, 0.00, 1.45** Ралі рэйд. Дакар.
**10.15** «Алімпійскія гульні». Алімпійскі часопіс.
**10.45** Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
**12.30, 17.00, 0.45** Біятлон. Кубак свету.
**13.30** Тэніс. Турнір АТР.
**20.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.30** Дартс. Чэмпіянат свету.

### 9.05 ФІЛЬМ ДНЯ

**«БЕЗЫМЕННАЯ ЗОРКА» (СССР, 1978 г.)**

Аднойчы ў ціхай вёсачцы адбываецца неардынарная падзея: на вакзале прыпыняецца дызельны электрацягнік, які раней заўсёды праязджаў без прыпынкаў. Пасля яго адпраўлення на пероне застаецца адзінокая прыгажуня. Настаўнік Марын Мірою дае дзяўчыне прытулак на ноч.

**Рэжысёр** — Міхаіл Казакоў. **У ролях:** Ігар Касталеўскі, Настасся Вярцінская, Міхаіл Казакоў, Святлана Кручкова.

## СУБОТА, 10 СТУДЗЕНЯ

**5.10 Серыял «Лінія абароны».**
**6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**6.02, 7.05** Прэс-агляд.
**6.05** Дзень спорту.
**6.15, 7.10, 8.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**6.45, 7.45, 16.15** Зона Х.
**7.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**8.20** Гатуем разам.
**8.30** Існасць.
**9.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.10** Здароўе.
**9.45 Серыял «Як сказаў Джым».**
**10.15** Шпілька.
**10.50** Ранішняя хваля.
**11.25** Брытва Акама.
**12.10 Меладрама «Вялікая розніца».**
**14.05** Дак. цыкл «Нябачны фронт».
**14.25** «Будні чэмпіёнаў». Андрэй Краўчанка.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.40** Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
**17.40** «Зямля беларуская». «Глыбоччына».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** «Пяцёрачка».
**19.30 Трагікамедыя «Адрыў па поўнай».**
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Героі».**
**23.30** «Уласнай персонай».
**23.55 Серыял «Клава, давай!».**

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**10.05** «Здароўе».
**10.50** «Смак».
**11.30** «Кветкі як цуд». Дак. фільм.
**12.00** Тэлечасопіс «Саюз».
**12.30 Камедыя «Пакроўскія вароты».**
**15.00** «Некалькі дзён з жыццяў Сямёна Фарады».
**16.10, 21.00** Навіны спорту.
**16.15 Камедыя «Каханне і галубы».**
**18.05** Сэкс-сімвалы. Расійскія зоркі. Жанчыны.
**19.00** «Адзін супраць усіх».
**20.00** Вялікая палітыка.
**21.05 Маст. фільм «Руд і Сэм».**
**22.55 Камедыя «Экс-палюбоўнік».**

**6.55** Ранішняя падзарадка.
**7.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**8.20 Серыял «Олівер Твіст».**
**9.05** Свая кампанія.
**10.10** У гэты дзень.
**10.15, 17.00 Серыял «Спадчынніца».**
**10.55** Жаночая ліга.
**11.25** Школа рамонту.
**12.15** Невытлумачальна, але факт.
**13.20 Драма «Апокрыф. Музыка для Пятра і Паўла».**
**15.45** Страсці па культуры. Ток-шоу.
**16.30** Спорт, спорт, спорт... Аляксей Мядзведзеў.
**18.00** Навіны культуры.
**18.15** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны.
**19.45** Космаполітэн. Відэаверсія.
**20.45** Жаночая ліга.
**21.15** Калыханка.
**21.30 Трагікамедыя «Жыццё забавамі поўнае».**

**23.25** Шоу Ньюс.
**23.45** «Казанова».
**0.15** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Экстраліга. Юнацтва (Мінск) — Керамін (Мінск).

**6.00, 7.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10** «Міншчына».
**6.20, 7.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**8.00** Фільм-казка «Казка пра зорнага хлопчыка».
**10.10** «Мой дом».
**10.40 Серыял «Жыццё працягваецца».**
**11.30, 18.25 Серыял «Багатая і любімая».**
**12.20** «Новыя падарожжы дылетанта».
**12.50 Камедыя «Лятучая мыш».**
**15.15** «Я — падарожнік».
**15.45** «Відзьма—нявідзьма».
**16.45** «Наша справа».
**16.55** «Народжаныя ў СССР».
**17.40** «Званая вячэра».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Мой лепшы палюбоўнік».**
**22.00, 22.55** «Дзень нараджэння ў Новы год».
**0.30 Маст. фільм «Парыж, Тэхас».**

**5.00, 11.00, 15.20, 0.30** «Вёска дурняў».
**5.30, 13.30** Мультфільм «Легенда пра Атлантыду».
**6.30, 14.30 Серыял «Лэсі і рэнджар Коры».**
**7.00 Маст. фільм «Гадзіннік капітана Энрыка».**
**9.00, 19.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**10.00, 18.30 Серыял «Прыгоды мага».**
**11.30, 22.30 Казкі нашага дзяцінства. Маст. фільм «Варвара — краса, доўгая каса».**
**15.00, 18.00** Навіны Саюжнасці.
**15.55** «Білет на сёння».
**16.00, 1.00 Маст. фільм «Грэчаскія канікулы».**
**20.30, 3.00 Маст. фільм «Чатыры пакоі».**

**9.00, 15.50, 23.15** «Навіны кіно».
**9.05, 23.25** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адзінка ў кубе».
**9.30, 14.35** Мультпарад.
**9.50, 18.30** «К-гульні».
**10.00** «Хіт-парад тэлечата».
**10.30 Баявік «Джэймс Бонд — агент 007».**
**12.30 Меладрама «Ясенія».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Камедыя «Міміно».**
**18.40** «Стары магнітафон».
**19.00 Баявік «Захоп»».**
**20.45** «Вечарніца».
**20.55** «К-відэа для ўсёй сям'і».
**21.00 Маст. фільм «Вастраў галаварэзаў».**

**7.00 Маст. фільм «Расія маладая». 1-я серыя.**
**8.10** Мультфільм. «Па шчупаковай волі».
**8.50** «Мой сярэбраны шар. Фаіна Ранеўская». Вядучы — Віталь Вульф.
**9.45** «Суботнік».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.10** Пакой смеху.
**12.05** «Вакол свету».
**13.00 Серыял «Марш Турэцкага. Новае назначэнне».**
**14.20** «Гарадок». Дайджэст.
**14.45** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2009».
**17.00** «Аншлаг і Кампанія».
**18.50** Навіны—Беларусь.
**19.20 Маст. фільм «Сашка, каханне маё».**
**22.30 Маст. фільм «Пасылка з Марса».**

**7.00, 20.15 Маст. фільм «Усё па-сумленнаму».**
**8.35, 11.50** Мультфільмы.
**8.45** «Утаймаванне сваволнікаў».
**9.15** «Апошняя роля. Георгій Юматаў».
**10.00, 13.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**10.10** Весткі—Масква. Тыдзень у горадзе.
**10.45, 1.05 Маст. фільм «Расія маладая».**
**12.05** «Біблейскі сюжэт».
**12.30** «Падарожжы натураліста».
**13.20** Весткі—Масква.
**13.25 Серыял «Каханне маё».**
**14.20** «За сямю пячаткамі».
**14.50** «Партытуры не гараць».
**15.20** Юбілейны вечар Яўгена Петрасяна «60 гадоў у абед».
**18.10, 2.10 Серыял «Марш Турэцкага. Новае назначэнне».**
**19.20, 3.15** «Культурная рэвалюцыя».
**21.55, 4.10 Камедыя «Трыфальдзіно з Бергама».**
**0.05** «Няскончаная песня». Аляксандр Галіч.
**6.20** «Расійскія зоркі сусветнага джаза: Ларыса Доліна і біг-бэнд Анатоля Кролa».

**6.25 Серыял «Павуціна».**
**8.00, 10.00, 13.00, 19.00** Сёння.
**8.20 Камедыйны баявік «Шары ярасці».**
**10.25** «Суд прысяжных».
**11.15, 13.25 Серыял «Тамбоўская ваўчыха».**
**18.30 Прафесія рэпарцёр.**
**19.30** «Праграма Максімум».
**20.20** «Рускія сенсацыі».
**21.10** «Ты не паверыш!».
**22.05 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**23.35 Серыял «Медыум».**

**7.15 «Блакітны лёд». Маст. фільм.**
**8.20** «Энцыклапедыя». «Шубка» Пітэр Пауль Рубенс.
**8.30** «Наша музыка». Жасмін.
**9.10** «Маскоўскія профі». Кухары.
**9.35** «Масква Першапрастольная». Дак. фільм.
**10.00, 1.50** «Pop Corn-TV».
**10.30, 13.30, 20.00, 0.15** Падзеі.
**10.45** Мультпарад.
**11.15, 3.15 Маст. фільм «Дзікі сабака Дзінга».**
**12.50** «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
**13.00** «Свабодны палёт». «Моцарт і Сальеры».
**13.45** Эдгар і Аскольд Запашныя ў праграме «Сто пытанняў дарасламу».
**14.25** «Прыгадваючы Каляды».
**15.20 «Мне патрэбна толькі каханне». Меладрама.**
**18.25** «Брава, артыст!» Зіновій Герд.
**20.15, 5.30 Серыял «Я — сышчык».**
**21.45 Маст. фільм «Спячы і прыгажуня».**
**23.20** «Застанься са мною, Алеся!» Песні Алега Іванова.
**0.30 Маст. фільм «Яна вас кахае».**
**2.15 Серыял «Інспектар Дэрык».**
**4.50** «Ад смешнага да вялікага...» Раман Карцаў і Віктар Ільчанка.
**7.00** «Рэпарцёр».

**9.30, 12.15, 18.15** Біятлон. Кубак свету.
**10.15, 13.15** Горныя лыжы. Кубак свету.
**11.15** Горныя лыжы. Кубак свету.
**15.00** Скачкі на лыжах з трамплiна. Кубак свету.
**16.45** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**19.45** Тэніс. Турнір АТР.
**21.30** Дартс. Чэмпіянат свету.
**0.00, 2.30** Ралі рэйд. Дакар.
**0.30** Байцоўскі клуб.

### 0.30 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ПАРЫЖ, ТЭХАС» (ФРАНЦЫЯ—ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ—ГЕРМАНІЯ—ФРГ, 1984 г.)**

Трэвіс хаваецца ад блізкіх у глушы штата Тэхас. І толькі праз чатыры гады брату Трэвіса ўдалося пасадзейнічаць таму, каб знайшлі шлях адно да аднаго бацька і сын, муж і жонка, якая апынулася ў сумніўнай установе пад назвай «піп-шоу». А Парыж ніякага дачынення да сталіцы Францыі не мае — гэта маленькі гарадок у Тэхасе.

**Рэжысёр** — Вім Вендэрс. **У ролях:** Гары Дзін Стэнтан, Сэм Бэры, Бернард Віцкі, Дзін Стокуэл, Орар Клеман, Хантэр КарсанВіва, Сокара Валдэз.



# ТВАЕ РУКІ

## Бяседныя ПЕСНІ

У навагодніх пажаданнях, тостах заўсёды гаворым пра шчасце. Зычым, каб яно было сонечным, чыстым, працяглым, бязмерным... І па-дзіцячы верым, што шчасце абавязкова прыйдзе, аднекуль зазірне да нас ці яго прынясуць, падарыюць сябры, блізкія. І жывём у чаканні таго няўлоўнага, загадкавага, што цешыць душу, спадзяёмся на нешта лепшае.

А шчасце на справе канкрэтнае, рэальнае. І не хтосьці даруе нам, а яго мы самі ствараем. І вельмі часта. Праўда, толькі не ўяўляем, што гэта якраз шчасце. Чамусьці многія з нас бачаць яго ў выглядзе дабрабыту, прэстыжнай пасады. Некаторым яно падаецца як каханне, сямейная ўтульнасць. Сапраўды, яно такое і адначасова не такое.

Шчасце — гэта лад паміж людзьмі, паразуменне між імі, суладдзе духоўнага і матэрыяльнага ў іх адносінах і дзейнасці. Без любові, без светлыні ў пачуццях, без дабрыні ў справах няма шчасця. (І жыцця няма, а толькі існаванне.) Адчуванне гармоніі, ладу, суладдзя ў грамадстве, калектыве і ў самім сабе прыносіць шчаслівыя імгненні, робіць успрыманне рэчаіснасці радасным. І ўсё гэта ствараецца намі самімі.

Шчаслівымі будуць і навагодні рэй, а за ім і ўвесь год, калі станем актыўна дзейнічаць і падтрымліваць, пашыраць духоўнасць вакол сябе. Навагоднюю бяседу трэба рыхтаваць. Яе святочнасць, духоўна-інтэлектуальны характар цалкам залежаць ад нас. (Тэлепраграмы выступаюць толькі фонам. І то час ад часу.) Якая суладнасць у змесце размоў, тостаў, песень, жартаў-забаў, такая ж узнёсласць на застоллі і натхнёнасць у наступных справах.

Песня «Твае рукі» Янкі Сіпакова і Мікалая Пятрэнкі, якую «Песняры» разнеслі па ўсім свеце, перадае непаўторныя імгненні закаханых. Злітнасць іх душаў, пяшчота рухаў, глыбокае паяднанне з прыродай поўняць навакольную прастору прамяністай жыццетвараль-най энергіяй. Адчуванне і асэнсаванне яе — шчасце.

**Верш Янкі СІПАКОВА**
**Музыка Мікалая ПЯТРЭНКІ**

*Твае рукі, твае рукі нада мною,*
*Нібы лебедзі над белаю зімою.*
*Як ласкава яны кружаць*
*І сам мной па леце тужаць,*
*Нібы лебедзі над белаю зімой.*

*Цяжка, рукі, расставацца*
*з вамі дужа,*
*І без вас мне заставацца*
*паміж сцюжай!*
*Не ляціце, рукі, ў вырай,*
*Нада мной кружыце шчыра,*
*Нібы лебедзі над белаю зімой.*

*Я люблю, як твае рукі нада мною,*
*Нібы лебедзі над белаю зімою.*
*Як яны садзяцца міла,*
*Склаўшы крылы, склаўшы крылы,*
*Нібы лебедзі над белаю зімой.*

*Калі лашчаць валасы мне твае рукі,*
*Слухаю бы песню я іх рухі, рухі.*
*А яны пяюць шчымліва*
*І крыляюць палахліва,*
*Нібы лебедзі над белаю зімой.*

*Цяжка, рукі, расставацца*
*з вамі дужа,*
*І без вас мне заставацца*
*паміж сцюжай!*
*Не ляціце, рукі, ў вырай,*
*Нада мной кружыце шчыра,*
*Нібы лебедзі над белаю зімой.*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

## НЯДЗЕЛЯ, 11 СТУДЗЕНЯ

**6.30 Серыял «Сэрца акіяна».**
**6.55 Камедыя «Гэта вясёлая планета».**
**8.30** Альманах падарожжаў.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**9.15** Арсенал.
**9.45 Серыял «Як сказаў Джым».**
**10.15** Культурныя людзі.
**10.50** Усе стыхіі.
**11.25** «У свеце матораў».
**12.10** Дак. фільм «Масфільм». Невядомая версія».
**12.45 Камедыя «Верныя сябры».**
**14.45** Дак. цыкл «Нябачны фронт».
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**15.55** Фестываль смешнага відэа «КВеНцін-2008». Частка 1-я.
**17.50** Суперлато.
**18.50 Меладрама «Гульня ў хованкі».**
**20.35** «Спартлато 5 з 36».
**21.00** Панарама тыдня.
**22.35** Хакей для ўсіх.
**23.15 Драма «Дастукацца да нябёсаў».**

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** Нядзельная пропаведзь.
**9.20 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**10.25** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** «Разумніцы і разумнікі».
**12.35** «Ранішняя пошта».
**13.15** «Дарослыя казкі пра жывёл». Дак. фільм.
**13.45** «Адваротны адлік».
**14.15 Маст. фільм «Маленькая прынцэса».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Міжнародная панарама».
**16.40** Тэорыя неверагоднасці. «Антыхілер».
**17.25 Маст. фільм «Маска Зора».**
**20.00** Контуры.
**21.05 Маст. фільм «Чалавек года».**
**23.15** «Прытулак камедыянтаў».

**7.40** Звон.
**8.05** Мір вашаму дому.
**8.20** Бухта капітанаў.
**9.00** Наша пяцёрачка.
**10.05 Серыял «Капітан Нэма». 1-я серыя.**
**11.30** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**12.05, 23.00** ПРАсоўванне+.
**12.20** Жаночая ліга.
**12.50** Слова пісьменніка.
**13.20** «Спявай, душа. by».
**13.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Жанчыны.
**14.50 Серыял «Дзве зоркі».**
**16.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Манчэстэр Юнайтэд — Чэлсі.
**19.55** Жаночая ліга.
**20.30** Тэлебарометр.
**20.50** Правы чалавека.
**21.05 Камедыя «Віла разладу, або Танец сонечнага зацьмення».**
**22.35** Свая музыка.
**23.30 Камедыя «Лулу наэаўсёды».**

**7.05 Серыял «Агенцтва 2».**
**7.55 Фільм-казка «Пра прынцэсу Ясенку і шаўца, які лятаў».**
**9.25** «Аўтапанарама».
**9.55** «Відавочца» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікае снеданне».
**11.30 Серыял «Каханне маё».**
**12.35** «Добры дзень, доктар!».
**13.05 Меладрама «Прынцэса на бабах».**
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Сакрэтныя гісторыі»: «Год 2009. Прарыў у бездань?».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Уваскрэсенне класікі».
**18.00** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.30 Маст. фільм «Малена».**
**22.20** «Спартыўны тыдзень».
**22.50** «Дыскатэка 80-х. Лепшае».

**5.00, 11.00, 15.20, 0.30** «Вёска дурняў».
**5.30, 13.30** Мультфільм «Скарбы імператара».
**6.30, 14.30 Серыял «Лэсі і рэнджар Коры».**
**7.00 Маст. фільм «Капітан Джэк».**
**9.00, 19.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**10.00, 18.30 Серыял «Прыгоды мага».**
**11.30, 22.30 Нашы любімыя камедыі. Маст. фільм «Не май сто рублёў...».**
**15.00, 18.00** Навіны Саюжнасці.
**15.55** «Білет на сёння».
**16.00, 1.00 Маст. фільм «Палонныя ўдачы».**
**20.30, 3.00 Маст. фільм «Гуд бай, Ленін!».**

**9.00, 16.50** «К-гульні».
**9.05, 23.25** «Метэапрагноз».
**9.10** «Адшукваецца адпачынак».
**9.30** «Кіно—кліп—парад».
**9.50, 21.00** «Навіны кіно».
**10.00** «Мой любімы гадаванец».
**10.30 Маст. фільм «Востраў галаварэзаў».**
**12.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».**
**14.15** Канцэрт «Па вашых просьбах».
**15.20** «К-відэа для дзяцей».
**15.40 Фільм для дзяцей.**
**17.00 Маст. фільм «Заказаны па ўласным жаданні».**
**18.45** «8 самых».
**19.00 Баявік «Захоп-2».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Маст. фільм «Я марыла аб Афрыцы».**
**23.00** Хіт-парад тэлечата.

**7.00 Маст. фільм «Расія маладая».**
**8.10** Мультфільмы.
**9.05** Студыя «Здароўе».
**9.35** «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
**10.30** «Гарадок».
**11.00, 14.00, 19.00** Весткі.
**11.25** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Апошняя роля. Георгій Юматаў». Дак. фільм.
**13.05 Серыял «Марш Турэцкага. Новае назначэнне».**
**14.20** Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2009».
**16.50** Юбілейны вечар Яўгена Петрасяна «60 лет в обед».
**19.30 Маст. фільм «Усё пасумленнаму».**
**22.30 Маст. фільм «Быць закаханым».**

**7.00** Добрай раніцы, Расія!
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Весткі.
**10.30, 13.20** Весткі—Масква.
**10.45, 1.05 Маст. фільм «Расія маладая».**
**11.50** Мультфільмы.
**12.20** «Сам сабе рэжысёр».
**13.35 Серыял «Каханне маё».**
**14.30** «Хто ў доме гаспадар».
**14.55** «Гарадок». Дайджэст.
**15.20** «Больш, чым каханне».
**16.30** Весткі—Маскоўская вобласць.
**16.50 Маст. фільм «Быць закаханым».**
**18.10, 2.10 Серыял «Марш Турэцкага. Новае назначэнне».**
**19.45, 3.40 Маст. фільм «Жоўты дракон».**
**22.45** Весткі+.
**23.00 Маст. фільм «Мы дзіўна сустрэліся».**
**0.20** «Забаронены абгон. Генадзь Бачынскі».

**6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.05** «Сёння раніцай».
**8.20** «Іх норавы».
**8.50** «Галоўная дарога».
**9.25** «Quattroruote».
**10.20** «Шчырае прызнанне».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.50** «Кватэрнае пытанне».
**13.35 Серыял «Тузін правасуддзя».**
**15.30, 18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30 Камедыя «Хатабыч».**
**19.35 Серыял «Двайная ракіроўка-3».**
**21.45 Трылер «Сухая косць».**
**23.35 Камедыя «Вельмі страшнае кіно».**
**1.00 Маст. фільм «Крыжовы паход у джынсах».**

**7.20 Маст. фільм «Няхай жыве жыццё!».**
**9.05** «Рэпарцёр».
**9.20** «У кахання страху няма». Дак. фільм.
**10.00** «Нашы любімыя жывёлы».
**10.30, 13.30, 19.30, 2.15** Падзеі.
**10.45** «АБВГДэйка».
**11.10** Мультфільм.
**11.30 Камедыя «Яна вас кахае».**
**12.50** «Пустэльнік». Дак. фільм.
**13.45** «Маскоўскія профі». Экскурсаводы.
**14.10** Раіса Разанава ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
**14.35** «Геній Места».
**15.05, 2.30 Серыял «Следства вядуць ЗнаТаКі».**
**17.55** «Смех з дастаўкай на дом».
**18.35** «Новыя песні ў Новым годзе».
**20.05, 5.35 Серыял «Я — сышчык».**
**21.35 Маст. фільм «Гузік».**
**23.10 Меладрама «Мне патрэбна толькі каханне».**
**5.20** «Сетка». Спецыяльны рэпартаж.
**7.05** «Энцыклапедыя». «Шубка» Пітэр Пауль Рубенс.

**9.30, 12.00** Санны спорт. Кубак свету.
**10.30, 13.15, 14.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**12.30, 16.45** Лыжнае дваяборʼе. Кубак свету.
**14.00, 17.00** Біятлон. Кубак свету.
**15.00** Скачкі на лыжах з трамплінаКубак свету.
**17.45, 21.30, 0.45** Снукер.
**19.30, 20.45** Дартс. Чэмпіянат свету.
**20.30, 0.00, 1.45** Ралі рэйд. Дакар.
**1.15** Зімовыя віды спорту.

### 23.15 ФІЛЬМ ДНЯ

## «ДАСТУКАЦЦА ДА НЯБЁСАЎ» (ГЕРМАНІЯ, 1997 г.)

Ім засталося жыць два-тры дні. У бальнічнай палаце, куды іх змясцілі, яны знаходзяць бутэльку тэкілы і, добра набраўшыся, вырашаюць адправіцца да мора, таму што «на небе анёлы толькі і гавораць, што пра мора».



**Рэжысёр** — Томас Ян. **У ролях:** Ціль Швайгер, Морыц Бляйбтрой, Ян Ёзэф Ліферс, Рутгер Хаўэр, Леанард Лензінк.

**SERVICE**

***СЕРАДА, 7 студзеня***
**3.00, 21.00** Меладрама «Закаханы Шэкспір».
**5.00** Трылер «Ван Хельсінг».
**7.20** Камедыя «Маленькая міс Маркер».
**9.00** Камедыя «Мой бацька — мой герой».
**11.00** Камедыя «Гуд бай, Ленін!».
**13.00** Драма «Малы».
**15.00** Драма «Грошы на дваіх».
**17.00** Драма «Цяжкасці перакладу».
**19.00** Камедыя «Ноцінг Хіл».
**23.00** Камедыя «Адаптацыя».
**1.00** Трылер «Іншы».

***ЧАЦВЕР, 8 студзеня***
**3.00, 21.00** Драма «Жыццё Дэвіда Гейла».
**5.10** Камедыя «Ноцінг Хіл».
**7.10** Драма «Малы».
**9.00** Драма «Грошы на дваіх».
**11.00** Драма «Цяжкасці перакладу».
**13.00** Камедыя «Тыгр і снег».
**15.00** Камедыя «Бацькі».
**17.00** Драма «Бухта кахання і смутку».
**19.00** Драма «Галава ў аблоках».
**23.10** Трылер «Іншы».
**0.50** Драма «У імя айца».

***ПЯТНІЦА, 9 студзеня***
**3.00, 21.00** Драма «Мы тут больш не жывём».
**5.00** Драма «Галава ў аблоках».
**7.00** Камедыя «Тыгр і снег».
**9.00** Камедыя «Бацькі».
**11.00** Драма «Бухта кахання і смутку».
**13.00** Камедыя «Дабіся поспеху зноў».
**15.00** Мюзікл «Ісус Хрыстос — суперзорка».
**17.00** Драма «Мадзільяні».
**19.10** Трылер «Віртуоз».
**22.50** Драма «У імя айца».
**1.00** Камедыя «У шоу толькі дзяўчаты».

***СУБОТА, 10 студзеня***
**3.00, 21.00** Трылер «Закладнік».
**5.00** Трылер «Віртуоз».
**7.00** Камедыя «Дабіся поспеху зноў».
**9.00** Мюзікл «Ісус Хрыстос — суперзорка».
**10.50** Драма «Мадзільяні».
**13.00** Камедыя «Богус».
**15.00** Трагікамедыя «Візіт аркестра».
**16.30** Драма «Рэй».
**19.00** Драма «Паварот».
**23.00** Камедыя «У шоу толькі дзяўчаты».
**1.00** Драма «Баль монстраў».

***НЯДЗЕЛЯ, 11 студзеня***
**3.00, 21.00** Камедыя «Правілы сэкса».
**5.00** Драма «Паварот».
**7.00** Камедыя «Богус».
**9.00** Трагікамедыя «Візіт аркестра».
**10.30** Драма «Рэй».
**13.00** Камедыя «Тата выкраў аўтамабіль».
**14.30** Мюзікл «Прывід оперы».
**17.00** Баявік «Двайны фарсаж».
**19.00** Камедыя «Бітвы салдата Келі».
**23.00** Драма «Баль монстраў».
**1.00** Камедыя «Чэрчыль ідзе на вайну!».

***СЕРАДА, 7 студзеня***
**7.00, 15.40** Махінатары.
**7.25** Каралі будоўляў.
**8.20, 12.55** Амерыканскія калымагі.
**9.15, 18.00, 5.40** Як гэта працуе.
**10.10, 16.05, 2.00** «Звар'яцелыя ад трукаў».
**10.40, 16.35, 2.25** Неверагодная хуткасць.
**11.05, 20.00, 6.05** Разбуральнікі легендаў.
**12.00** Хлам? Не, машына!».
**13.50, 0.00** Зброя будучыні.
**14.45, 21.00** Брудная работка.
**17.00, 4.45** Круты цюнінг.
**19.00, 3.50** Амерыканскі чопер.
**22.00, 2.55** На месцы злачынства.
**23.00** Доктар Дж.: медыцынскае расследаванне.
**1.00** «Галаваломы».

***ПЯТНІЦА, 9 студзеня***
**7.00, 15.40** Махінатары.
**7.25** Каралі будоўляў.
**8.20, 12.55** Амерыканскія калымагі.
**9.15, 18.00, 5.40** Як гэта працуе.
**10.10, 16.05, 2.00** «Звар'яцелыя ад трукаў».
**10.40, 16.35, 2.25** Неверагодная хуткасць.
**11.05, 20.00, 6.05** Разбуральнікі легендаў.
**12.00** «Хлам? Не, машына!».
**13.50, 0.00** Зброя будучыні.
**14.45, 21.00** Брудная работка.
**17.00, 4.45** Круты цюнінг.
**19.00, 3.50** Амерыканскі чопер.
**22.00, 2.55** На месцы злачынства.
**23.00** Доктар Дж.: медыцынскае расследаванне.
**1.00** «Галаваломы».

***СУБОТА, 10 студзеня***
**7.00, 13.50, 3.50** Discovery: праект «Зямля».
**7.55, 14.45** Мегабудоўлі.
**8.50** «Як гэта працуе».
**9.45, 16.35, 4.45** У свеце машын.
**10.10, 18.00** Зброя будучыні.
**11.05, 19.00** «Скрыўленне часу».
**12.00** «Галаваломы».
**12.55** «Пятая перадача».
**15.40** Адкрыць невядомае з Джошам Бернштэйнам.
**17.00, 2.55** «Хлам? Не, машына!».
**20.00** Амерыканскія калымагі.
**21.00, 5.10** Аўтамайстэрні.
**22.00, 6.05** Амерыканскі чопер.
**23.00** «Каралі фарсажу».
**0.00** Тайны баявых майстэрстваў.
**1.00** «У пагоні за ўраганам».
**2.00** Сапраўдныя героі.
**2.25** Якія цудам выратаваліся — крутыя здымкі.

***НЯДЗЕЛЯ, 11 студзеня***
**7.00, 21.00, 6.05** Разбуральнікі легендаў.
**7.55, 3.50** Каралі будоўляў.
**8.50, 16.35, 4.45** Выпрабаванне на трываласць.
**9.15** Адкрыць невядомае з Джошам Бернштэйнам.
**10.10** «У пагоне за ўраганам».
**11.05** «Смяротны ўлоў».
**12.00** Тайны баявых майстэрстваў.
**12.55, 2.00** Выжыць любой цаной.
**13.50** Самыя лепшыя.
**14.45, 20.00** Амерыканскі чопер.
**15.40** Як гэта працуе.
**17.00** Брудная работка.
**18.00, 5.10** «Галаваломы».
**19.00** Аўтамайстэрні.
**22.00** Эліта сусветнай паліцыі з Крысам Раянам.
**23.00, 2.55** Смяротная зона.
**0.00** Доктар Дж.: медыцынскае расследаванне.
**1.00** На месцы злачынства.

***СЕРАДА, 7 студзеня***
**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Антаніета».
**10.50, 18.50, 2.50** Камедыя «Цудоўная пара».
**12.25, 20.25, 4.25** Камедыя «Віртуальны раман» (2 серыя).
**13.20, 21.20, 5.20** Камедыя «Абмяняцца жонкамі».
**14.50, 22.50, 6.50** Драма «Дом з пяску і туману».

***ЧАЦВЕР, 8 студзеня***
**9.00, 17.00, 1.00** Драма «Чытаю цябе як кнігу».
**10.50, 18.50, 2.50** Меладрама «Новая Францыя».
**13.15, 21.15, 5.15** Меладрама «Анегін».
**15.05, 23.05, 7.05** Драма «Злучаныя штаты Ліланда».

***ПЯТНІЦА, 9 студзеня***
**9.00, 17.00, 1.00** Камедыя «Мурашы ў штанах».
**10.25, 18.25, 2.25** Трылер «Вароты д'ябла».
**12.05, 20.05, 4.05** Камедыя «Мадо, да запатрабавання».
**13.50, 21.50, 5.50** Драма «Два сябры».
**15.20, 23.20, 7.20** Драма «Палюбоўнік».

***СУБОТА, 10 студзеня***
**9.00, 17.00, 1.00** Камедыя «Прыгоды Мартадэла і Філімона».
**10.50, 18.50, 2.50** Драма «Дэпрэсія» (1 серыя).
**12.20, 20.20, 4.20** Камедыя «Чарговы пераезд Эда».
**13.50, 21.50, 5.50** Драма «Чужая кроў».
**15.30, 23.30, 7.30** Драма «Аператар смерці».

***НЯДЗЕЛЯ, 11 студзеня***
**9.00, 17.00, 1.00** Камедыя «Прынады».
**10.40, 18.40, 2.40** Драма «Дэпрэсія» (2 серыя).
**12.05, 20.05, 4.05** Камедыя «Самае галоўнае ў жыцці».
**13.35, 21.35, 5.35** Драма «Хрыбет д'ябла».
**15.25, 23.25, 7.25** Камедыя «Лезыны ўраджай».

*У праграме магчымыя змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена!*

# МОЎНЫ «ГАРАСКОП»

## ЧАГО ЧАКАЦЬ НОСЬБІТАМ БЕЛАРУСКАСЦІ Ў НОВЫМ ГОДЗЕ?

**Мы кажам: мова жывая. І маем на ўвазе, што яе існаванне працягваецца, што яна забяспечвае стасункі, успрымае новыя павевы і абавязкова іх адлюстроўвае. Так што жыццё яе непарыўнае з нашым. Яна разам з намі жыве і перажывае нешта. Чаго чакаць ад новага года ў жыцці мовы? Высвятляем разам з экспертам — *дырэктарам Інстытута мовы і літаратуры імя Янкі Купалы і Якуба Коласа Аляксандрам ЛУКАШАНЦАМ*. Аднак перш чым рабіць прагнозы на год наступны, варта ацаніць год мінулы.**

— Найбольш важнай падзеяй у 2008 годзе ў тым, што датычыцца мовы, было, вядома ж, прыняцце Закона «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Пастаўлена кропка ў шматгадовай працы над упарадкаваннем адзінства нормаў беларускай пісьмовай мовы. Гэта дазволіць спыніць арфаграфічны разнабой, які ў апошнія гады існаваў на старонках беларускамоўных выданняў, аптымізаваць працэс вывучэння беларускай мовы ў школе. А значыць, павысіць прэстыж беларускай мовы як дзяржаўнай мовы нашай краіны, засведчыць яе статус як высокаразвітай літаратурнай мовы, што можа паспяхова абслугоўваць усе патрэбы сучаснага грамадства.

**У МОВАЗНАЎЦАЎ — ШМАТ ПРАЦЫ**

Наступны год для беларусазнаўцаў выдасца досыць напружаным і складаным. Ім трэба падрыхтаваць факталагічную базу для пераходу да новага правапісу. Слоўнікі і даведнікі з улікам усіх зменаў, а таксама разгорнутыя каментарыі, дзе б падаваліся тлумачэнні новаўвядзенняў. Тытанічная праца.

— Адна з найбольш актуальных задач — падрыхтоўка новага выдання Арфаграфічнага слоўніка беларускай мовы. Трэба не толькі падкарэктаваць змешчаны там матэрыял, але і значна папоўніць гэты слоўнік новай лексікай, якая з'явілася ва ўжытку ў апошнія дзесяцігоддзі і ў першую чаргу патрабуе правапіснай рэгламентацыі. Неабходна падрыхтаваць як мага больш поўны даведнік, дзе былі б усе неабходныя каментарыі па асноўных правілах беларускай арфаграфіі і прыведзены найбольш поўныя спісы слоў, якіх датычацца тыя ці іншыя моманты закона. Зараз у нашым інстытуце вядзецца інтэнсіўная работа па падрыхтоўцы гэтых матэрыялаў. І я думаю, што на працягу наступнага года яны будуць падрыхтаваныя і, хутчэй за ўсё, пабачаць свет.

Ды і фундаментальныя работы мноваведам ніхто не адмяняў. Гэта і завяршэнне шматтомных этымалагічнага і гістарычнага слоўнікаў беларускай мовы, і даследаванне стану беларускай мовы пачатку XX ст. Лексіка першай беларускамоўнай друкаванай газеты пачатку XX стагоддзя — «Нашай нівы» — для лінгвістаў амаль што неараная ціліна.

— У той час найбольш інтэнсіўна фарміраваліся і слоўнікавы склад, і асноўныя нормы новай беларускай літаратурнай мовы. Да нядаўняга часу гэты перыяд заставаўся найменш даследаваным. З выданнем «Слоўніка мовы «Нашай нівы», праца над якім вядзецца ў Інстытуце мовы і літаратуры (апублікаваны два першыя тамы), гэты прабел будзе запоўнены.

**ПЕРАД ЖУРНАЛІСТАМІ — ЦЯЖКІЯ, АЛЕ ВЫКАНАЛЬНЫЯ ЗАДАЧЫ**

Прапагандысцкая работа, на думку Аляксандра Лукашанца, не менш важная, чым навуковая. Беларуская мова мае ў гэтым патрэбу. Варта прасоўваць ідэю аб пашырэнні яе ў грамадстве, распаўсюджванні ва ўсіх сферах ужытку. Асаблівая роля ў гэтым, паводле меркавання навукоўцы, належыць менавіта СМІ. «Да слова надрукаванага ці слова, якое гучыць у эфіры, у грамадстве прывыклі ставіцца як да слова ўзорнага. Трэба, каб мова СМІ найбольш дакладна адпавядала нормам і пры гэтым была жывой, найбольш поўна выкарыстоўвала ўсё сваё лексічнае багацце. Газеты, якія разлічаны на масавага чытача, маюць велізарныя магчымасці і для фарміравання грамадскай думкі, стаўлення да той ці іншай з'явы. У тым ліку і да праблем моўнага жыцця, сучаснага стану беларускай мовы ў грамадстве. Калі ў СМІ будзе фарміравацца грамадскае ўсведамленне неабходнасці ведання беларускай мовы, прэстыжу асобы, якая карыстаецца беларускай мовай, гэта станоўча паўплывае на стан мовы. Але гэта работа павінна весціся не час ад часу, а пастаянна, мэтанакіравана, паслядоўна».

**ІНІЦЫЯТЫВУ «ЗВЯЗДЫ» АБ'ЯВІЦЬ ДЛЯ СВАІХ ЧЫТАЧОЎ І ПРЫХІЛЬНІКАЎ БЕЛАРУШЧЫНЫ ГОД БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НАВУКОЎЦА ВІТАЕ**

Прызнае ён і тое, што інтарэс да беларускай мовы ажывае:

— Сёння беларускай мовай актыўна карыстаецца, напэўна, меншая частка насельніцтва нашай краіны, аднак ёсць тэндэнцыя да развіцця і пашырэння сістэмы мовы, яе камунікатыўных функцый. Беларуская мова ўсё больш актыўна пранікае ў сферу інтэрнэт-камунікацыі. А гэта значыць, што фактычна фарміруецца новы функцыянальны стыль беларускай літаратурнай мовы. Усё часцей беларускай мовай карыстаюцца ў сферы канфесійных стасункаў. Яна прысутнічае ў практычным набажэнстве, з'яўляюцца і вельмі кваліфікаваныя пераклады на сучасную беларускую мову рэлігійных тэкстаў. Дарэчы, нядаўна абмяркоўваўся такі варыянт перакладу Евангелля, і я павінен адзначыць, што гэта вельмі высокага ўзроўню пераклад, які падрыхтаваны ў адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай мовы, але разам з тым у ім захоўваецца ўрачыстасць і ўзнёсласць стылю, неабходныя для гэтай сферы моўнай дзейнасці. Беларуская мова прысутнічае нават у такой сферы, як ваенная. Большасць назваў радоў войскаў, вайсковых падраздзяленняў, апазнавальных знакаў і нашывак на абмундзіраванні вайскоўцаў выкананы на беларускай мове. Ёсць адна сфера моўнай дзейнасці, дзе, нягледзячы на дзяржаўнае двухмоўе, выкарыстоўваецца толькі беларуская мова. У адпаведнасці з заканадаўствам усе дакументы на атрыманне вышэйшых дзяржаўных узнагарод нашай краіны афармляюцца толькі на беларускай мове. Пашыраецца ўжыванне беларускай мовы і ў рэкламных аб'явах.

**РЭКЛАМШЧЫКАМ ВАРТА БЫЦЬ АСАБЛІВА ПІЛЬНЫМІ**

Некаторыя вытворцы прасоўваюць свае брэнды на айчынным рынку выключна па-беларуску. Гэта становіцца такой моднай «фішкай» — спосабам вылучыцца, абысці канкурэнтаў, запомніцца. Чаго ўжо тут хаваць: беларускамоўная рэклама ў Беларусі — пакуль экзотыка. Тым не менш такія слоганы на слыху. І лінгвістаў гэта не можа не радаваць. Аднак ёсць тут і свае «але»...

— Беларуская мова, безумоўна, павінна больш шырока выкарыстоўвацца ў рэкламе — вонкавай, візуальнай, гукавой, друкаванай... Але тут неабходна вельмі строга падыходзіць да захавання нормаў беларускай літаратурнай мовы. Таму што часта мова рэкламы не зусім... беларуская. Часта гэта такія дастаткова штучныя калькі з рускай або з англійскай мовы. Напрыклад, «прышпільны мабільны». Для мяне як для лінгвіста гэта гучыць калі не дзіка, то ва ўсякім разе штучна. Тут што адбываецца? Семантычны аб'ём рускага слова «приколоть» аўтаматычна пераносіцца на аб'ём беларускага слова «прышпіліць». Але ж у беларускай мове дзеяслоў «прышпіліць» адносіцца толькі да дзеяння, якое датычыцца перш за ўсё «англійскай шпількі». Звычайнай жа «шпількай» можна толькі «ўкалоць» ці «прыкалоць». Прыметнік «прыкольны» — слова моладзевага слэнгу, якое мае значэнне «дасціпны, цікавы, смешны» і суадносіцца з «калоць», «прыкол». Таму па-беларуску павінна быць «прыкольны мабільны», і гэта не павінна нікога бянтэжыць.

Мовазнаўца ўпэўнены, што назвы гандлёвых марак і вырабаў, рэкламныя тэксты, разлічаныя на масавую аўдыторыю, павінны праходзіць абавязковую экспертызу ў спецыялістаў. Каб яны адпавядалі нормам. І гэта датычыцца не толькі беларускамоўных тэкстаў, з іншамоўнымі таксама часта здараюцца недарэчнасці.

— Тэксты, якія ствараюць моўны фон, павінны быць узорнымі і адпавядаць літаратурным нормам. Таму лінгвістычная экспертыза такіх тэкстаў абавязковая. І мы ніколі яшчэ не адмаўлялі прадпрыемствам у гэтым. У нас ёсць вопыт работы над рэкламай бытавой тэхнікі, напрыклад. Тэксты сапраўды становяцца больш мілагучнымі і ўспрымаюцца лепш. Аднак гэта тым не менш работа нашых спецыялістаў і для яе павінны быць нейкія фінансавыя падставы. Таму ў наступным годзе я планую абмеркаваць гэтае пытанне з кіраўніцтвам Мінгарвыканкама, каб працэдура экспертызы была нормай — афіцыйнай, адладжанай.

Што ж, усё ў жыцці павінна быць ураўнаважана... Збалансаванасці вам і гармоніі, шаноўныя чытачы, у новым годзе!

**Ала МАЧАЛАВА.**

### Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Для Шаляў настаў момант канструктыўных зменаў, а Цяльцам лепш трымаць язык за зубамі

**АВЕН.** Праявіце належную павагу да блізкіх людзей і сяброў, а яны ў адказ дапамогуць у рэалізацыі вашых мэтаў. Каб праблемы з дзелавымі партнёрамі не паўтарыліся, неабходна памятаць аб мінулых памылках. У чацвер можаце смела будаваць планы на будучыню. У нядзелю дамаўляцца з навакольнымі стане значна лягчэй.

**ЦЯЛЕЦ.** Спрыяльны момант для абдумвання і абмеркавання доўгатэрміновых планаў. У гэтай цяжкай справе дапаможа інтуіцыя. У аўторак нічога не адкладвайце на заўтра — лавіце спрыяльны момант. Пастарайцеся не даваць волю языку і ўважліва абдумвайце кожнае сваё слова.

**БЛІЗНЯТЫ.** Калі ўдасца сумясціць мяккую дыпламатыю, якая так неабходна на гэтым тыдні, з жорсткай метанакіраванасцю, ніякая цяжкасць перад вамі не ўстаіць. Пятніца можа стаць складаным і неадназначным днём: верагодна, вынік доўгай старанной працы будзе адмоўным. Але ўсё ж варта паспрабаваць дасягнуць сваёй мэты.

**РАК.** На пачатку тыдня на вас можа напасці беспрычынная сумота, але яна павінна рассеяцца сама па сабе, а калі праявіце цярпенне, то ёй не ўдасца спужаць вашу ўдачу. Адзінае, чаго ўсур'ёз неабходна асцерагацца, — гэта пільнай увагі начальства, асабліва ў пятніцу. У другой палове тыдня лепш рухацца маленькімі крокамі, прытрымліваючыся спосабу дзеянняў, які не выклікае сумненняў.

**ЛЕЎ.** Аднастайнасць тыдня можа злёгку нашкодзіць. Пастарайцеся не засмучацца — інакш можаце не заўважыць усмешкі фартуны. Падумайце аб павышэнні ўзроўню адукацыі. У канцы тыдня пастарайцеся як мага больш паважліва размаўляць з начальствам: не варта дазваляць сабе нават намёку на свабоду адносінаў, нават калі звычайна вы размаўляеце больш чым вольна.

**ДЗЕВА.** Апроч вырашэння доўгатэрміновых працоўных пытанняў можна чакаць і з'яўлення новых прафесійных планаў. У другой палове тыдня можа з'явіцца шанц перайсці на больш перспектыўную і высокааплатную працу. У чацвер верагодна сустрэча з людзьмі, якія вельмі важныя для вас ў прафесійным плане: пастарайцеся паводзіць сябе стрымана — і атрымаеце выгадную прапанову.

**ШАЛІ.** Пастарайцеся дакладна высветліць, ці задавальняе вас тая роля, якую вы цяпер выконваеце? Калі не, то амаль без цяжкасцяў можаце ад яе адмовіцца. Азірніцеся па баках і без ілюзій паглядзіце на сваё жыццё, бо настаў момант канструктыўных зменаў. Пастарайцеся дабіцца таго, чаго хочаце, але рэалістычна разлічвайце свае сілы.

**СКАРПІЁН.** Паспяховасць цалкам залежыць ад таго, якія адносіны зможаце пабудаваць з уплывовымі людзьмі і прадстаўнікамі афіцыйных інстанцый. Атрымаецца заручыцца іх падтрымкай — лічыце, што ўсё ў парадку. Могуць узнікнуць цяжкасці з-за таго, што даводзіцца ажыццяўляць рашучыя меры і пераканаць многіх у іх неабходнасці.

**СТРАЛЕЦ.** Можаце раскрыць свае здольнасці і творчы патэнцыял, ярка і таленавіта праявіць сваю натуру. Удача будзе спадарожнічаць у многім. Цалкам верагодна, што вас можа чакаць змена месца працы. А калі не хочаце нічога мяняць, вас будзе чакаць маса неадкладных спраў. Адчуеце прыліў сілаў і актыўнасці, таму справіцеся з усякай працай, за якую возьмецеся.

**КАЗЯРОГ.** З'явіцца шанц для паспяховай самарэалізацыі на працы. Каб дабіцца пастаўленай мэты, ёсць сэнс аб'яднаць намаганні з калегамі. Надышоў час задумацца аб рэалізацыі жаданняў. Поўнае ўзаемаразуменне будзе панаваць у адносінах з блізкімі.

**ВАДАЛЕЙ.** Будзеце схільныя да спантанных дзеянняў. Гэта можа крыху перашкаджаць, аднак вам будзе спадарожнічаць удача. У сераду проста неабходна накіраваць вашу магутную энергетыку ў стваральнае рэчышча. Чацвер спрыяльны для звароту да начальства з просьбамі і прапановамі.

**РЫБЫ.** Высокая працаздольнасць, добрае самаадчуванне і выдатны настрой стануць гарантыяй поспеху ў многіх галінах дзейнасці. У аўторак не варта нагадваць начальству пра свае дасягненні — вашы намеры могуць няправільна патлумачыць. Пастарайцеся не аддаляцца ад калег, бо ў гэтай сітуацыі лепшым рашэннем будзе калектыўнае.

Віншуем з **55-годдзем Мікалая Аляксеевіча ЛАГУНА**. Зычым моцнага здароўя, шчасця, доўгіх гадоў жыцця.
**Маці, брат, сястра,** *г. Мінск.*

Віншуем любую матулю Аляксандру Андрэеўну Махонька з днём нараджэння. Зычым бадзёрага настрою, доўгіх гадоў жыцця. Дзякуй табе, матуля, за ўсё добрае, што ты нам дала.
**Любячыя дзеці,** *в. Падлессе.*

Віншуем паважанага і любага бацьку і дзядулю **Іпаліта Іванавіча ГАЦІЛУ** з **75-годдзем**. Жадаем моцнага здароўя, дабрабыту і бадзёрага настрою.
**З любоўю жонка, дзеці, унукі.**
*в. Малева.*

Віншуем **Таццяну Дзянісаўну ШАВЯЛЕНКА** з юбілеем. Жадаем шчасця і здароўя, радасці і поспехаў у справах.
**Сяброўкі,** *г. Новалукомль.*

Навагодні сюрпрыз

# Наша звяздоўская сям'я!

## Як карэспандэнты «Звязды» працавалі навагоднімі паштальёнамі

**Новы год на тое і новы, каб пачынаць яго з нечаканага і нечаканага. Са старым жа прынята развітвацца добрымі справамі і падарункамі. Газета «Звязда» вырашыла не заставацца ў баку ад традыцыі і таксама зрабіць падарунак для сваіх падпісчыкаў. Рэдакцыйны Дзед Мароз і Снягурка завіталі ў пасёлак Міханавічы.**

Пасёлак Міханавічы мы выбралі невыпадкова. Па словах загадчыцы Мінскага аб'яднанага цэха паштовай сувязі Алены Аляксандраўны Ішчук, менавіта тут месціцца адно з лепшых паштовых аддзяленняў раёна.

У Міханавічы мы адправіліся з самага ранку. Разам з Аленай Аляксандраўнай на паштовай машыне з двума мяхамі газет і календароў. І ўжо праз паўгадзіны нас пазнаёмілі з Марыяй Васільеўнай Таранавай, міханавіцкай паштальёнкай. «За трыццаць тры гады, якія я адпрацавала тут, мяне ўжо ўсе сабакі ведаюць», — смяецца Марыя Васільеўна. Жвавая, гаваркая жанчына апранае паштовую сумку і вядзе нас па сваім звыклым маршруце...

**ДЗЕ МЫ ЕДЗЕМ, ДЗЕ МЫ ЙДЗЁМ...**

Чыгунка Мінск—Асіповічы раздзяляе пасёлак на дзве часткі, утвараючы нешта накшталт «мікраёнаў»: да пераезду і пасля. Жыве тут каля 3000 чалавек, ёсць школа, два дзіцячыя садкі, цэнтр моладзі, свой клуб, некалькі крамаў, маецца бібліятэка. Жыхары пасёлка працуюць, у асноўным, у сталіцы; у саміх Міханавічах працу можна знайсці на МУМГ ААТ «Белтрансгаз» альбо ў РУСП «Саўгас Лошыца».

«Людзі тут добрыя, ды і з падпіскай нядрэнна», — уводзіць у курс спраў Марыя Васільеўна, пакуль мы дабіраемся да першых чытачоў. Увогуле

# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР 2009

**Народны каляндар беларусаў — гэта сістэма сталых ці рухомых святаў, прысвяткаў, абрадаў, гульняў, звычаяў, што замацаваны ў быце і фальклоры праз спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх кампанентаў; уключае традыцыйныя арыенціры (хранонімы) пераважна на сельскагаспадарчыя работы і адпачынкі ў гадавым, сезонным, месячным і іншых цыклах-рытмах; утрымлівае традыцыйныя феналагічныя, метэаралагічныя, аграномічныя, астранамічныя, астралагічныя і іншыя каляндарныя веды, атрыманыя пераважна шматгадовым вопытам.**

**У народным календары на 2009 год пададзены асноўныя святы і прысваткі з магчымымі кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі і г. д. Дні, якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. У праваслаўных яны замацаваны за старым, юліянскім календаром, што мае 13 лішніх дзён. Зорачкай /*/ пазначаны святы «рухомай» царкоўнай пасхаліі. У наступным, 2010 г., Вялікдзень (Пасха) у католікаў і праваслаўных супадаюць — 4 красавіка.**

*Алесь ЛОЗКА.*

## СТУДЗЕНЬ

**1. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — з 1700 г.

**6. Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Тры Каралі.*** Католікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі».

**7. Божае Нараджэнне.** Пачатак **Каляд-даў.** «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...». Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку. На Каляды праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).

**8. Зімовы пакроўчык, Маладзёны (Бабіны).** Часта вялі бабу-пупарэзніцу.

**9. Сцяпан.** «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».

**13. Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».

**14. Васілле. Новы год** паводле праваслаўнага календара. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».

**17. Марк.** Калі на Марка пакласці ў зямлю на кароткі час насенне морквы, то летам яно хутчэй прарасце.

**18. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** «Каляда ад'язджае».

**19. Вадохрышча (Кшчэнне).** «Святое Кшчэнне ваду ксціла.., свет ачысціла і ваду наверх пусціла». «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».

**20. Прывадохрышча** — заканчэнне Калядаў. Пачатак **Малой Вясельніцы** (да посту).

**24. *Аксіння.*** «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос.**

**25. Таццяна.** Свята студэнтаў. ***Павел.***

**31. Апанас, Гусінае свята.** Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

## ЛЮТЫ

**1. *Ігнат.*** «На святога Ігната зіма багата».

**2. *Грамніцы, Стрэчанне.*** «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца...».

**5. *Агата.*** Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».

**6. Аксіння Паўзіміца.** «На Аксінні мяце». ***Дарота.*** «На Дароце высахнуць хусты на плоце».

**11. Ігнат.** «Ігнат Грамніцам рад».

**14. Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя». ***Валянцін.*** Свята закаханых.

**15. Грамніцы, Стрэчанне.** «Зіма з летам сустракалася...», «На Грамніцы палавіна зіміцы».

**18. Агата.** Каровіна свята.

**22. *Пятро.*** «Калі на Пятра цёпла, зіма працягнецца да Вялікадня».

**23. Прохар.** «Ласі скідаюць рогі», «Прыйшоў Прохар ды Улас — скора вясна ў нас». ***Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай.

**24. Улассе.** Свята жывёлы. ***Мацей.*** «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз».

**25. *Серада Папяльцовая*** (пач. Вялікага посту ў католікаў). ***Лыся серада.** Праталіны-залысіны.

**26. Фаціння.** Заступніца ад хваробаў. ***Блакітны чацвер.** Тумановы дзень.***Валосы (Крывы чацвер).** Свята жывёлы.

**27. *Масляныя Дзяды, Дзедава пятніца.**

**28. *Дзедава субота (Бабы).** «Дзяды не зналі бяды, а ўнукі зазналі мукі».

## САКАВІК

**1. *Масленіца. Гуканне вясны.** Пачатак **Сырапуснага тыдня.** «Сей пшаніцу ва ўсю руку, калі Масленіца ў маладзіку».

**2. Фёдар Ціран.** Заступнік ад злодзеяў. ***Паласказуб.** Першы дзень Вялікага посту. Паласкалі зубы гарэлкаю.

**4. *Казімір.*** «Святы Казімір дровы сякець». ***Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, гулялі ў карчме і пераскоквалі цераз пень.

**7. *Зборава субота.** Абрад «споведзі дзежкі».

**8. *Зборніца (Ізбор).** Пачатак збору ў поле. «А святы Ізбор — бяжыць вада з гор».

**9. Янка, Паўраценне.** Мядзведзь паварочваецца ў бярлозе на другі бок. Назіралі за зімоўкай пчолаў.

**10. *Сорак пакутнікаў. Пліска (Прыска).*** «На святога Прыску праб'е лёд і пліска».

**12. *Рыгор.*** «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».

**13. Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.

**14. Аўдоцця Вясноўка. Гуканне вясны.** «На Аўдокі голы бокі». (1.03 Новы год у мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль).

**15. Хвядот.** «На Хвядота занос — усё сена знясе».

**17. Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў». *Вясенняе раўнадзенства.* Даўжыня дня — 11.58, усход — 6.20, захад — 18.18.

**18. Марка.** На Марка грак вяртаецца з выраю. *Вясенняе раўнадзенства.* Даўжыня дня — 12.03, усход — 6.17, захад — 18.20. Стары Месяц.

**19. *Язэп.*** «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту». «На Язэпа пагода — год ураджайны».

**22. Саракі.** Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. «Святыя Саракі ў поле саху валаклі».

**23.** *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі «красты». Абрад «жаніцьбы коміна».

**25. Рыгор.** «На Рыгора зіма ідзе ў мора». **Феафан.** Калі дзень пачынаецца з туману, то варта чакаць добрага ўраджаю лёну і канопляў. ***Дабравешчанне (Звеставанне).*** «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. Гуканне вясны. ***Серадапосце.** Выпякалі «красткі».

**30. Аляксей Цёплы.** «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою». Дзень рыбалова. Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** «Дзікая качка яйцом пахваліцца».

## КРАСАВІК

**1. Дар'я Вясенняя**. Адбельвалі палотны.

**3. *Пахвальная пятніца.** Мыццё дзежак.

**4. Васіль Сонечнік.** «Васіль Сонечнік ледзяшы са стрэх здымае». ***Пахвальная субота.** «У Пахвальную суботу і ўвесь тыдзень баяліся грымаць кроснамі, каб не грымеў гром».

**5. *Арына (Ірына).*** «На Арыну сей капусту ў рассадніках». ***Нядзеля Пальмова.** «Вярба б'е, не я б'ю».

**6. Камаедзіца.** Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пярэдадзень свята. Пачатак ***Вербнага, Белага тыдня.**

**7. Дабравешчанне.** «Дабравешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «стралы».

**8. Благуста.** «На Благусту сій капусту».

**9. Матрона.** «На Матрону шчупак хвастом лёд прабівае».

**12.*** ***ВЯЛІКДЗЕНЬ*** *(у католікаў).*

**13. *Чысты (блакітны) панядзелак.** Пачатак ***Белага (Вялікага, Страснага) тыдня.**

**14. Прабуджэнне хатніка. Мар'я.** На Мар'ю — разводдзі. ***Чысты аўторак.** «У Чысты панядзелак і аўторак не можна ў хаце трымаць чаго-небудзь нечыстага, бо на людзей і на говядо нападуць паршы».

**15. Палікарп.** Пачатак бясхлебіцы. *** Драўляная страсць.** Мылі ўсё драўлянае.

**16. Мікіта.** «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбакам».***Чысты чацвер.** У лазню. Абрад «мыцця дзежкі».

**17. *Чырвоная (Велікодная) пятніца.** Сеялі гарох.

**18. *Вялікая (Чырвоная) субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту.

**19. *ВЯЛІКДЗЕНЬ** (у праваслаўных). «Хрыстос уваскрос!» — «Сапраўды ўваскрос!». (У старажытнасці быў Новым годам /летам.)

**20. *Другі дзень Вялікадня.** Хадзілі валачобнікі. «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні дзень пагуляюць, а апошні дзень выпраўляюць».

**21. Руф.** Руф рушыць снягі. ***Войцах.*** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».

**22. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы, тыдзень.**

**23. *Вялікдзень мёртвых (Наўскі чацвер).** Наведвалі могілкі.

**24. *Юры (Ежы).*** **Анціп** — ахоўнік зубоў.

**25. *Марк.*** «Дождж на Марка, дык зямля як шкварка».

**27. *Радунічныя Дзяды.**

**28. Пуд.** Калі Руф рушыць снягі, то Пуд пугае. ***Радаўніца.** «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць».

**29. Арына.** «На Арыну сей капусту».

**30. Зосім** — ахоўнік пчолаў. **Андрыянава ноч.**

## МАЙ (ТРАВЕНЬ)

**1. Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».

**5. Ляльнік.** Свята Лялі — дачкі Лады.

**6. Юр'е.** Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «страла».

**7. Алісей.** «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». **Бабскія розбрыкі.**

**8. Марк. *Станіслаў.*** «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава».

**10. Ярылавіца.** Свята Ярылы.

**11. *Пранціш.*** Які дзень, такое і лета. Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві.

**13. Якуб.** «На Якуба грэе люба».

**14. Макарэй.** Абрады ля вады.

**15. Барыс.** Апякун поля і жывёлы.

**19. Антоній.** «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца дык і прадасца».

**21. *Ушэсце.*** Унебаўшэсце пана Езуса. Свята агляду жыта. **Іван Веснавы.** Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».

**22. Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. ***Алёна.*** «Сей лён на Алену — вырасце па калена». ***Градабойцы (Ледавіты дзень).***

**24. Макей.** «Мокра на Макея — і лета не прасушыць...» **Кірыла і Мяфод.**

**27. Сідары.** «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».

**28. Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом». ***Ушэсце.** Дзень агляду жыта. Абрад «стралы».

**29. *Магдалена.*** «Магдалена зязюльку прысылае».

**31. *Сёмуха, Сыход Св. Духа.*** Свята зелені. **Шэсць дзеў.** «Лён сей позні на Шэсць дзеў». **Канапелька Матруна.** «Канапелька Матруна ў зямлю махнула». **Фядот.**

## ЧЭРВЕНЬ

**3. Алёна, Ульяна.** Дзень лёну.

**4. Васіліск.** «Ад Васіліска і салавей блізка».

**5. Дзень Ефрасінні Полацкай.**

**6. *Сёмушныя Дзяды, Духавая, Зялёная субота.**

**7. Ян.** «Рой перад Янам — пчаляр бубеніць, а перад Янам — пчаляр дзе панам». ***Сёмуха (Тройца, Зялёныя святкі).** Культ продкаў і раслінасці. «Павяздзём Куста пад гай зялёненькі...»

**8. *Русальніца.** Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...»

**9. *Конскі Вялікдзень.** Свята коней.

**10. *Градабой (Серада Русаль).** Зацерагаліся ад граду. Здабывалі агонь з яселя.

**11. *Божае цела.*** ***Наўская Тройца.** Памінанне. ***Аблівіха.** Аблівіліся вадою, каб пайшоў дождж.

**13. Ерамей. *Антоній.*** «Антоні, аддай коні».

**14. Юстын і Харытон.** «Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён». ***Русальчыны розыгрыш.** Засцерагаліся русалак. ***Пятроўка** да 11 ліпеня. Пятроўка-галадоўка.

**18. *Дзевятнік.** Перавод уніятаў у праваслаўе.

**19. *Дзявятуха.** Свята ад навальніцы.

**20 і 21.** *Дзень астранамічнага сонцастаяння.* Даўжыня дня — 17:09, усход — 4:37, захад — 21:46. Маладзік.

**21. Тодар.** «На Тодара раса — канапель паласа».

**22. Кірыла.** На Кірылу з усяе моцы Зямля імкнецца да Сонца.

**23. *Купала.*** У старажытнасці – Новы год, прыпадала да дня сонцастаяння.

**24. *Ян Купальны.*** «Сонца грае».

**25. Анапрэй.** «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ». ***Дзясятнік.** «Дзесятнік гнаі возіць».

**26. Акуліна Грачышніца (Задзярыхвост). *Дзясятка.** Косы точыць. Жыта паспявае.

**28. Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс».

**29. *Пятрок.*** «Да Пятра зязюльцы кукаваці». «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілля — ападуць і два».

**30. *Данат.*** «Святы Данат коскі точыць, сянцо косіць».

## ЛІПЕНЬ

**5.** За тыдзень да Пятра садзілі рэпу на Смаленшчыне.

**6. Купалле.** Свята Сонца і кахання.

**7. Іван Купала.** «Учора была Купала, а сёння Іван».

**10. Самсон Сенагной. *Сем братоў.*** «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».

**12. Пятро.** Свята заканчэння Купалля. «Да Пятра дзеўка хітра, а на Пятры — хоць твар ёй падатры».

**13. Паўпятро.** Дзень талакі. **Сымон.**

**14. Кузьма і Дзям'ян.** Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям'ян сена грабе».

**17. Андрэй.** «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».

**18. Свята Месяца.** «Месяц гуляе».

**21. Казанская.** «Будзеш вазіць сена на Казанскую, то гумно да другое Казанскае не дастаіць». **Градавы дзень.** Засцерагаў ад нябесных стыхій, ад хваробаў вачэй і галавы. **Пракоп.** «Пракоп бок прыпёк».

**25. *Якуб.*** «На Якуба хлеба поўна губа», «Які Якуб да паўдня, такая да снежня зіма» .

**26. Гаўрылей. *Ганна.*** «Свята Ганна снапы кладзе».

**29. Афінаген.** Заціхаюць птушкі.

**31. Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Іллёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў, падрыхтоўкі да жніва. «Шыпілінка ў кузню ідзець сярпы зубіць».

## ЖНІВЕНЬ

**1. Макрыны.** «Калі ў дзень Макрыны дождж, то ўсё лета і восень будзе мокра, а калі суха, то восень сухая».

**2. Ілля.** Свята дажджоў і навальніц. «Ілля нарабіў гнілля», «Да Іллі ўсё і пад кустом сохніць, после Іллі — і на кусту не сушыць».

**4. Мар'я (Магдалена).** «Магдалена — вады па калена».

**6. Барыс і Глеб (Барыс Палікоп).** «На Глеба і Барыса хлеба напарыся і за раллю бярыся», «Святы Барыс снапы зносіць, святыя Ганны дамоў возяць».

**7. Ганны.** «Святыя Ганны бабкі стаўляюць». **Макар.** «Макар наліе ў рукаў».

**9. Палікоп.** Дзень жніва. **Панцеляймон.** Лекар ад хваробаў галавы. «З Панцялея капуста пачынае ў качан завівацца», «Хто з Панцялея працуе, таму не пашанцуе».

**11. *Лаўрын.*** «На Лаўрына спяшай да млына».

**12. Сіла.** «Хто на Сілу жыта пасее, у таго на хлеб надзея».

**13. Спасаўскія запускі.** Пярэдадзень Спасаўскага посту.

**14. Макавей, Першы Спас, Мядовы Спас.** Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 28 жніўня.

**15. Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае». ***Прачыстая, Зельная.*** «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста».

**16. Антоны Віхравей. *Рох.*** «Кірмаш на паненак».

**17. Аўдоцця Сенагнойка.**

**19. Яблычны Спас.** Свята садавіны.

**23. Лаўрэн** — свята млынара.

**24. *Баўтрамей.*** «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».

**27. Міхей.** «Лёгкі вецер у гэты дзень — будзе пагодлівая восень, моцны — дажджлівая і халодная».

**28. Прачыстая.** Свята ўраджаю.

**29. Трэці Спас.** Свята хлеба. «Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе». ***Ян Сценцель.*** «Ян па лета прыйшоў і ўжо восень знайшоў», «А Ян Сценцель руней сцеліць».

**30. Міроны Ветрагоны.**

**31. Флор і Лаўр (Храл і Ягор'е).** Свята коней. «На Храла і Ягор'я ня ткуць і ня пашуць».

## ВЕРАСЕНЬ

**5. Лупа.** «Сей на Лупа — будзе жыта купа».

**7. Баўтрамей.** «Жыта на зіму сей».

**8. *Другая Прачыстая.*** «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».

**10. Мацей.** Абаронца ад п'янства.

**11. Калінавік (Іван Крываўнік).**

**13. Кіпрыян.** Журавель збіраецца ў вырай.

**14. Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». ***Узвіжанне.*** Закрыванне зямлі. **Бабіна лета** (і ў іншыя дні).

**19. Цуды (Міхал).** «Міхал з поля спіхаў».

**21. Багач (Нараджэнне Божае Маці).** Заканчэнне ўборкі зерневых. Засідкі.

**24. Тадора.** «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».

**25.** *Раўнадзенства. Дзень астранамічнай восені.* Усход —7:01, захад — 19:01. Малады Месяц, першая квадра.

**26. Стаўроўскія Дзяды.**

**27. Звіжанне.** Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі збіраюцца ў кучу.

**29. *Міхал.*** «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». **Сіцыян.** «Святы Сацыян да ляны пасцілаў».

## КАСТРЫЧНІК

**2. Зосім.** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.

**3. Астап (Астаф'я).** Прыкметы па ветры.

**4. *Пранцішак (Францішак).*** «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».

**8. Сяргей. Жалезны тыдзень.**

**9. Іван Шаптун (Іван Кураед, Багаслоў).** Шапталіся свахі пра нявестаў.

**14. Пакровы (Трэцяя Прачыстая).** Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы».

**21. Трыфан, Палагея.** «Трыфан кажух латае, Палагея рукавічкі вяжа». ***Зміцер.*** «Зміцер зямлю выцер, на грудзі пабіў, каб ніхто не хадзіў».

**25. Марцін** — свята млынароў. Млынары частаваліся на каменным коле гусяцінай.

**28. *Сымон і Юда.*** «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.***

**29. Лонгін.** Збавіцель ад хваробаў вачэй.

**30. Паклоны.** Адбівалі паклоны пакутніку Андрэю Крыцкаму.

**31. Лука.** Дзень іканапісцаў. «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». **Юльян** — ахоўнік дзяцей.

## ЛІСТАПАД

**1. *Усе святыя.***

**2. *Задушны дзень.*** Памінальны дзень.

**4. Казанская.** «Хто на Казанскую жаніхаецца, той не пакаецца».

**7. Змітраўскія Дзяды. Асяніны.** «Святыя дзяды, завём вас...»

**8. Зміцер.** «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.

**9. *Тодар.*** «На Тадора поўна камора».

**10. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.

**11. Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.***

**12. Артошка.** Пачатак прадзення.

**14. Кузьма-Дзям'ян.** Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.

**21. Міхайлаў дзень.** Абаронца ад грому. Мядзведзі ідуць у спячку.

**22. Матрона.** Становіцца зіма.

**22. Хвёдар Студзянец.** «Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».

**25. Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў. ***Кацярыны.*** «Кацярына забрала лета».

**27. Юстыніян. Піліп** — пярэдадзень Піліпоўскага посту (да 7 студзеня).

**28. Піліпаўка** — перадкалядны пост.

**29. *Адвент.*** Перадкалядны пост. **Мацей.** «На Мацея зіма пацее».

**30. *Андрэй.*** Дзявочае свята.

## СНЕЖАНЬ

**4. Увядзенне. *Барбара.*** «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла».

**5. Пракоп.** «Прыйдзе Пракоп хмуры — раскапае гуры». ***Савы.*** «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».

**6. Матрыхваны.** Не пралі. ***Мікола.***

**7. Кацярыны.** «Забрала край лета».

**9. Юр'е Зімовы.** Юра мосціць. ***Ганны.*** «Ад Ганнаў да Калядаў два тыдні і два дні».

**13. Андросы, Андрэйкі.** Варажылі.

**14. Навум.** «Навум наставіць на вум».

**17. Варвары.** «Мікола і Варвара ноч урвалі».

**18. Савы, Міколін бацька.** «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».

**19. Мікола Зімовы.** «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».

**22. Ганны.** «Ганкі — сядайце на санкі». *Зімовае сонцастаянне.* З 21-га па 23-га снежня – даўжыня дня 7:22, усход 8:28, захад 15:50.

**24. *Посная куцця.*** Пачатак Калядаў (да 6 студзеня).

**25.Спірыдон Сонцаварот. *Божае Нараджэнне.***

**26. *Сцяпан.*** «Кожны сабе пан».

**31. Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка». ***Багатая куцця. Сільвестр.***

Складальнік **Алесь ЛОЗКА.**

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Бернд ШТАНГЕ:

# «У ФУТБОЛЕ ЗАЎСЁДЫ ЁСЦЬ ШАНЦ. У НАШЫМ ВЫПАДКУ — ШАНЦ АЎТСАЙДАРА»

## *На пытанні нашых чытачоў адказаў галоўны трэнер каманды Бернд Штанге*



***(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 23 і 24 снежня.)***

***— Вялікі дзякуй за тое, што ўдалося ўбачыць у Мінску зборныя Аргенціны і Турцыі. Каго яшчэ плануеце запрасіць на спарынгі?***

**Юрый АДАМЕНКА,** *Мінск*

— Прыезд моцных зборных у Мінск — не мая заслуга. Я толькі папрасіў федэрацыю футбола арганізаваць гэтыя сустрэчы, нават усведамляючы пагрозу паражэнняў. Мы зноў працуем над тым, каб сустрэцца з моцным супернікам. Але гэта вельмі, вельмі складана! Наш прынцып — сказаць пра гэта тады, калі ёсць афіцыйныя дамовы, каб не будзіць у балельшчыкаў дарэмныя спадзяванні. Нэла дэ Марціна ў адным з інтэрв'ю ўжо сказаў, што мы можам згуляць з чэмпіёнамі свету. Гэта мара, але дамовы пакуль няма, і таму няма сэнсу пра гэта казаць.

***— Анры Хагуш, расійскі легіянер БАТЭ, выказаў жаданне выступаць за беларускую зборную. Якія крокі робіць федэрацыя ў гэтым накірунку і вы асабіста (калі, зразумела, зборнай падыходзіць гэты футбаліст)?***

**Уладзімір Генадзьевіч,** *Наваполацк*

— Хагуш быў найлепшым правым абаронцам у гэтым сезоне, ён лепшы, чым усе тыя, каго я запрашаў. Калі б у яго быў беларускі пашпарт, ён мог бы атрымаць шанц. Але найперш ён павінен самастойна прыняць рашэнне.

**ПРА БАТЭ:**

***— Ці наведвалі вы паядынкі БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў? Як вам футбольныя балельшчыкі? За БАТЭ, на мой погляд, хварэюць лепш. Як на ваш погляд?***

**Дзмітрый,** *Мінск*

— Дзмітрый, ты маеш рацыю. Нашы балельшчыкі праявілі сябе выдатна, і шкада, што не ўдалося атрымаць ніводнай перамогі. Але трэба быць справядлівымі: не толькі балельшчыкі БАТЭ паводзілі сябе адметна, балельшчыкі іншых клубаў таксама садзейнічалі незабыўнай атмасферы на «Дынама». Дарэчы, хачу зазначыць, што я ўвесь год жыву ў Мінску і бываю на ўсіх важных паядынках. І я заўсёды даступны для размовы.

***— Вы трэніравалі гульцоў розных нацыянальнасцяў. Чым вызначаюцца беларускія футбалісты?***

***Алег Уладзіміравіч КЛІМЕЦ,*** *Пружанскі раён*

— Нашы гульцы павінны стаць больш прафесійнымі і больш самастойна працаваць над сваім развіццём. Чаму ў нас у Беларусі больш няма спецыялістаў па штрафных — такіх як Дэль П'ера, Дыега, Жуніньё ці Зідан? Для гэтага трэба ахвяраваць многімі гадзінамі — як тэнісіст, які накіроўвае мяч дакладна, куды трэба. Хто займаецца гэтым? Я бачыў Зідана: уся каманда паехала дадому, а ён застаўся і пад дажджом адпрацоўваў удары яшчэ 45 хвілін. Без трэнера, сам збіраў мячы... У іншых краінах гульцы робяць гэта нярэдка, а ў нас звычайна толькі пасля трэнерскіх загадаў.

***— Вы працавалі ў зборных і клубах розных краін. З вашага пункту погляду, у чым сакрэт беларускага клуба з 5-мільённым бюджэтам, які так годна выглядаў у групавым этапе Лігі чэмпіёнаў?***

**Сяргей,** *Мінск*

— З бюджэтам у пяць мільёнаў ні адна каманда не можа працягнуць барацьбу ў Лізе чэмпіёнаў. Ніколі! Усе клубы з маленькімі бюджэтамі занялі ў сваіх групах апошнія месцы — «Клуж», «Базэль», «Анартосіс», БАТЭ. У рэшце рэшт багатыя клубы разыгрываюць трафей паміж сабой, а астатнія — толькі часам злуюць грандаў. Тры нічыйныя гульні ў групавым турніры — выдатнае выступленне для БАТЭ. Скажу шчыра, для мяне яно стала сенсацыяй года. Будзе складана паўтарыць гэты поспех налета.

***— Скажыце як трэнер нацыянальнай каманды, каму, на вашу думку, прыйшоў час паехаць з БАТЭ? А з гульцоў нацыянальнай зборнай, якія выступаюць у іншых беларускіх клубах? Ці ёсць сэнс ехаць у расійскую прэм'ер-лігу? А ў бундэс-лігу?***

**borisovfan,** *Мінск*

— Лепш за ўсё было б, калі б таленты заставаліся ў нас. Але для гэтага наша найвышэйшая ліга павінна стаць больш прафесійнай. Калі гэтага не адбудзецца, то гульцы спакусяцца вялікімі грашыма і паедуць гуляць у больш моцныя чэмпіянаты. Для мяне нармальна, калі яны там гуляюць. Наша праблема ў тым, што многія ад'язджаюць занадта рана, за мяжой не прабіваюцца ў аснову сваіх новых каманд і спыняюцца ў развіцці. У 20 гадоў яны ездзяць на шыкоўных машынах і лічаць, што гэта самае галоўнае! На мой погляд, маладым гулец перш за ўсё павінен кожны тыдзень выходзіць на поле. Тады грошы з часам з'явяцца самі па сабе.

***— Прачытаў ваш каментарый пасля першага матча БАТЭ з «Рэалам»: вы сказалі, што ў БАТЭ не было ніводнага шанцу. А ў іншых матчах яны былі?***

**Dimon111,** *Брэст*

— У футболе заўсёды ёсць шанц, у нашым выпадку — шанц аўтсайдара. У хатняй сустрэчы з «Ювентусам» былі шанцы на перамогу. Падчас ліку 2:0 Крывец не ўбачыў гульца, які знаходзіўся ў больш выгадным становішчы. Інакш лік быў бы 3:0. Але «калі б» у футболе, на жаль, не лічыцца.

***— Якія беларускія клубы, акрамя БАТЭ, маюць добры менеджмент і добрыя перспектывы?***

**І-пео,** *Мінск*

— Умовы ў нашых клубаў вельмі розныя, таму падчас ацэнкі і параўнання трэба быць справядлівым. У аднаго размова ідзе пра Лігу чэмпіёнаў, у другога — пра выжыванне. Але ў нас з'яўляецца ўсё больш здольных людзей у відзе спорту нумар адзін у свеце. Тое, што дзяржава і асобныя людзі зрабілі ў гэтай краіне за кароткі час для футбола, выклікае ў мяне, як у іншаземца, павагу. Пакуль гэтага яшчэ недастаткова, але ў гэтых людзей хапае і больш важных клопатаў, чым футбол.

**ПРА ФУТБОЛ У ЦЭЛЫМ:**

***— Ці лёгка працаваць з беларускімі чыноўнікамі з федэрацыі футбола?***

**mickell**

— Так, у нас добрая каманда, але мы маем патрэбу ў далейшым яе ўзмацненні. Я хаджу на працу з задавальненнем і імкнуся як мага больш вучыцца ў калег.

***— Якая зборная ўразіла вас на летнім чэмпіянаце Еўропы і гульня якой зборнай (клуба) падабаецца асабіста вам?***

**Дзмітрый,** *Нясвіж*

— Іспанцы ўразілі мяне яшчэ ў адборачным турніры. І футбольная філасофія майго сябра Арсэна Венгера з лонданскага «Арсенала» блізкая мне. Калі Фабіа Капэла кажа, што зборная Беларусі гуляе, як «Арсенал», то гэта камплімент у адрас футбалістаў. І яны павінны працягваць працаваць у гэтым напрамку.

***— Бачылі, як на матчы «Віцебск» — «Нафтан» вы здымалі на мабільны, як з поля вялі п'янага арбітра Шмоліка. Нічога падобнага раней бачыць не здаралася?***

**amatar,** *Наваполацк*

— Не, ніколі раней. І я не хацеў бы сутыкнуцца з чымсьці падобным у спорце. Да нядаўняга часу я верыў, што ён сур'ёзна траўмаваў спіну, іншай думкі ў мяне і не ўзнікала.

**ПРА АСАБІСТАЕ:**

***— У адной з газет прачытала, як вы хадзілі на Камароўскі рынак. Па-ранейшаму робіце там пакупкі?***

**Tanusha,** *Мінск*

— Так, Танюша, я жыву побач, і мне падабаецца тамтэйшая атмасфера і прыгожыя прадаўшчыцы на рынку...

***— Ці ёсць у вас хатняя гаспадыня і хто дапамагае па гаспадарцы?***

**Alla,** *Салігорск*

— Не, я ўсё раблю сам — мыю, прасую, пыласосу. Ну, часам, калі я вельмі заняты, прыходзіць Іна з нашай федэрацыі, і пасля гэтага ўсё выглядае ўвогуле бліскуча!

***— Якія падарункі прывезяце дадому з Мінска? Што падарыце на Каляды жонцы? Куды плануеце адправіцца на Каляднья канікулы?***

**Tanusha,** *Мінск*

— Танюша, ты пытаеш пра асабістае. Але я адкажу: асабліва ўсім падабаецца ікра, не ведаю, чаму. Але яна дастаткова дарагая. Акрамя гэтага прывожу толькі дробязі з Мінска. Паколькі я жыву ў Беларусі круглы год, то павінен наведаць усіх сваякоў. Пасля Новага года паеду з сынамі Марцінам і Міхаэлем катацца на лыжах. Але буду асцярожным, каб нічога не здарылася!

***— Ужо прызвычаіліся да нашага клімату?***

**Аляксандр ГЛУШАКОЎ,** *Пінскі раён*

— Усходняя Германія не надта адрозніваецца ад Мінска сваім клімату. Я не адчуў той беларускай зімы, якой баяўся. Магчыма, уся справа ў змяненні клімату.

***— Як бавіце ў Мінску вольны час: тэатр, кіно, кавярня, начныя клубы?***

**Анатоль,** *г.Мінск*

— У мяне амаль няма вольнага часу. Рэдка заходжу ў рэстаран ці кавярню, яшчэ ні разу не быў у бары ці казіно. У дні матчаў я з задавальненнем выязджаю ў гарады, дзе яны праходзяць, і знаёмлюся з тымі мясцінамі. Часта культурная праграма ўключае наведванне музеяў. Такім чынам пазнаеш краіну і людзей. Наведванне вясковай лазні бясконца мяне ўражвае! З гарадоў асабліва спадабаліся Гродна і Віцебск.

***— Ці водзіце аўтамабіль і ці ездзіце ў Беларусі за рулём? Як вам беларускія вадзіцелі ў параўнанні з нямецкімі, багдадскімі, кіпрскімі?***

**Анатоль,** *Мінск*

— Разам з маім асістэнтам мы дзелім маленькі патрыманы «Мерседэс» класа С, добрая эканомная брычка. Вадзіцелі ў Мінску маглі б быць больш уважлівымі, яны занадта часта настойваюць на сваіх правах, не саступаюць дарогу там, дзе патрэбна. Тут, у Германіі, ваджэнне дастаўляе большае задавальненне. Але ва ўсім свеце няма вадзіцеляў горшых, чым у Іраку і на Кіпры.

...Аднойчы я ехаў занадта хутка і быў спынены, і мне стала сорамна. Я — госць, іншаземец і не дапушчу больш такога. Тым больш, што штраф быў больш чым прыстойны...

**Прамую лінію правяла Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.26 | 16.05 | 7.39 |
| Віцебск — | 8.23 | 15.47 | 7.24 |
| Магілёў — | 8.16 | 15.55 | 7.39 |
| Гомель — | 8.05 | 15.59 | 7.54 |
| Брэст — | 8.40 | 16.21 | 7.41 |
| Гродна — | 8.33 | 16.30 | 7.57 |

**Месяц**

***Першая квадра.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Клаўдзіі, Яўгеніі, Мікалая, Сяргея.*

***К.*** *ТРЫ КАРАЛІ. (Вадохрышча — Аб'яўленне Пана).*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**НАДВОР'Е на заўтра**

**Неспрыяльныя дні і гадзіны ў студзені**

**7, серада, 5.00—17.00**
**9, пятніца, 5.30—17.00**
**11, нядзеля, 3.30—16.30**
**13, аўторак, 5.30—17.30**
**15, чацвер, 13.30—21.30**
**18, нядзеля, 1.30—5.30**
**20, аўторак, 2.30—16.30**
**22, чацвер, 15.30—23.00**
**23, пятніца, 0.00—5.00**
**25, нядзеля, 8.00—18.00**
**27, аўторак, 16.00—24.00**
**28, серада, 0.00—5.00**
**30, пятніца, 8.30—14.30**

## Дзве даты

## 6 студзеня

**1323 год** — 685 гадоў таму, у час княжання Гедыміна, горад Вільня (летапісны Крывіч-Горад ці Крывы Горад) быў аб'яўлены новай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага. Як сталічны горад з замкам і вялікакняжацкім палацам Вільня ўпершыню згадваецца ў мірным дагаворы ВКЛ з Лівонскім ордэнам і горадам Рыгай.

**1681 год** — адбыўся першы зафіксаваны матч па боксе: у паядынку сышліся двое англічан — дварэцкі і мяснік герцага Альбемарльскага. Хто з іх стаў пераможцам — гісторыя замоўчвае.

## Цытата дня:

***«Варта было б пастаянную бяздзейнасць змясціць сярод пакутаў пекла, а яе змясцілі сярод асалодаў раю».***

**Шарль Луі Мантэск'ё (1689-1755), французскі асветнік і філосаф.**

# ПАЧАТАК КАЛЯДАЎ, ПЯРЭДАДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ХРЫСТОВАГА. ПЕРШАЯ, ПОСНАЯ, БЕДНАЯ, ГАЛОДНАЯ, ВЯЛІКАЯ КУЦЦЯ

**Святкаванне Калядаў пачыналі ўвечары 6 студзеня святочнай вячэрай, якая носіць назву «першай, познай, беднай, галоднай» куцці (ад назвы рытуальнай стравы). 7 студзеня ва ўсіх падворках чакалі прыходу «калядоўшчыкаў». Увечары 13 студзеня адзначалі «другую, шчодрую, багатую, тоўстую» куццю, сустракалі Новы год (па старым стылі). Раніцай 14 студзеня адбываліся «засеўкі» — чарговы абрадавы абыход 12-гадовымі падлеткамі ўсіх падворкаў з пажаданнямі выгадаваць добры ўраджай збожжавых культур. Нарэшце, увечары 18 студзеня святкавалі трэцюю «посную, галодную, хрышчэнскую» куццю. Заканчваліся Каляды 21 студзеня.**

● Пярэдадзень Калядаў — гэта момант незвычайнага эмацыянальнага стану, святочнага настрою. Уся сям'я рыхтавалася да свята. Хто і дзе б ні знаходзіўся, абавязкова спяшаўся да гэтага дня вярнуцца дадому. Сэнс гэтага жадання зразумелы: калі ў першы дзень Калядаў усе будуць дома, то і на працягу ўсяго года сям'я будзе разам; калі ж хтосьці не змог апынуцца дома, то меркавалі, што ў гэтым годзе ён можа пакінуць сям'ю назаўсёды.

● Каб увесь год у доме былі парадак і чысціня, трэба было ўсё прыбраць: шкрэблі сталы, лавы, падлогу, чысцілі печ, мянялі сеннікі.

● У хрысціянскай традыцыі лічыцца, што аб часе і месцы нараджэння Ісуса Хрыста валхвам паведаміла Віфлеемская зорка, якая ўзышла на небасхіле з наступленнем цемры. Менавіта таму святочная вячэра пачыналася ўвечары са з'яўленнем першай зоркі і праходзіла ў строгім маўчанні.

● Яшчэ адна акалічнасць пачатку святочнай вячэры сведчыць аб збліжэнні дзвюх культур — народнай і праваслаўнай. Як вядома, Ісус Хрыстос нарадзіўся ў авечніку і першай яго калыскай былі яслі з сенам. Таму неад'емным атрыбутам сервіроўкі святочнага стала быў невялікі стос сена. Яго тонка сцялілі на стале, а зверху засцілалі абрус.

● Нараджэнне Хрыстова не сустракалі ў паўсядзённым адзенні. Лічылася, што гэта і надалей будзе правакаваць беднасць. Таму адзенне павінна быць новым. Не пажадана было апранаць адзенне цёмных колераў.

● Нашы продкі верылі, што апоўначы на свята Нараджэнне Хрыстова расчыняюцца Нябесныя вароты і на зямлю сыходзіць Сын Божы. І таму ў гэты час можна прасіць Госпада аб выратаванні ад хваробаў і сваіх грахоў. Усё, аб чым чалавек моліцца ў гэту ноч, абавязкова спраўдзіцца, калі роўна а 12-й гадзіне ночы выйсці на двор і тройчы паўтарыць сваю просьбу, гледзячы ў неба.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

— У нас самы экстрэмальны месяц — студзень. Новы год, Каляды, Стары новы год...

— А навошта нам Стары новы год?

— Гэта кантрольны — у печань!

☺

**Завяршыўся чэмпіянат міру па прагнасці. Залатыя, срэбныя і бронзавыя медалі было вырашана нікому не ўручаць.**

☺

— Я ўчора быў у пяцізоркавай гасцініцы, а там ўсе фіранкі падраныя!

— Вась, гэта жалюзі...

☺

**Нядаўна быў выпушчаны новы студэнцкі будзільнік. Першыя 10 хвілін ён проста звоніць, наступныя 5 прайгравае гук ракетнага рухавіка перад стартам, апошнія 2 — мацюкаецца голасам дэкана факультэта. Статыстыка паказала, што большасць студэнтаў прачынаюцца ў апошнія 2 хвіліны.**

# «САБРАЦЦА ЗА АДНЫМ СТАЛОМ...»

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 31 снежня.)*

***Напярэдадні новага года мы сустрэліся з Іванам Іванавічам КРУКАМ і Аксанай Веньямінаўнай КАТОВІЧ за кубачкам кавы і паспрабавалі агульнымі намаганнямі адказаць на «пазаштатныя» пытанні нашых чытачоў.***

**— Зараз многія імкнуцца не «наваражыць», а «прыважыць» мужчыну ці жанчыну. Ці можна прыважыць — і быць шчаслівым? Як вы да гэтага ставіцеся?**

**І.І.:** — З падобнымі просьбамі — аб прывароце — да мяне звяртаюцца пастаянна. Але я адмаўляю такім людзям, бо іх просьбы ідуць не ад розуму, а ад эмоцый. Калі адносіны «далі трэшчыну», а хочацца прывязаць, не адпусціць, насаліць — успамінаюць пра прыварот. У гэту гульню я не гуляю, хоць паўплываць на жыццёвую праграму чалавека шляхам варажбы можна, гэта дзейнічае.

**А.В.:** — Але я зноў хацела б папярэдзіць: калі вы прыважылі да сябе мужчыну, ёсць вялікая рызыка таго, што вашы дачка ці сын не напаткаюць сваю «другую палавінку». Вы ўжо «выпрасілі», і тым «забралі» гэта шчасце... Увогуле лічыцца, што прыварожаны жывіцца энергіяй таго, хто яго прыважыў. А ад гэтага ў вас могуць надарыцца хваробы. Таму перш чым займацца прываротам, ураўнаважце спачатку эмоцыі, а потым прымайце рашэнне.

**— Вас часта запрашаюць у вялікія кампаніі весці святочныя застоллі... На ваш погляд, ці ўмеюць беларусы весяліцца?**

**І.І.:** — Вы закранулі балючы момант. Мне даводзілася бываць па справах у Эстоніі, Карэліі, Польшчы, Арменіі... І я заўсёды па-добраму зайздросціў тамтэйшым жыхарам. Калі армяне заспяваюць сваю народную песню, будзьце ўпэўненыя, ніхто не саб'есца. Калі венгерскія мужчыны пакладуць рукі адно аднаму на плечы і пачнуць танцаваць чардаш — хочацца таксама пусціцца ў скокі... А вось калі трапіш на наша вяселле, то ў лепшым выпадку пачуеш куплет-другі з рэпертуару «Сяброў». А госці весяляцца пад рускамоўныя і англамоўныя хіты... Я разумею, што мы ўсё яшчэ цешымся, адкрываючы для сябе замежную культуру, але ўжо час і нацешыцца. Заўсёды пытаюся ў людзей, якія прыехалі з Чэхіі, Іспаніі, Італіі: вось вы прывезлі адтуль ураджанні, а самі чым узбагацілі гэту краіну?..

**А.В.:** — Некалі самымі галоўнымі на вяселлі былі сваты — людзі, якія ўмелі «ладзіць» свята. Сёння галоўны ў рэстаране — тамада, які не нясе ніякай адказнасці за свае словы. А родных і сваякоў турбуюць тры пытанні: колькі замоўлена страваў, як сервіраваны стол і дзе знаходзяцца гардэроб і прыбіральня... Матуля чытае віншаванні, напісаныя на паштоўках, а бацька (у лепшым выпадку) дадае: «Я далучаюся да слоў маці».

**І.І.:** — Наша традыцыйнае вяселле ладзілася ў першую чаргу для роду, для радзіны, маладыя былі на дзесятым месцы... Сёння вяселле ладзіцца для маладых, каб паказаць ім відовішча, прыдумаць нешта такое, чаго не было ў суседзяў. А бабуляў і дзядуляў многія ўвогуле не запрашаюць: маўляў, што ім там рабіць? У мяне нават прыказка ёсць — пакажыце мне ваша вяселле, і я скажу, як доўга пражывуць разам маладыя. Настрой, «задзел» не павінны «ісці» ад вядучага — неабходна, каб іх стварала сям'я, родныя, бабуля з дзядулем, каб была пераемнасць...

**— Вы даўно вывучаеце народныя традыцыі, лад жыцця і спосабы духоўнага выжывання продкаў... Веды «памнажаюць смутак» ці наадварот, дапамагаюць?**

**І.І.:** — Я пачынаў вучыцца гэтаму з дзяцінства, паступова, таму ніякага страху не было і няма.

**А.В.:** — У якасці адказу раскажу гісторыю, якую мне распавяла адна жанчына... Пасля вяселля перад першай шлюбнай ноччу яны з мужам вырашылі зняць заручальныя пярсцёнкі і пакласці іх на палічку ў іншым пакоі. А раніцай пярсцёнкаў там ужо не было. Знайшліся яны... у печы, у попеле. Тады бабуля ёй патлумачыла: нехта з гасцей не хоча, каб вы былі разам... Я спытала ў той жанчыны: колькі ж вы пражылі з мужам? Аказалася, 15 гадоў. І працягваюць жыць. А дапамагло гэтай сям'і менавіта веданне таго, што нехта не жадае ім добрай долі. «Як толькі мы з мужам пачынаем сварыцца, я адразу цічэнька шапчу: не дачакаецеся!», — сказала яна. Папярэджаны — значыць, узброены.

**— Чаго б вы ніколі не сталі рабіць у сваім жыцці?**

**А.В.:** — Не хочацца, каб чытачы падумалі, што мы нейкія адметныя... У жыцці ўсё магчыма, а мы — звычайныя людзі. Але ёсць у нас з Іванам Іванавічам агульная рыса: мы ніколі нікому не зайздросцілі. Што даецца, з тым і жывём, і будзем жыць. А яшчэ з нашага ўжывання выключаны выказванні накшталт: «я ненавіджу гэтага чалавека». Нават у сэрцах нельга такое гаварыць.

**— Падкажыце, як узняць настрой самому сабе?**

**І.І.:** — Не так даўно мы былі ў Кіраўскім раёне, запісвалі калядныя карагоды. Уразіла тое, як лёгка танчаць 70-гадовыя людзі. Нават не танчаць, а плывуць над зямлёй. Трэба ўмець слухаць самога сябе, не скарацца нягледзячы ні на што, умець... хадзіць з падскокам. Прачнуліся раніцай — падзякуйце Госпаду за тое, што падарыў яшчэ адзін дзень. Усміхніцеся, пастаўце свечку за здароўе чалавека, які вас... раззлаваў. І тады, праходзячы па лабірынтах жыцця, вы будзеце бачыць усмешкі і атрымліваць падзякі.

**А.В.:** — Мы шмат ездзім па Беларусі, а хочацца ездзіць яшчэ і яшчэ. Карыстаючыся выпадкам, хочам перадаць прывітанне ўсім знаёмым і незнаёмым людзям — і ў Лепельскім раёне, і ў Дзяржынскім, і ў Кобрынскім, і ў іншых. Запрашайце нас да сябе, да незвычайных людзей, да рэдкіх камянёў, прыгожых крыніц — туды, дзе захавалася нешта такое, чаго больш няма нідзе на Беларусі. Нізкі паклон людзям за тое, што вучаць.

**Гутарыла Наталля КАРПЕНКА.**

Надта інтымна

# ЭРАТЫЧНАЯ РАДАСЦЬ, або Спакусіце ўласнага мужа

***Сэксолаг Мінскага абласнога псіханеўралагічнага дыспансэра Дзмітрый КАПУСЦІН, дае некалькі агульных карысных тлумачэнняў адносна надта інтымнай сферы жыцця.***

*(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 31 снежня.)*

**— Напэўна, праблема можа заключацца і ва ўзаемапрыцягненні людзей з рознай сэксуальнасцю... Якім чынам трэба разглядаць сэксуальнасць? З чаго яна складаецца?**

— У сэксалогіі вылучаюць тры тыпы палавой канстытуцыі чалавека — моцная, сярэдняя і слабая. Гэта аснова сэксуальнасці кожнага з нас. Аднак апошнюю фарміруюць не толькі фізіялагічныя асаблівасці, якія мы атрымалі ў спадчыну ад бацькоў. Важны і элемент выхавання, у тым ліку палавога. Сэксуальнасць фарміруецца літаральна ў першы год жыцця дзіцяці. Ідэальна, калі маці аддае ласку, любоў, увагу, час свайму дзіцяці. Апошняе аўтаматычна «ўсведамляе», што гэта такое, а заадно вучыцца перадаваць гэту ласку, любоў, увагу канкрэтнаму чалавеку — спачатку маці, потым бацьку, затым канкрэтнаму прадстаўніку процілеглага полу. Калі ж дзіця «пераканалася», што яно не патрэбна маці, калі тая толькі корміць і больш не падыходзіць — не лашчыць, не дакранаецца, не спявае песенькі, не гуляе, то такое дзіця будзе любіць усіх, нікому не верыць і лёгка пакідаць партнёраў...

Я некалі пісаў у адной са сваіх кніг пра Казанову. Джакома, як вядома, — сын французскай актрысы, якая літаральна на трэцім месяцы пасля нараджэння сына зразумела, што ёй патрэбна сцэна, і аддала хлопчыка сваёй маці, у іншы раён Францыі. Бабуля ў хуткім часе перадала дзіця стрыечнай цёткі... Казанова пісаў: «Так гэтыя самыя любімыя жанчыны пазбавіліся мяне...» Потым ён усё жыццё шукаў той любові, якую яму не дадалі. У яго, дарэчы, не было маладых палюбоўніц — як правіла, гэта былі дамы сярэдняга ўзросту. Казанова кахаў, быў шчырым у сваім каханні, але сам нікому не верыў. Адсюль яго варыянт сэксуальнага жыцця — 2,5 тысячы палюбоўніц. Такі варыянт можа назірацца ў дзяцей, якія не атрымалі належнай любові ад маці.

Таму перад тым, як гаварыць пра нашу вернасць, адданасць аднаму партнёру, трэба мець на ўвазе, што было закладзена ў нас роднай матуляй. Дзіця, якое ведае, што яго любіць маці, у 1,5-2 гады павінна, што называецца, сесці ёй на галаву. Бо разумее — бацька, дзед могуць быць строгімі, а маці — заўсёды любіць. Чалавек, які адчуў на сабе матуліну любоў, атрымаў тую аснову, якая потым дазволіць яму любіць яшчэ кагосьці. Калі гэтага не будзе, дзіця будзе камунікабельным — з усімі сябраваць, але... не будзе здольным нікога выбраць. Як з ім лёгка «развіталіся», так і яно лёгка будзе развітацца.

**— Чаму могуць прыцягнуцца адно да аднаго людзі з рознымі сэксуальнымі жаданнямі і магчымасцямі?**

— Што ж, здараюцца памылкі... Большасць людзей адчуваюць «свайго» партнёра. І нараджаецца гэта адчуванне з першай сустрэчы. Мы адразу бачым тэмперамент чалавека, паступова знаёмімся з яго стаўленнем да тых ці іншых рэчаў, яго светапоглядам, нарэшце, поглядам на сэкс. І калі партнёрка, скажам, не любіць прыціскацца, цалавацца, але трывае ўсё гэта, то можна меркаваць, што яна разглядае мужчыну як добрую партыю, або проста ёй «трэба выйсці замуж». Цалкам відавочна, што з эратызмам і здавальняючым сэксам у названай пары будуць праблемы.

Калі рашэнне аб цесным збліжэнні, пражыванні пад адным дахам прымаецца на ўзроўні розуму, без эратычнага жадання, развіць сэксуальнасць надзвычай складана. Для сэксуальнай гармоніі ў згаданай пары ад мужчыны спатрэбяцца доўгія гады цярпення. Яму трэба будзе прыкладаць вялікія намаганні і спадзявацца, што калі-небудзь «плаціна прарвецца»... Як правіла, партнёраў з рознай сэксуальнасцю хапае на 3-4 гады прыціркі, пасля чаго адносіны разрываюцца.

**— Значыць, вы не раілі б уступаць у шлюб без эратычнага жадання?**

— Не раіў бы.

**— А без дашлюбнага сэксу?**

— А платанічнае каханне — гэта таксама сэкс. На фоне платанічнага прыцягнення аднойчы абавязкова з'явіцца патрэба ў ласках — так званы «смутак цела», на падставе якога потым і сфарміруюцца сэксуальныя адносіны. Французы кажуць, што закладзеная ў нас сэксуальнасць раскрываецца менавіта на этапе аддачы ласкам. А яшчэ замежнікі ўпэўненыя, што жаночая сэксуальнасць раскрываецца ў руках толькі каханага чалавека. І тое, што ў мужчын ніжэй поясу, абсалютна ні пры чым. Як толькі жанчына адчула, што можа даверыць мужчыну сваё цела, як толькі аддалася яго ласкам, у галаўны мозг паступае адпаведны зарад. Там, у пэўных аддзелах мозгу, і адбываецца «перавод» ласкі ў аргазм. Вось чаму, калі жанчыну лашчыць нелюбімы чалавек, калі яна проста «трывае», гэтыя аддзелы застаюцца ў глыбокім сне. Праўда, з узростам жанчына можа перажыць аргазм у любым выпадку. Змена гарманальнага фону ў 35-40 гадоў здольная прывесці жанчыну да сэксуальнай цягі. Нават калі яна не будзе ў гэты час жыць палавым жыццём, у яе будуць аргазмы ў сне — у сярэднім 3-4 разы ў год. Гэты час лічыцца росквітам жаночай сэксуальнасці.

**— Вы калісьці сцвярджалі, што з пункту погляду ідэальнага сэксу найлепшым чынам спалучаюцца «дарослыя» жанчыны і юныя мужчыны. І адпаведна юныя дзяўчаты з «дарослымі» мужчынамі...**

— Гэта таму, што жаданне, якое ўзрастае ў жанчын бліжэй да 35-40 гадоў, іх сэксуальны максімум здольныя рэалізаваць толькі 25-гадовыя прадстаўнікі моцнага полу. А што датычыцца мужчын ва ўзросце, то маладыя жанчыны спрыяюць падаўжэнню мужчынскага эратызму.

**— Добра ўладкаваліся...**

— А інакш навошта ўся гэта жаночая індустрыя прыгажосці — касметыка, салоны, жаданне ў любым узросце выглядаць сэксуальна? За 35 гадоў маёй практыкі я не сустрэў яшчэ мужчыну, які атрымаў бы сэксуальнае ўзбуджэнне пасля таго, як даведаўся, што жонка абараніла доктарскую дысертацыю. Не бывае такога!

**— Вы сказалі «выглядаць сэксуальна»... Што гэта азначае?**

— Тут лепш гаварыць пра сэксапільнасць. Калі быць дакладным, то эратычная прывабнасць уяўляе сабой сукупнасць манеры паводзінаў і знешняга вобліку індывідыума. У англаамерыканскай літаратуры прыжыўся менавіта тэрмін «сэксапільнасць», які таксама азначае сэксуальны заклік, сэксуальна ўзбуджальны тып паводзінаў. Акрамя таго, існуе жаргоннае ласкавае культавае слова «сэксі» — значыць, той, хто валодае эратычнай прывабнасцю, куды ўваходзяць адзенне, прычоска, жэсты і г.д. Абсалютная большасць сучасных жанчын лічыць, што сэксуальная прывабнасць найбольш выражаная ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў.

**— Усім трэба быць сэксапільнымі?**

— «Трэба» — не зусім дарэчнае слова. Гэта залежыць ад шэрагу момантаў. Калі вы думаеце, што можаце застацца ў баку ад гэтага паняцця, запытайце ў сябе: навошта вы робіце макіяж, набываеце штосьці новае з адзення і г.д. Адна 60-гадовая дама казала, што не можа выйсці без макіяжу нават у краму. Паводле яе слоў, калі яна адзначала для сябе, што «мужчыны сёння чамусьці не азіраюцца на мяне», вярталася дадому і аналізавала — што з ёю не так? Гэта яскравы прыклад таго, як жанчына адчувае сябе сэксуальна прывабнай.

**— Аднак у сэксуальнай прывабнасці ёсць і адваротны бок. На цябе звярнулі ўвагу, а далей могуць зрабіць непрыстойную прапанову...**

— Пачакайце. На вас звярнулі ўвагу... Вас гэта грэе?

**— Грэе... Але ж за гэта, можа стацца, давядзецца расплачвацца!**

— Спакойна, чаму адразу расплачвацца? На вас звярнулі ўвагу, і вам гэта прыемна. Гэта павышае вашу самаацэнку.

**— Вы павінны выступаць за тое, каб быў сэкс... А паводле вашага раскладу яго няма...**

— Я выступаю за тое, каб чалавек атрымліваў задавальненне ад сэксуальных зносінаў. Мая задача — зрабіць чалавека шчаслівым у гэтым сэнсе...

**— Паставім пытанне інакш. Да вас прыходзіць жанчына і расказвае пра колькасць машын, якія спыніліся ля яе «не дарэмна». Яе сэксуальнасць разам з сэксапільнасцю прынеслі свае рэальныя плады — быў сэкс. Вы падумаеце пра яе дрэнна?**

— З аднаго боку, а мне якая розніца? А з другога, поўнасцю пазбегнуць ацэнкі я, натуральна, не магу. Я лаўлю сябе на думцы, што хтосьці з пацыентаў мне бліжэйшы па духу. Я як хірург, які павінен якасна рабіць аперацыю і мульцімільянеру, і бамжу... Кожны чалавек сам павінен вырашыць для сябе, што важна менавіта для яго. Калі ў той жа сям'і ўзніклі сэксуальныя праблемы, калі аднаго з партнёраў перастала задавальняць сэксуальнае жыццё, значыць, трэба ісці на прыём да сэксолага. Лепей удваіх. Разам мы хутчэй знойдзем выйсце з праблемнай сітуацыі. Я падкажу, напрыклад, спецыяльную літаратуру. З яе дапамогай сэксуальныя адносіны, якія пачынаюць пераходзіць у стан заняпаду, можна зрабіць больш разнастайнымі. Гэтаму ніколі не позна вучыцца.

**— З якімі праблемамі прыходзяць зараз мужчыны і жанчыны?**

— Нічога не мяняецца. Часцей за ўсё мужчыны — са скаргамі адносна патэнцыі, жанчыны — з адсутнасцю жадання і аргазму.

**— Ці ўсім мужчынам так важна, каб жанчына дасягнула аргазму?**

— Дзесьці для паловы гэта важна. І гэтыя будуць мучыць няшчаснае цела партнёркі, пакуль не атрымаюць патрэбную рэакцыю. Многія жанчыны, д